беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 7 (45)
29 красавіка 1996 г.
панядзелак

выходзіць у панядзелкі

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

ТЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

Вячаслаў Кебіч: "Я здольны на большае"

Экс-прэм'ер Беларусі Вячаслаў Кебіч адказвае на пытаньні карэспандэнта "Нашай Нівы" Алега Дашкевіча.

"Наша Ніва": Сёньня, праз два гады пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, як Вы лічыце, чаму Вы ня сталі прэзыдэнтам?

Вячаслаў Кебіч: Па-першае, улада, якая ўступае ў нейкую барацьбу (а я быў прадстаўніком улады), заўсёды на старце сур'ёзна прайграе, бо ўсе памылкі ўлады бачныя народу. Па-другое, усе іншыя кандыдаты на пасаду (у дадзеным выпадку прэзыдэнта) заўсёды будуюць сваю кампанію на крытыцы ўлады. І ўсе мае супернікі, натуральна, будавалі сваю прапагандысцкую кампанію на крытыцы ўраду. Апошняе, і, можа быць, самае галоўнае — усе чамусьці ўяўлялі, што ўсю ўладу ў нашай краіне меў у сваіх руках Кебіч. А гэта ж далёка ня так. Вы ведаеце, што на тыя часы старшыня Савету Міністраў фактычна ніякай уладай не валодаў. Ён ня меў права зьняць ніводнага міністра без дазволу Вярхоўнага Савету, ня меў магчымасьці зьняць нават старшыню сельсавету, калі той быў зусім ні на што ня варты. Ён, нарэшце, ня меў улады зьняць ніводнага старшыню калгаса. Хоць ва ўсіх было такое ўяўленьне, што Кебіч мае неабмежаваную ўладу. Не было такой улады. Вось гэта — аб'ектыўныя прычыны.

Есьць і суб'ектыўныя. Было дапушчана шмат памылак. Трэба было хутчэй рэфармаваць эканоміку. Як мага хутчэй. Я ж часта азіраўся на парлямэнт, асабліва на тую яго частку, якая не хацела ніякага рэфармаваньня эканомікі. Рэч у тым, што трошкі рыначнікам быць нельга. Да рынку трэба або рухацца, або ня рухацца.

І яшчэ адна суб'ектыўная прычына — я занадта зацягнуў зьмену кадраў. Калі ўжо стала відавочна, каго трэба перамяшчаць, было позна. Пачалася перадвыбарчая кампанія. Хоць я і тады бачыў, што частка кадраў прызначалася адначасова і Вярхоўным Саветам, і мною, і бюро ЦК КПБ, — немаведама які сымбіёз.

Есьць яшчэ і драбнейшыя прычыны. Але, на жаль, вярнуцца нельга. Цяпер бы я такіх памылак не дапусьціў і быў бы больш рашучы ў гэтых пытаньнях.

"НН": На Ваш погляд, які парлямэнт больш рынкавы — той ці гэты?

В.К.: Той парлямэнт быў больш рынкавы. Тут, у гэтым, іншы раз небясьпечна нават заікнуцца, нават слова прамовіць. Часам слухаеш выступы дэпутатаў і думаеш — ну калі так, то давайце, урэшце, адкрыта скажам, што вяртаем дзяржплян, давайце зноў пачнем нармаваць і забудзем тады пра рынкавыя адносіны... Але і гэтага ўжо зрабіць нельга. Застанемся адныя ў пустыні. Бо нават калі ставіць пытаньне пра наш саюз з Расеяй, то гэта ўжо не дапускае ніякай іншай формы гаспадараньня, апроч рынку. Усе дзяржавы, якія нас атачаюць, рухаюцца да рынку. Можа быць, толькі Паўночная Карэя, Куба... І тое на Кубе ёсьць зрухі да рынку.

"НН": У Вашай камандзе, у Вашым урадзе былі зусім розныя паводле сваіх поглядаў людзі. Напрыклад, П.Краўчанка і Ўл.Замяталін. І цяпер яны праводзяць зусім рознавэктарную палітыку ў дачыненьні да Беларусі. Якая з пазыцыяў Вам бліжэйшая?

В.К.: Маю перадвыбарчую кампанію ўзначальваў Мясьніковіч. У штаб уваходзілі Замяталін, Краўчанка, Драгавец і Антановіч. Гэта зусім розныя людзі, якія ўсе стаялі ля вытокаў ідэалягічнай апрацоўкі. Калі яны праводзілі паседжаньне штабу, то кожны імкнуўся даказаць сваю праўду. Калі каму-небудзь удавалася давесьці свае, ён выходзіў задаволены, на гэтым паседжаньне скончылася і праца скончылася. Словам, усё паседжаньне штабу адбывалася дзеля таго, каб паспрачацца, даказаць, хто мае рацыю. Таму я ня буду сёньня казаць, хто мне бліжэйшы. Хоць бы нават таму, што, напрыклад, той самы Краўчанка сёньня, даючы інтэрвію, у адным

Працяг на старонцы 3

МЕНСК. 26 КРАСАВІКА

Каля 16-й гадзіны, случы аўтобусам №18, я стаў нечаканым сьведкам цынізму рэжыму. У аўтобус зайшлі кантралёры, праз колькі хвілінаў пачалі патрабаваць першыя штрафы. І тут пасажыры загаласілі: "Выганяюць на мітынг і яшчэ штраф плаці за праезд!" Гэтыя працаўнікі менскіх заводаў на загад кіраўніцтва ехалі на афіцыйны мітынг на плошчы Бангалор. Я ня схільны думаць, што ўсе ўдзельнікі таго мітынгу былі сабраныя менавіта такім чынам, але тое, што зьбіралі й гэтак —сьведчаньне ўнутранай няўпэўненасьці ўладаў.

Тым самым часам пачыналі разгортвацца падзеі каля Акадэміі Навук. Дэманстрацыя апазыцыі, што рушыла адтуль, была ацэненая ўсімі незангажаванымі інфармацыйнымі крыніцамі ў 50 тысячаў чалавек. Першая спроба спыніць шэсьце рабілася ў раёне плошчы Якуба Коласа. У выніку жорсткай сутычкі кардон прарвалі, дэманстранты перакулілі два міліцэйскія аўтамабілі. Наступная спроба спыніць дэманстрацыю была зробленая ў раёне вуліцы Варвашэні — там шлях перакрылі грузавікамі. Прасьць іх папросту пералезьлі. Далей дэманстрацыя скіравалася на вуліцу Янкі Купалы — перакулены яшчэ адзін аўтамабіль. Потым — жорсткая бойка ўжо на Нямізе. Шпіталяваныя дзесяць чалавек. Каля Палацу спорту прайшоў мітынг.

Але можа больш драматычныя падзеі распачаліся ўжо пасьля мітынгу. Калі падчас супрацьстаяньня было арыштавана толькі некалькі чалавек, дык цяпер пачалі хапаць на прыпынках. Прыкметы — беларуская мова, сьцягі. Любым коштам выконваўся плян затрыманьня. Любым коштам. Узброеныя людзі ў камуфляжы, што хапалі мінакоў каля ГУМу, зусім не разумелі па-беларуску, у чым і прызнаваліся.

27 красавіка на прэсавай канфэрэнцыі ў штаб-кватэры БНФ было заяўлена, што за

Працяг на старонцы 2

Здымак Сяргея Грыца

навіны 1-м сказам......

ЗАБОЙСТВА. У ноч з 21 на 22 красавіка ад расейскай ракеты загінуў прэзыдэнт Чачэніі Джахар Дудаеў; ягоны пост перададзены віцэ-прэзыдэнту Зэлімхану Ендарбіеву.

ГРОШЫ. З 1 чэрвеня спыняецца хаджэньне купюраў 50-рублёвае вартасьці. Пасьля ўсе грашовыя разьлікі будуць рабіцца з акругленьнем да 100.

ПАНІЖЭНЬНЕ. Былы міністар унутраных справаў генэрал-маёр Юры Захаранка ўказам А.Лукашэнкі зьніжаны ў годнасьці да палкоўніка і выпраўлены на пэнсію.

ПАДВЫШЭНЬНЕ. Лідару лівійскай рэвалюцыі і Лівійскае Джамахірыі палкоўніку Муамару Кадафі нададзена годнасьць ганаровага доктара Уральскага пэдагагічнага ўнівэрсытэту.

ТРОХКУТНІК. Органы КГБ канфіскавалі ў рэдакцыі "НН" фотаздымак, на якім прэзыдэнт РБ выяўлены разам з былой жонкай Славаміра Адамовіча, арыштаванага за верш "Убей президента".

МЭДАЛЬ. Акторка Купалаўскага тэатру Марыя Захарэвіч указам А.Лукашэнкі ўзнагароджаная мэдалём Францішка Скарыны.

СЛАВЯНЕ. Прадстаўнікі Бэльгіі, Ізраіля й Фінляндыі вырашылі запісацца ў "славянаў" ды ўзяць удзел у "Славянскім базары-96", які адбудзецца з 11 да 17 ліпеня ў Віцебску.

ЦЯЖАРНАСЬЦЬ. 37-гадовая амэрыканская сьпявачка Мадона зьбіраецца нарадзіць першае дзіця ад свайго трэнэра шэйпінгу 29-гадовага кубінца Карляса Леона.

РАДЫЁ. У сталіцы Узбэкістану Ташкенце адкрытае бюро радыё "Свабода". На цырымоніі адкрыцьця прысутнічаў прэзыдэнт краіны Карымаў.

СЬЦЯГІ. Прэзыдэнт Расеі Б.Ельцын выдаў указ з дазволам у часе дзяржаўных сьвятаў, воінскіх рытуалаў і імпрэзаў, зьвязаных з баявымі перамогамі расейскага народу, разам зь дзяржаўным сьцягам выкарыстоўваць сьцяг перамогі, г. зн. чырвоны з зоркай.

ЦЫГАРЭТЫ. Гарадзенская тытунёвая фабрыка пачынае выпуск новых гатункаў цыгарэтаў: "Мір", "Калярыт" і "Сузор'е". Распрацоўваецца беларуска-італьянскі гатунак "Мірскі замак".

ВЯРТАНЬНЕ. Славамір Мрожак, клясык гратэску, вяртаецца з эміграцыі ў Мэксыцы на Бацькаўшчыну. З-за перасьледу камуністычнымі ўладамі літаратар мусіў у 1963 годзе пакінуць Польшчу. Цяпер Мрожаку 66 гадоў.

МОВА. Рада Эўропы зацьвердзіла праграму захаваньня мовы ідыш, якая некалі была асноўнай гутарковай моваю сярод яўрэйскага жыхарства Сярэдняй Эўропы, у тым ліку і Беларусі. Сёньня ідыш ведае толькі сталае пакаленьне. Зацьверджаны таксама бюджэт праграмы.

ПЕРАЙМЕНАВАНЬНЕ. Гарадзкія ўлады Львова прынялі адзінадушнае рашэньне перайменаваць вуліцу Лермантава ў вуліцу Джахара Дудаева.

"ЖУРНАЛІСТА МОЖНА СФАТАГРАФАВАЦЬ З КІМ ЗАЎГОДНА"

Пасьля публікацыі ў "Нашай Ніве" (5'96) артыкула Славаміра Адамовіча "Звычайны фашызм-2", у рэдакцыю зьвярнулася журналістка Ціна Клыкоўская — пэрсанаж артыкула і, як высьвятляецца, былая жонка С.Адамовіча. Нагадаем, што С.Адамовіч у сваім тэксьце і на ілюстрацыях да яго падаў Ц.Клыкоўскую як актывістку арганізацыі расейскіх правых радыкалаў у Беларусі. "Тое, што я пісала пра баркашоўцаў з РНЕ, сустракалася зь імі, прысутнічала на іхных сходах, —сказала нам Ц.Клыкоўская, — гэта мая журналісцкая праца, і гэта не дае падставаў выстаўляць мяне ледзьве не як галоўную фашыстку ў Беларусі. Як журналістка, я магу трапіць у кадар з кім заўгодна", — паведаміла Ц.Клыкоўская і ў якасьці доказу прапанавала "НН" здымак, дзе яна сфатаграфаваная разам з А.Лукашэнкам у пачатку прэзыдэнцтва апошняга.

Здымак Сергея Грыца

26 КРАСАВІКА

Працяг са старонкі 1

дзесяць дзён да трагічных падзеяў у Беларусь з Масквы прыбыла група з 50-ці афіцэраў расейскага АМОНу, якая разьмясьцілася на базе ў 20-ці км ад Менску ў Ракаўскім напрамку. Тады прыехалі толькі афіцэры. Пра прысутнасьць расейскіх аддзелаў у Менску паведамілі таксама маскоўскія інфармацыйныя праграмы.

Разбой на вуліцах гораду працягнуўся пагромам а палове на 12-ю ночы ў штаб-кватэры БНФ. Арыштаваныя ўсе прысутныя. Амаль ніякія дакумэнты не былі сканфіскаваныя, затое, кіруючыся нейкім архаічным інстынктам, людзі ў форме пазрывалі ды забралі з сабою ўсе сьцягі й харугвы.

Паводле стану на раніцу 27 красавіка было арыштавана каля 100 чалавек. Лідараў апазыцыі хапалі каля іхных дамоў. У другой палове дня называлася колькасьць арыштаваных ужо ў 200 чалавек.

Арыштоўваліся ня толькі беларусы. Адну групу ўкраінцаў з УНСО зьнялі проста зь цягніка ў Баранавічах. Другая даехала й брала ўдзел у менскіх падзеях. Затое зьнік дэпутат Вярхоўнай Рады Ўкраіны Юры Тыма.

Месцазнаходжаньне шмат якіх грамадзянаў Беларусі ў суботу было яшчэ невядомае.

УЗЬНІКНЕНЬНЕ МЕНСКУ

Досыць рана на абшарах гэтае часткі Эўропы Беларусь пачала вылучацца як самастойны суб'ект або, прынамсі, імкнуцца да гэтага. З цэнтралісцкай сталіцы, якой тады быў Кіеў, на гэта глядзелі, як на сэпаратызм. Адзін з эпізодаў супрацьстаяньня паміж Полацкім княствам і дынастыяй Рурыкавічаў, што прагнула дамінаваць ва ўсім рэгіёне, — бітва на Нямізе ў 1067 г. Тады супраць падданых легендарнага полацкага князя Ўсяслава Чарадзея выступілі войскі трыюмвірату сыноў Яраслава Мудрага: Ізяслава, Сьвятаслава, Усевалада. Нягледзячы на моцныя маразы, яны сабралі палкі й рушылі на ганарлівых: "І падыйшлі да Менску, і мяняне зачыніліся ў горадзе. Гэтыя ж браты ўзялі Менск, і пасеклі мужчынаў, а жонак і дзяцей узялі на шчыты, і пайшлі да Нямігі, і Ўсяслаў выйшаў насупраць. І сутыкнуліся абодва на Нямізе месяца сакавіка ў трэці дзень... І была сеча злая, і многія палі..."

Тая бітва ўвайшла ў сьвядомасьць людзей вобразам "Нямігі крывавыя берагі" — гэты радок быў напісаны ў канцы XII ст., але ўжо пазьней вобраз берагоў трансьляваўся праз мастацтва, праз гістарычную сьвядомасьць. Глыбокая сымболіка ў тым, што першы ўспамін пра Менск зьвязаны з інфармацыяй пра ягонае зьнішчэньне. Культурнае ўзьнікненьне на старонках летапісу зьвязана з разбурэньнем. Пасьля зьнішчэньня пачынаецца пэрыяд адбудовы і ўзвышэньня Менску. У XII ст. ён ужо канкуруе са сталіцаю княства — Полацкам. Паступова Менск робіцца сэрцам краю. Але адлік ягонага росту вядзецца ад 1067 г.

Як і тады, 26 красавіка 1996 г., я спазьніўся. Заняты цэлы дзень, толькі пад 19-ю гадзіну здолеў выбрацца ў бок Нямігі. Спадзяваньне даехаць транспартам было наіўнае — усе тралейбусы й аўтобусы згурбіліся каля Опэры. Спускаючыся да Нямігі, да Хлусава маста*, я быў уражаны дзіўным відовішчам —шчыльны ланцуг людзей зь вялізнымі зялёнымі шчытамі выцягнуўся ад пагорку, на якім стаіць Верхні горад, да Нямігі, акурат да таго месца, дзе некалі працякала (а сёньня закатаваная ў калектар) легендарная рака. Уся гэтая браняваная маса толькі што адбілася ад натоўпу людзей, якія рушылі цяпер убок. Валяліся камяні. У лагчыне, на пляцоўцы перад тым месцам, дзе некалі ўзвышалася брама Менскага замку, сьцішваліся аблокі газу, але газавыя шашкі яшчэ дыміліся. Паралелі з 1067 г. былі настолькі нечаканыя, што блыталіся гістарычныя эпохі. Пра канец XX ст. сьведчыў толькі антураж.

Але чаму ўсё ж такая жорсткасьць была праяўлена 26 красавіка ў Менску? Лютасьць міліцыі тлумачыцца вызначальнаю роляй расейскіх інструктараў. Іхныя інстынкты на чужыне былі больш разьняволеныя.

Бескампраміснасьць прадстаўнікоў беларускага грамадзтва тлумачыцца, у тым ліку, постшокавай рэакцыяй. Пасьля столькіх прыніжэньняў, пасьля маральнага тэрору адбываецца псыхалягічны зрыў. Адначасова адбылася трансфармацыя вобразу талерантнае Беларусі. Што важна — ня толькі вонкавага, але і ўнутранага.

26 красавіка прыўнесла новыя рысы ў палітычнае сытуацыю ў Беларусі.

Удзел расейскіх аддзелаў у менскіх падзеях прывёў да зьмены раней толькі юрыдычнага статусу акупацыі. Цяпер на сцэну падзеяў выйшлі ўласна акупацыйныя войскі. Гэта першая рэальная "дапамога" Расеі для Беларусі пасьля ўтварэньня "Сообщества".

Але 26 красавіка ўпершыню выразна прагучалі лёзунгі з патрабаваньнем адстаўкі Аляксандра Лукашэнкі. Гэтае патрабаваньне ўтрымвалася й ва Ўхвале, прынятай на мітынгу.

Беларусі ўсё ж не ўдалося пазьбегнуць усіх драматычных сюжэтаў лёсу Сярэдняй Эўропы ў XX ст. Тое, што адбывалася ў Будапэшце ў 1956 г., у Празе ў 1968 г., цяпер паўтараецца ў Менску. У гэтым сэнсе Менск нараджаецца. Пад націскам брутальнай узброенай сілы наш горад паў, ягоныя жыхары захопленыя ў палон ды скрываўленыя. Менскі замак узяты ў аблогу, у Нямігі, як і 929 гадоў таму, зьявіліся берагі. Але Менск зноў узьнік на старонках гістарычнага летапісу як горад Сярэдняй Эўропы.

Алег Дзярновіч

* Так гістарычна завецца мост, што вядзе да Траецкага прадмесьця.

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік

НАША НІВА

заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец — Павал Жук
рэдактар — Сяргей Дубавец
адказны сакратар — Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
навіны — Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" — Андрэй Лапцёнак
макет — Віктар Корзун
мантаж — Лявон Раманчык
набор — Таццяна Чуйвід
стыліст — Антон Кузьміч
карэктура — Сяргей Сматрычэнка
пры ўдзеле — Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі (тэл. 56-94-36) — Зьміцер Бартосік
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Падпісны індэкс 63125
Тэл./факс 36-76-75

КРАІНА

ЖЫТЛО. Міністэрства жыльлёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі выступіла з прапановай павялічыць зь першага траўня дзейныя тарыфы на паслугі. Квартплата мусіць павялічыцца ў 1.7, вада — у 3.9, каналізацыя — у 3.7 раза. А кошт ацяпленьня ды гарачай вады хочуць падняць у 3 разы. Калі гэткае павышэньне адбудзецца, то сям'і з трох чалавек, якая жыве ў двухпакаёвай кватэры ў ацяпляльны сэзон, давядзецца плаціць блізу 430 тыс. руб. Свае прапановы міністэрства апраўдвае пераходам на самаакупнасьць. Узамен яны прапануюць павялічыць памеры субсыдыяў для аплаты жытла ды паслугаў. У такім выпадку сёлета доля кампэнсацыяў гэткіх выдаткаў можа дасягнуць 80%. Заўчора ўвечары афіцыйныя крыніцы заявілі, што журналісты пасьпяшаліся абвясьціць пра павелічэньне квартплаты. Няхай пасьпяшаліся, пытаньне ў тым, на колькі?

БАГАТЫРЫ. Сярэдні жыхар Беларусі ўсяго ў пяць разоў бяднейшы за такога ж сярэдняга амэрыканца, але трохі багацейшы за паляка, эстонца, літоўца, румына і латыша. Прынамсі так, калі верыць "Радыёфакту", сьцьвярджае Эўрапейская камісія, што апублікавала параўнальныя статыстычныя дадзеныя аб узроўні жыцьця ў розных краінах. Пры разьліках спэцыялісты Эўрапейскай камісіі зыходзілі не з прынятага ў статыстыцы паказчыка валавага ўнутранага прадукту на душу насельніцтва, які вылічваецца ў далярах. За падставу бралася магчымасьць сярэднестатыстычнага жыхара атрымаць на свае даходы пэўны аб'ём тавараў ды паслугаў. Паводле ж традыцыйных разьлікаў мы ў 74 разы бяднейшыя за японцаў і тэарэтычна даўно памерлі з голаду.

ГУМА. Зьдзейсьнілася мара зялёных. Замест "таннай" смуроднай нафты з Расеі беларускі шынны завод будзе выкарыстоўваць натуральную сыравіну для колавай гумы. Дзеля гэтага ў далёкім Віетнаме будзе спэцыяльна закладзеная плянтацыя каўчукавай гевэі плошчаю ажно ў 8000 га. Праўда робіцца гэта не з экалягічных, а з эканамічных меркаваньняў.

ЧЫГУНКА. Даходы ад перавозак пасажыраў на прыгарадных лініях беларускай чыгункі толькі на 35% пакрылі выдаткі. Агульныя страты ад электрычак і дызэляў склалі за першы квартал болей за 120 мільярдаў рублёў. Стратнымі зьяўляюцца таксама мясцовыя грузавыя і пасажырскія перавозкі. Трымаюцца на плыву чыгуначнікі ў асноўным за кошт транзытных грузаў ды міждзяржаўных пасажырскіх рэйсаў.

ТАКСІ. У Менску зьявіліся жоўтыя таксі маркі ГАЗ-3109. Выпускам машынаў такога колеру, больш характэрнага для вуліцаў Нью-Ёрку, заняўся Горкаўскі аўтазавод на замову маскоўскай мэрыі і адмыслова для Расейскай сталіцы. Плянуеццца, што белакаменная атрымае 5000 такіх таксі. Менску перападзе 60. 10 ужо працуюць на нашых вуліцах. Адметнаю рысай новага таксі зьяўляецца таксомэтар, што адразу выдае кошт праезду для кожнага з чатырох пасажыраў паасобку.

МАСОНЫ. Сакратар Вярхоўнага Савету па нацыянальнай бясьпецы, прадстаўнік фракцыі камуністаў Валеры Шчукін даў сэнсацыйнае інтэрвію газэце "Белорусская нива" пад назвай "Валеры Шчукін супраць Джорджа Сораса". Ён абвінаваціў Фонд Сораса ў падрыўной дзейнасьці супраць былога ды будучага СССР, а таксама цяперашняга "Отечества" (мусіць, "Сообщества"). Ён сказаў, што развал СССР — гэта вынік змовы "масонаў" ды "сусьветнага ўраду". Паводле Шчукіна, беларускі Пэн-цэнтар зьяўляецца масонскай структурай. Масонамі, паводле Шчукіна, апроч нашых Быкава ды Барадуліна, зьяўляюцца Міхаіл Гарбачоў, Абалкін, Бакацін, Лужкоў, Сабчак, Валкагонаў, Шэварднадзэ ды Яўлінскі. А прэзыдэнт Расеі і наогул рыцар-камандор Мальтыйскага масонскага ордэну. Асабліва дасталося Джорджу Сорасу. У дабрачыннай дзейнасьці сусьветна вядомага філянтропа Шчукін угледзеў імкненьне сусьветнага масонства ды ізраільскага "Масаду" развальваць экономіку розных краінаў, адукацыю ды наагул увесь лад жыцьця. Нават слова філянтроп падаецца як адмоўнае. Усё інтэрвію вытрыманае ў духу 30-х гадоў і пераказу не паддаецца. Аматары жахаў атрымалі сапраўдную асалоду. І "відзікаў" ня трэба.



Цень маці. Здымак Анатоля Клешчука

Выстава здымкаў Анатоля Клешчука, прысьвечаная 10-й гадавіне чарнобыльскае трагедыі, працуе ў Дзяржаўным мастацкім музэі з 24 красавіка да 12 траўня.Подпісы да здымкаў зробленыя паэтам Алесем Разанавым. "Гэтыя здымкі — больш чым я", — кажа А.Кляшчук. Тэма перарастае аўтара. Пасьля сотняў дзіцячых магілаў застаецца адзін здымак. Пасьля сотняў дзіцячых твараў застаецца адзін боль. Тое, што зрабіў Кляшчук, засядае стрэмкаю ў сьведамасьці, не дае будаваць мэтафізычныя канструкцыі, а прымушае зжывацца з гэтымі творамі, з гэтымі лёсамі. Гэта ня наш бруталізм, гэта наша жыцьцё.
С.Х.

Вячаслаў Кебіч:

“Я здольны на большае”

Працяг са старонкі 1

месцы сказаў так: я ня мог угаварыць Кебіча, каб ён адмовіўся ад барацьбы за прэзыдэнцтва. Калі б я тады заявіў, што не хачу і не пайду кандыдатам у прэзыдэнты, то першы б найбольш абразіўся Пятро Краўчанка. Бо ён вельмі не хацеў страціць пасаду міністра замежных справаў... Таму цяжка сказаць, хто зь іх мне бліжэйшы.

“НН”: Я маю на ўвазе ня іх асабіста, а іх пазыцыі ў дачыненьні да Беларусі.

В.К.: Я сёньня далёкі ад некаторых падыходаў Замяталіна. Але калі Замяталін выступае толькі за саюз з Расеяй, у гэтым я яго падтрымаю. Я не магу зьмяніць свае адносіны. Але я за такі саюз з Расеяй, дзе б Беларусь была зусім самастойнай дзяржавай. Гэта значыць, пры поўным захаваньні суверэнітэту. А калі мы пачынаем гаварыць пра агульную армію ў будучыні, то тады давайце мы ня будзем казаць пра нейкі ССР ці СССР, а будзем казаць пра канфэдэрацыю, якая рана ці позна можа прывесьці да фэдэрацыі.

“НН”: Што тычыцца маскоўскага ўплыву, наколькі ён моцны ў дачыненьні да Беларусі?

В.К.: Уплыў Расеі быў і ёсьць вельмі моцны. Хоць бы з пункту гледжаньня нашага геаграфічнага становішча. Таму я больш чым упэўнены, што тут прысутнічаюць і дух, і работа, і ідэі многіх расейскіх палітыкаў і, на жаль, гэта абмінуць немагчыма.

“НН”: Ці гэты ўплыў вызначальны?

В.К.: Калі не вызначальны, то вельмі і вельмі моцны. Нам ня трэба забывацца таксама, што большасьць народу усё ж за саюз з Расеяй. Ужо ўкараніліся ў людзей адносіны да расейцаў, як да саміх сябе, да беларусаў.

“НН”: Ёсьць думка, што і Вашу, і Лукашэнкаву выбарчую кампанію падтрымвалі ў Маскве...

В.К.: Калі б Расея падтрымвала Кебіча, то Кебіч быў бы прэзыдэнтам. Я растлумачу чаму. Калі б не адкладваньне зь месяца на месяц, з тыдня на тыдзень падпісаньня дамовы аб адзінай грашовай сыстэме, то я меў бы вялікія шанцы. А тое, што я прыязджаў і казаў, як мне казалі ў Расеі, маўляў, праз месяц мы падпішам, то гэта ўспрымалася народам як мая, прабачце, хлусьня і як маё нездольнае жаданьне за ўсякую цану стаць прэзыдэнтам.

“НН”: Чаму, нягледзячы на Вашы добрыя адносіны з Чарнамырдзіным, Масква Вас усё ж не падтрымала?

В.К.: Чарнамырдзін быў у меншасьці сярод тых людзей, якія ўплывалі на падпісаньне дамовы. Гэта стала гісторыяй, але я згадваю, як аднойчы ў кабінэце мяне не заўважылі, што я стаю, і ўбег адзін высокапастаўлены расейскі кіраўнік і зь вялікай радасьцю сказаў: не перажывайце, сёньня падпісаньне не адбудзецца, таму што, наколькі вам вядома, Багданкевіч гэты дакумэнт не падпіша...

Так што былі людзі, незацікаўленыя ў гэтай дамове. Тут – меней, з таго боку – нашмат больш. Адным з тых, хто зацята выступаў супраць, быў Гайдар, зь якім, дарэчы, я меў вельмі добрыя адносіны. Гэта быў заказ іншых дзяржаваў наконт таго, каб наш саюз

не адбыўся. Але тады саюз меў чыста эканамічны характар.

“НН”: Калі Масква падтрымвала на выбарах Лукашэнку і цяпер размова ідзе пра саюз значна больш шчыльны, чым прапаноўвалі Вы, значыць у Маскве нешта рэзка зьмянілася?

В.К.: Як бы мы ні казалі сёньня пра тое, што гэты саюз ніяк не ўплывае на прэзыдэнцкія выбары ў Расеі, я з гэтым ніколі не згаджуся.

“НН”: Вашыя адносіны з прэм’ерам Расеі Чарнамырдзіным засталіся такія самыя?

В.К.: Тады гэта былі адносіны двух прэм’ераў. Натуральна, такімі яны не засталіся. Але адносіны таварыскія, добрыя, цёплыя засталіся ранейшыя. І гэта датычыць ня толькі прэм’ера Расеі, але і многіх іншых лідараў, зь якімі я працаваў. Я ня ведаю Аліева, ня ведаю Шэварднадзэ, але з Тэр-Петрасянам, Назарбаевым, Карымавым у мяне цёплыя адносіны.

“НН”: Калі б Вам удалося стаць прэзыдэнтам, чым бы Ваша палітыка адрозьнівалася ад той, якую праводзіць Лукашэнка і наколькі б яна адрозьнівалася ад той палітыкі, якую сёньня праводзіць Кучма ва Ўкраіне?

В.К.: Я ня буду наўпрост адказваць на гэтае пытаньне, зыходзячы з таго абяцаньня, якое даў, выступаючы перад выбаршчыкамі, калі быў кандыдатам. Я тады сказаў, што калі мяне ня выбяруць, я ня буду перашкаджаць палітыкам сёньняшняга дня, каб яны кіравалі дзяржавай. Наадварот, там дзе я магу дапамагчы, там я дапамагаў, дапамагаю і буду дапамагаць дзеля таго, каб беларускі народ мог жыць так, як ён гэтага заслугоўвае.

“НН”: Ці задавальняе Вас тое месца ў палітычным жыцьці краіны, якое Вы займаеце цяпер і ці паспрабуеце гуляць ролю больш актыўнага палітычнага лідара?

В.К.: Напэўна, вы хочаце, каб я казаў ня круглымі фразамі, а больш шчыра... Не, вядома, не задавальняе. Я здольны на большае. І здароўе, і розум, і досьвед мне дазваляюць рабіць нашмат болей, чым я раблю сёньня.

“НН”: Зь якой палітычнай сілай краіны Вы зьвязваеце сваю будучыню? Нібыта Вы мелі кантакт з Сацыял-Дэмакратычным Саюзам...

В.К.: Я маю добрыя адносіны, добры кантакт з усімі дэпутацкімі фракцыямі, якія ёсьць у сёньняшнім парлямэнце. І я аднолькава магу падысьці да Сечкі, да Калякіна ці да таго ж Багданкевіча, і мы вядзем размову на роўных, ніякіх палітычных антыпатыяў у нас няма. Але чаму я ня вызначыўся? Таму што ніводная з групаў дастаткова выразна не афармілася і не заняла выразнай пазыцыі. Мне ж займацца экспэрымэнтамі... пакуль ранавата. Акрамя таго, некаторыя, жадаючы, каб я ўступіў у якуюсь фракцыю, спадзяюцца за кошт майго імя прыцягнуць да сябе іншых. Я б гэтага не хацеў.

“НН”: Наколькі сёньня фінансы ўплываюць на палітыку ў Беларусі?

В.К.: Я б сказаў так: больш за 50 працэнтаў. Калі хочаце, яны сёньня вызначальныя пры афармленьні тых ці іншых палітычных дамоваў. Нават большасьць дэпутатаў, якіх выбралі, яны прайшлі або на абяцаньнях, што фінансава дапамогуць выбаршчыкам або праз нейкія эканамічныя рэформы, або проста грашыма, якія былі ў їхным распараджэньні.

“НН”: Тым ня менш, чаму беларускі бізнэс у такіх неспрыяльных для яго ўмовах займае такую пасіўную пазыцыю ў адносінах да палітыкі?

В.К.: Наш бізнэс вельмі дробны і наяўнасьць грошай у большасьці бізнэсмэнаў настолькі нікчэмная, што яны проста ня могуць уплываць сваімі грашыма на палітыку. Сёньня мы можам на пальцах вось гэтых дзьвюх рук пералічыць тых бізнэсмэнаў, якія маюць хоць нейкія грошы. Астатнія – дробныя гандляры, перакупшчыкі, пасярэднікі, якія перабіваюцца, абы пражыць.

“НН”: Але ёсьць банкі. Улады нацыяналізуюць банкі, нацыяналізуюць біржу, і — ніякай рэакцыі. Чаму?

В.К.: Будзем зыходзіць з таго, што гэта і ёсьць беларускі мэнталітэт. Гэта па-першае. Па-другое, да прыкладу, ашчадны банк. Былы ашчадны банк. Што ён, быў багаты? Не. Ён быў вельмі бедны, фактычна дзяржаўны банк. У нас сёньня банкаў, што здольныя хоць неяк уплываць на сытуацыю – два-тры. Усе астатнія ня могуць даваць ні крэдыты, нічога. Усе працуюць толькі на пагашэньне ранейшых крэдытаў. Таму вы ня думайце, што банкі нашыя сёньня багатыя. Яны вельмі бедныя.

“НН”: Я нават не пра багацьце, я — пра жыцьцёвую пазыцыю...

В.К.: Напэўна кожны, хто сёньня займае хоць трохі выгоднае становішча ў жыцьці, ня хоча яго згубіць. Ён ужо ўладкаваўся нейкім чынам, навошта ж яму бузіць, прабачце, дзеля таго, каб заўтра страціць працу?

“НН”: Прэзыдэнта не запрашаюць на абмеркаваньне праблемаў ядзернай бясьпекі ў Маскву. Як Вы думаеце, чым гэта выклікана?

В.К.: Атрымалася так, што ў нас няма ядзернай зброі, няма ядзерных адходаў, і таму — навошта нас запрашаць? Хоць мы ж былі ядзернай дзяржавай. І куды тут павінна быць і ў прэзыдэнта, і наагул у нашага кіраўніцтва. Калі ўжо мы падпісалі з Расеяй дамову, паводле якой такія пытаньні павінны вырашаць разам, я лічу, гэта — пагардлівыя адносіны да Рэспублікі Беларусі, што яна не была запрошана за стол перамоваў. З пункту гледжаньня палітычнага, а найперш — маральнага, Беларусь павінна была прысутнічаць.

“НН”: Ці ня лічыце Вы, што гэта своеасаблівы адказ на палітыку прэзыдэнта Лукашэнкі, я маю на ўвазе тыя дзеяньні, якія мелі месца тут, у Беларусі: паветраны шар, інтэрвію для нямецкай газэты, заключэньне дамовы з Расеяй?..

В.К.: Ані краінам NATO, ані тым, што хочуць далучыцца да NATO, ані нашым суседзям не падабаецца тое, што ў нас ёсьць нейкія дзеяньні, накіраваныя на збліжэньне Беларусі і Расеі. Я гэта адчуў яшчэ тады, калі хацеў стварыць адзіную рублёвую зону. Некаторыя паслы і кіраўнікі ў мяне наўпрост пыталіся: навошта вам гэта патрэбна? Нэгатыўных адносінаў да гэтага ніхто не хаваў. Першыя кіраўнікі краінаў мне так проста і казалі: мы б вам дапамаглі, калі б вы так шчыльна не збліжаліся з Расеяй. Хоць ніякай дапамогі нам ня трэба было чакаць ні тады, ні цяпер ніхто нам яе ня дасьць таксама.

“НН”: А Расея?

В.К.: Мне здаецца, адзінае, што зроблена слушна, як першы крок, гэта так званы нулявы варыянт. Але яго ж трэба давесьці да канца. Пакуль гэта яшчэ толькі на паперы. Трэба ж і абмяняцца вэксэлямі, і скасаваць даўгі праз міністэрствы фінансаў абедзьвюх краін. Ну і акрамя гэтага разьлічваць на тое, што мы напрасткі атрымаем грошы ад Расеі, я думаю, пакуль не даводзіцца. Там сваіх праблемаў ня менш, чым у нас.

“НН”: Паводле некаторых зьвестак, ужо пасьля падпісаньня нулявога варыянту мы зноў павінны Расеі за энэрганосьбіты 200 мільёнаў. Чаго вартае пагадненьне аб саюзе з Расеяй без рэфармаваньня нашай эканомікі?

В.К.: Я ўжо аднойчы казаў у сваім інтэрвію, што гэта толькі дамова падпісаная. Гэта пакуль толькі рамачнае пагадненьне, добрае пажаданьне. Без напаўненьня яно ня мае ніякай сілы. Ну, хіба што дамова аб узаемным ненападзе... І тое, мы ведаем тысячы прыкладаў, калі падпісваліся падобныя дамовы, а роўна праз два гады яны не былі нічога вартыя.

“НН”: Пытаньне наконт рэфэрэндуму і беларускай мовы. Вы часам гаварылі па-беларуску, але ў часе перадвыбарчай кампаніі дэманстратыўна размаўлялі па-расейску...

В.К.: Вы ня маеце рацыі. Я вам адкажу так. Што тычыцца рэфэрэндуму. Рэфэрэндуму па мове я б не праводзіў. Гэта антымаральна. Але права размаўляць на іншай мове таксама адбіраць нельга. Што тычыцца маіх размоваў, то на кожнае пытаньне, якое мне задавалася па-беларуску, я таксама адказваў па-беларуску.

“НН”: А што тычыцца сымболікі?

В.К.: Што казаць пра тое, чаго ўжо няма. Рэфэрэндум адбыўся, што цяпер казаць? Вяртацца да гэтага пытаньня, я лічу, і неразумна, і значыць яшчэ раз праваказаваць супрацьстаяньне ў грамадзтве.

“НН”: Калі Вы былі прэм’ер-міністрам, ад Вас даставалася прэсе...

В.К.: Дай бог, каб вам цяпер даставалася так, як ад мяне.

“НН”: ... а цяпер журналісты са шкадаваньнем згадваюць пра кебічаўскую адлігу. Ці зьмяніліся Вашыя адносіны да прэсы за гэты час?

В.К.: Так, зьмяніліся. Таму што калі б я тады супраць пэўных газэт не выступаў, тады б у іх не было жаданьня нападаць на мяне. Калі чалавек не зьвяртае ніякай увагі на нешта, тады і супрацьстаяньня зь іншага боку няма.

Я недзе недапрацоўваў, недзе перадаверыўся тым памочнікам, якія займаліся прэсай. І нам даставалася і з боку правых, і з боку левых. Але мы праявілі дзівосную гнуткасьць, бо нам дастаўся якраз самы цяжкі пераходны перыяд, калі было цяжка нават проста зарыентавацца, як зрабіць, і, тым ня менш, мы ўстаялі. Кебіч быў ва ўсіх краінах СНГ адзіны прэм’ер, які долей за ўсіх заставаўся на пасадзе прэм’ер-міністра. І ўсё ж мы ня страцілі тады кіраваньня народнай гаспадаркай. У нас не было ніводнага выпадку, каб нейкае прадпрыемства выплаціла заробак ня ў час. Успомніце: хіба бюджэтныя арганізацыі заставаліся бяз грошай? І заўсёды падвышэньню коштаў папярэднічала падвышэньне заработнай платы. Гэта я заношу сабе ў актыў.

Алесь Аркуш

Перадвыбарчы поціск Барыса Мікалаевіча

Прысьніўся Ельцын. Нібыта мы зь ім спыніліся ў адным гатэлі. У фае, пры сваёй звыклай ахове, ён раздаваў усім нейкія ці то буклецікі, ці то кніжачкі. Я сутыкнуўся зь ім амаль нос у нос. Барыс Мікалаевіч, прыязна пасьміхаючыся, падаў мне сваю пульхную далонь і са словамі "Галасуйце за мяне" ўручыў перадвыбарчы прэзэнт. Наступны раз мы зь ім сутыкнуліся на ганку гатэля. Я хацеў праскочыць каля расейскага прэзыдэнта, атачанага купкай целаахоўнікаў, незаўважна, аднак Ельцын, убачыўшы мяне, зрабіў некалькі крокаў насустрач і, як старому знаёмаму, зноў працягнуў мне сваю перадвыбарчую далонь. Памятаю ягоны моцны, старанны поціск. "Як справы?" — спытаўся ён. "Нармальна", — адказаў я. "Малайцом!" — пахваліў прэзыдэнт. Наступныя кадры сну я бачу як на экране кінатэатру. Камэра здымала гэты момант з-за сьпіны Барыса Мікалаевіча, які сядзеў у вялікім прэзыдэнцкім "членавозе" на пярэднім сядзеньні побач з кіроўцам. Картэж ехаў па вуліцы гораду. "Членавоз" спыніўся насупраць мяне. Прэзыдэнт націснуў нейкую кнопку і зацемненае шкло павольна апусьцілася. Ельцын выцягнуў руку з машыны і з унутранай кішэні майго пінжака забраў свой прэзэнт. Пры гэтым не было вымаўлена ні гуку. Вочы прэзыдэнта былі налітыя крывёю. Я спужаўся і прачнуўся. Доўга намагаўся ўзгадаць — што гэта за прэзэнт я атрымліваў ад Барыса Мікалаевіча.

❑

У Варшаву ехаў у купэ разам з армянінам. Да мяжы ён упарта маўчаў, уткнуўшы свой нос у кнігу. Пасьля Кузьніцы Беластоцкай разгаварыўся. Распавёў, што ён былы афіцэр савецкай арміі. Доўгі час служыў у Польшчы ў кантынгенце "чырваназоркавых касак". Лічыць тыя гады найлепшай парою свайго жыцьця. Пасьля вываду савецкіх войскаў з Польшчы ягоную частку расфармавалі, і малады афіцэр застаўся без жыльля, працы і цывільнай спэцыяльнасьці. Шмат пакутаваў. Кім толькі не працаваў. На радзіму не паехаў, маўляў, там голад, беднота і ніякай пэрспэктывы. Даведаўся, што ягоны былы камандзір зноў фармуе вайсковае падразьдзяленьне. Прыехаў да яго на гутарку. Высьветлілася, што частку зьбіраюць для Чачэніі. З дылемы: або Чачэнія, або нічога, — выбраў нічога. Хто згадзіўся на Чачэнію, атрымалі кватэры ў пабудаваным туркамі новым вайсковым гарадку і добрыя пад'ёмныя. Многія афіцэры былі гатовыя коштам уласнага жыцьця хоць неяк забясьпечыць існаваньне сваім сем'ям. Афіцэр з-пад Ерэвану зноў застаўся ні з чым. Прыехаў да сваякоў, якія аселі ў Беларусі. Стаў трэніраваць мясцовых дзяцей боксу. Паступіў у Маскве на завочны юрфак. З агідаю езьдзіць у расейскую сталіцу на сэсіі — не бывае там такога дня, каб хлопцы ў плямістых камбэзах не спынялі мужчыну "каўкаскай нацыянальнасьці", бесцырымонна шукаючы зброю або выбуховае прыстасаваньне. Цяпер ён кіруецца да сваіх старых польскіх знаёмых, маладой сям'і фэрмэраў, зь якой пасябраваў падчас службы за кардонам. Спадзяецца падзарабіць — папрацаваць на фэрме і ў цяпліцах.

❑

Сустрэў на наваполацкай вуліцы знаёмага прадпрымальніка. На веснавых парлямэнцкіх выбарах я меў зь ім гутарку наконт удзелу мясцовых бізнэсмэнаў у перадвыбарчай кампаніі. Ён казаў, што ўся гэтая палітычная валтузьня яго не датычыцца. Ягоная справа — рабіць грошы, ладзіць рынкавую эканоміку. Сёньня ён лічыць інакш. Жаліўся на жахлівыя ўмовы, на "эканамічны экстрэмізм" і "маразматызм" уладаў. Я нагадаў пра былую гутарку — мой прагноз наконт таго, што будзе, калі беларускія прадпрымальнікі не павернуцца тварам да палітыкі. Трэба было ў свой час паспрачацца зь ім хоць бы на пляшку кан'яка, тым больш, што мясцовым камэрсантам ужо забаронена прадаваць яго ў сваіх крамах. Можна толькі гарэлку полацкага разьліву.

❑

Калі я прыехаў стала жыць у Наваполацак (1987 год), усе мясцовыя "нацэмы" зьмяшчаліся ў рэдакцыйным пакойчыку газэты "Хімик" падчас паседжаньня літаб'яднаньня "Крыніцы". Сёньня цяжка нават пералічыць тутэйшыя "нацдэмаўскія" арганізацыі і тусоўкі: Полацка-Глыбоцкая суполка СП, "тэвээлаўцы", уніяты, тэатар-студыя "Зьніч", суполка "Беларускае шоў", гістарычны клюб "Княжыч", каталікі, "бэнээфаўцы" і г.д. Большасьць лідараў гэтых тусовак некалі наведвалі "Крыніцы". Прыйшоў час, усе разышліся па сваіх лядах і... пачаўся актыўны працэс беларусізацыі мясцовых культурных і духоўных нішаў. Зусім нядаўна быў адзіны тэатар-студыя "Зьніч". Але Сяргей Анішчанка (Аніса) і Сяргей Хамякоў (Ален) штосьці не падзялілі і апошні пакінуў студыю. Зьявілася "Беларускае шоў" Алена. Цяпер у Наваполацку дзьве арганізацыі наладжваюць канцэрты, фэстывалі, запісваюць магнітаальбомы, рыхтуюць маладых сьпевакоў. Канцэртаў і фэстываляў у горадзе павялічылася больш, чым у два разы. Крыўды хутка забыліся. Сёньня "Зьніч" і "Беларускае шоў" плянуюць агульныя акцыі. Гэтаксама хутка зьніклі непаразуменьні паміж мясцовымі сябрамі СП і сябрамі ТВЛ. Цяпер у Наваполацку зьявіліся дзьве рэдакцыі двух літаратурных часопісаў: "Калосьсе" (ТВЛ) і "Край" (Полацка-Глыбоцкая філія СП). І ў кожнай процьма матэрыялаў. Час ужо і трэцяму часопісу нараджацца. Спробы Навума Гальпяровіча рэанімаваць "Крыніцы" ні да чаго не прывялі. Як кажуць старажытныя грэкі, у адну раку не ўвайсьці два разы.

❑

Васіль Дзехцяроў у 80-х працаваў брыгадзірам фармоўшчыкаў на наваполацкім заводзе ЖБВ. Перад сконам СССР, калі камуністы пачалі губляць глебу пад нагамі, дзеля падвышкі аўтарытэту партыйнай арганізацыі Васіль быў "каапатаваны" ў парткам мясцовага будаўнічага трэсту. Яму нават выпала крыху пакіраваць камуністамі-будаўнікамі. Падчас леташніх парлямэнцкіх выбараў у наваполацкай газэце "Знамя новостройки" ён жорстка выказаўся наконт камуністычных гульняў. Былыя сябры з партыі абрынуліся на яго са зласьлівымі ўшчуваньнямі. Крытыку сяброў не прыняў да ведама. А нядаўна прынес мне касэту расейскага гурта "Лесоповал" і папрасіў запісаць на яе Данчыка. "Надакучыла ўся гэтая расейская дурата", — сказаў нязбытны сакратар парткаму беларус Васіль Дзехцяроў.

Ганна Матусэвіч

Койданаўскі дыярыюш



8.04. Езьдзіла ў вёску. Як марудна яны прачынаюцца! Але мы змушаны іх раскатурхваць, бо безь іх усё адно нікуды ня зможам ісьці. П'юць гарэлку й закусваюць мясам. Радуюся, што частуюць дзяцей разынкамі, ды не "изюмом".

А ў гімназіі зноў канфлікт. Гвалтуюць сына Андрэем Платонавым. У падраным дзёньніку каторы ўжо раз зьявіўся запіс: "Не готов к уроку!" Даю хлопцу параду: Ветліва растлумач настаўніцы, што кніга для цябе нецікавая, нудная, незразумелая. Прапануй ёй наўзамен "Маленькага прынца" Экзюпэры. Падсунула цяпер Булгакава "Майстар і Маргарыта". Чытае.

10.04. Дазволіла сабе купіць аж тры танныя батоны па 2500. Міколка еў, тады закрычаў: "Мама, тут чарвяк! І ніткі! І валасы!"

11.04. Прачнулася ўначы з удзячнай думкай пра маміна сэрца. Колькі не прышчаплялі яму чужога, наносвага, яно ўсё ж выжыла і цяпер, у горы, усіх прыцягвае да сябе.

... Параўнала ўчора вершаваныя прысьвячэньні памяці Сяргея Палуяна: Купалава і Максімава. Ах, Максім!..

12.04. Схапіла "НН" проста з аддзелу сартоўкі. Пайшла зь ёю да пракурора. Дарогай успамінала. Я прыходзіла да яго й раней. У невялічкім холе мы сядзелі ўдзьвюх: я і непісьменная, відаць, бабулька з-пад Бранску. Яна так хараша цекала па-нашаму. Расказвала пра сваю маму-нябожчыцу. Жылі яны надта бедна, слухаліся мамы. А мама іх вучыла верыць у Бога. О, як яны глядзелі на маму! Мама засьмеецца — ім радасьць на цэлы дзень, дарма што галодныя. Пракурора бабулька вельмі хваліла. У ейнай справе ён дапамог, хоць дакумэнты былі на Браншчыне. Ён сьпісаўся, дастаў, зрабіў усё, што ад яго залежала. Я ведаю, што ён і цяпер зробіць усё, што ад яго залежыць. Мне ён сказаў, што ў мяне талент, відаць, ад Бога, і што трэба сесьці пісаць кнігі. Я не спакусілася, наадварот, адчула нуду, як 13 гадоў таму, калі муж дакляраваў мне шчасьлівае каханьне безь дзяцей.

А мы самі што ж? Я пайшла да Галі Амбражэвіч. Яна дамывала падлогу і сама бліщчэла, як тая падлога. І муж яе, кажа, вясёлы ў Навінках ляжыць... Адкуль такія зьмены? У першы раз яна, сумная, казала, што ўсе родзічы настойвалі на незалежнай экспэртызе ў Менску. Пасьля іх угаварылі на Навінкі... Я папыталася ў яе, ці дарує яна Камушэнку за мужа?..*

13.04. Даліся мне гэтыя камплексанты ў знакі! Муж моцна ўгнеўваўся на мяне за мае пісаньні. Ня есьць, ня п'е, не гаворыць. Згатавала бульбу і, каб дабро не прападала, занесла Мішку на талерцы. І яшчэ ў прыдачу вядро негатаванай дала. І ноч прайшла, а гнеў усё не праходзіць. Адасобіўся на кухні, майструе паліцу. Званок у дзьверы. Адчыняе — Мішка.

— Прынёс гарэлку.

Дзьверы ледзь не прышчапілі Мішкаў нос. Званок, яшчэ званок, яшчэ!

— Пусьці!

— Не пушчу! Я работаю! Піць ня буду!

— Я ж прынёс талерку!

— А я думаў, гарэлку...

Па мястэчку йдзе доктар, ведучы сына за ручку.

— Ты не смотри, чтобы было удобно, а чтобы красиво.

— И модно, — фальшывіць усьлед дзіцятка.

14.04. Усчала сварку, усунуўшы свой язык туды, дзе трэба маўчаць. Як быццам словамі нешта некаму можна растлумачыць!

15.04. "Изуверство принадлежит к самым ярым проявлениям жестокости. В Космосе нет более разрушительных явлений..." (Мозаика Агни Йоги).

Калі я, перапрасіўшы пракурора, як і цяпер перапрашаю чытачоў, пераказала яму словы, што кінуў Камушэнка Амбражэвічу: "Ты ў гаўне нарадзіўся — у гаўне й памрэш!" — пракурор сьцьвердзіў, што гэта "изуверство".

16.04. Нешта дрэнчыць усярэдзіне... Можа тое, што мела грошы, ды ня дала жабракам? А калі ня дала беднякам — грошы пайшлі крумкачам. Ужо колькі разоў заўважала...

У інтэрнаце павесілі страшную паперу "о правилах проживания в общежитии".

Кажуць, у гаркаме судзілі "маласямейкі". Нас зноў засудзілі.

17.04. Тое, што здарылася з Амбражэвічам — мела здарыцца з прарабам Куксікам Алегам. На яго таксама павесілі даўгі, ужывалі псыхалягічны шантаж. Галя яго адратавала. Выцягнула яго з праўдзівага пекла СГП-42, разьвяліся, ён уладкаваўся на працу дзесьці ў Менску. Камушэнка цяпер пагражае выселіць і разьвядзёных. Майму мужу за "дзень Амбражэвіча" паставілі прагул, нагрузілі малапрадуктыўнай працай, што й граша не зарабіш. Мала "падбрэхічаў" — сам начальнік цкус: "Я бы цебя атправіў кой-куда!" Паставіў Лобачыху за нагляднічаць, хто ў колькі на працу прыходзіць. Мужу баліць галава, ціснe сэрца, тэмпэратура. Ён глытае таблеткі і йдзе на працу.

... Зноў непаразуменьне ад маіх пісаньняў. На гэты раз праз суседку. Аж тынк зь дзьвярэй пасыпаўся! Ці тое яшчэ будзе, любыя мае! Каб вырвацца з гэтага пекла, патрэбная мужная, поўная праўда. А дзе яе ўзяць? Толькі з душы, словы тут бясьсільныя...

18.04. Перад суседам, які палічыў сябе абражаным маёй публікацыяй, я стала на калені.

19.04. Адна... Толькі Бог са мною. Лёгка, сьцюдзёна, сьветла, як у маленстве...

21.04. Пазьняк сказаў: "Зло павінна быць пакаранае, інакш яно становіцца нормай". І гэта ёсьць фанатызм. Адам Глёбус сваімі творамі фактычна робіць злое дзеяньне, але яно спрыяе эвалюцыі. Назваў жа ён па-беларуску тыя часткі (інтымныя) чалавечага цела, на што ніяк не адважваліся казённыя ханжы.

... Сэрца чалавечае — гэта касьмічны магніт. Такі магніт ёсьць ва ўсім: у камені, у дрэве, у плянэце, у Космасе. І птушкі ляцяць, і перасяленьне народаў у старажытнасьці адбывалася на магніт.

... Заўсёды знойдзецца нехта адзін, хто возьме на сябе адказнасьць.

... Ня страшны наўпроставы вораг Сьвятла. Страшныя шэрыя пасрэднасьці, застой, нуда.

... Каштоўнае ўсё, што чалавек зробіць сам.

... Раней мне падабалася Максімава "Пагоня" болей у выкананьні Мулявіна, чым Данчыка. Калі ж абудзілася мая душа, я зразумела, што Данчык сьпявае душою, змушае да непасрэднага дзеяньня, а Мулявін заклікае адпачыць, як у тэатры.

... Кожны з нас выконвае свой загад. Таму трэба рабіць тое, што хочацца, бо гэтага хоча наша душа.

21.04. Віталік учора завёў дзёньнік.

... На вакзале сустрэліся простыя людзі. Я люблю простых людзей.

22.04. Прачнулася ад таго, што нейкі мужчына невысокага росту падаваў мне руку, гукаючы моцна, як глухой, у самае вуха: "Добры Вам дзень!"

... У вёсцы працую. Вельмі марудна ссоўваецца цяжар з сэрца. Хочацца пабыць адной, і няма як. Усе падыходзяць да мяне й катуюць пытаньнямі: "Што з табой?" Ня вытрывала, расплакалася. Мая любая дачушка, мая Веранічка зноў выратоўвае мяне. Заплюшчыла вочы — на Нябёсах на розных тлах рознымі колерамі сьвецяцца-гараць — 222.

23.04. Зь вялікімі намаганьнямі вырвалася зь вёскі, знайшоўшы зручную прычыну, што мне трэба паліць памідоры. Як хораша сьцюдзёным ранкам імчаць на роварах насустрач сонцу! Як цудоўна, што можна разьняволіцца й пабыць самой сабою! З Богам пагаварыць, памаліцца шчыра... " Дзьве жанчыны — "зьнешне набожная" і "зьнешне бязбожная" — крычалі на мяне з аднолькавай злосьцю, што я "бальная". Койданаўскай пратэстантцы, якая сама падышла да мяне, я давала пачытаць "мае нумары" "НН". Мне патрэбная была падтрымка. Яна сказала, што напісана надта добра, і што мне можна пісаць кнігі, але каб я пакінула гэтыя пісаньні ў газэту, бо мяне засудзяць, і ніхто не пашкадуе. Яна яшчэ казала, каб я малілася. Я ёй падзякавала і папрасіла, каб яна болей не прыходзіла да мяне.

... Людзі не разумеюць, што малітва бывае розная, у любым месцы: калі складаеш вершы, калі майструеш паліцу, калі слухаеш птушак (сьпеў птушак — гэта іхная малітва), калі сьпяваеш, — словам, той псыхічны стан, калі сэрца перапоўненае радасьцю і ўдзячнасьцю Богу. Вялікі грэх сьмяяцца з малітвы, якой бы першабытнай яна ні была.

... Я нікога не зьбіраюся судзіць. На гэта ёсьць Бог. Я толькі "падала на суд" — паказала падзеі, як яны разгорталіся ва ўспрыманьні маёй душы. Судзіць жа свайго бліжняга чалавек ня мае права затым, што ня ведае, што адбываецца ў чужой душы. Гэта ведае толькі Бог. Таму я прашу, каб людзі даравалі мне і ня мелі на мяне крыўды. Галю Амбражэвіч прашу асабліва. І няхай усемагутны Бог дасьць людзям паразуменьня і шчасьця.

* Гэтая гісторыя распавядалася ў папярэдніх нумарах "НН" (заўвага рэдакцыі).

Койданава

Зьміцер Бартосік

ВЫХАД У ГОРАД

Дзень адзначыўся праводзінамі сябра. І ўсё. Чамусьці, чым далей, тым менней сьлядоў пакідаюць дні. Мне здаецца магчымым узгадаць усе свае пяцьсот віленскіх дзён, хоць яны мала чым адрозьніваліся (хіба што вуліцамі, на якіх я гуляў у гаспадара), а вось з апошніх трохсот шасьцідзесяці пяці — дай бог успомніць дзясятак. Няўжо рэч у месцы знаходжаньня? Так і цягне апраўдацца роднымі савецкімі фасадамі, стаць гаспадаром якіх так мала каго цягне ў гэтым горадзе. Вось яшчэ адзін сябра зьехаў у Менск. Пакінуў Гомель без шкадаваньня. Ад чаго зноў да мяне вярнулася адчуваньне пасажыра на прамежкавай станцыі, які спазьніўся на свой цягнік. І вымушаны з-за лішку часу скарыстаць "ВЫХАД У ГОРАД". Шукаць для памяці спажыву. Занятак тут няпросты і, можа, таму больш цікавы. Гэта, як збочыць з тысячу разоў праходжанай вуліцы й здраньцвець ад першага сутыкненьня з тым, чаго ніколі не заўважыў бы на фасадным яе баку, — нетынкаваныя муры пад іржавымі дахамі з хай не стогадовымі, але сапраўднымі сьлядамі часу... *

Вось ужо чацьверты год гомельцы, як сапраўдныя тэатралы, могуць выбіраць, у які з тэатраў накіравацца ўвечары — у "Незалежны" ці наадварот? Сёньня гэтая дылема паўстала больш інтрыжна — адначасова ў абодвух тэатрах прэм'еры. Розныя, як самі тэатры. У абласным даюць п'есу мясцовага драматурга Васіля Ткачова, у "НТ" — чэскага пісьменьніка Паўла Когаўта, якога й на радзіме нельга назваць мясцовым. У першым спэктакаль на "роднай мове", у другім — на "нherodном". У адным дзея адбываецца ў забруджанай радыяцыяй вёсцы (г. зн. паблізу й нядаўна), у другім — у невядомай краіне нібыта ў наш час.

Зь першых рэплікаў Іванова (выканаўцы ролі галоўнага пэрсанажа ў п'есе Ткачова), гэткага сівога вэтэрана з "калодкамі", я пачаў нэрвавацца. У чаканьні пачуць маналёг станоўчага героя пра родную зямельку, дзе кожная травінка... Чаканьні мае апраўдаліся, і настрою гэта не падняло. Маўляў, зноў — калі па-беларуску, то нейкая калгасная байка. Я азірнуўся навокал ды сабе на зьдзіўленьне пабачыў адно задаволеныя твары гледачоў. Ім гэта падабалася!

Сярод радаснай ды ўдзячнай публікі я глядзеўся, напэўна, хворым на язву крытыкам, са сваімі язьвеннымі думкамі. "Ссумаваліся, небаракі, па родным мастацтве. Як, зрэшты, і акторы, што дарваліся нарэшце пасьля гэтых Шоў ды Саганаў да сваёй драматургіі — з такім запалам яны гулялі"! Публіка ажывілася — на сцэне зьявіўся адмоўны герой. У сапраўдным гумовым засьцерагальным гарнітуры ды газаахоўніку ён выглядаў страшыдлам зь дзіцячай казкі. Заенчыла чыёсьці дзіця. Канфлікт, адным словам, насьпяваў. Я заўважыў зьзяючы непадалёк ад мяне твар драматурга Ткачова, і самому зрабілася так лёгка й радасна. І за тэатр, і за зямельку, і за Чарнобыль. Мае крытычныя думкі таксама аздаравіліся — маўляў, занадта моцныя ў нас традыцыі батлейкі. Як у японцаў — Кабукі. Толькі тыя, у адрозьненьне ад нашых, да прафэсійнага тэатру яшчэ не дарасьлі. Між тым на падмостках, згодна з тэатральным законам, стрэльба стрэліла. Станоўчы й сівы герой, што амаль дзьве гадзіны трымаў абарону у роднай хатцы, не жадаючы пакідаць родны кут, паў ад рукі марадзёра. Дабро ўсё ж не перамагло зло, як павінна было б быць у батлейцы. Можа й маюць рацыю японцы.

Як лёгка, здавалася, "Незалежнаму" быць у выйгрышы. Не бяры мясцовых п'есаў. Не будуй на сцэне калгас. Не гуляй штодня, як па заводзкім графіку. І будзе табе й набітая заля, і прыстойная рэпутацыя, і пачуцьцё посьпеху. Толькі не было б яго, калі б усё так лёгка. Чацьверты год існуе ён насуперак ды ўпоперак. Безграшоўю, абыякавасьці гораду (не гледача), адсутнасьці буфэту й праграмак. А я ўсё роўна буду раіць гомельцам і гасьцям гораду ісьці ў "НТ". Не б'ючы сябе па грудзіне — бацяня паставіў! Калі й захочаце, не растлумачу —пра што ён там паставіў. Нейкі абсурд з шэкспіраўскімі жарсьцямі на тле партрэту Гітлера (амаль што пэрсанажа). Я зьдзіўляўся. Во штука! Сюжэт, пэрсанажы, месца дзеяньня — усё нерэальнае, усё выдуманае. І разам з тым усё, на што пакутавалі герої Когаўта, тычылася мяне й менавіта мяне. Ужо на другім спэктаклі я мог сабе дазволіць разьняволіца й крытычна пасмакаваць нюансы гульні й рэжысуры. Але гэта менш цікава, чым не задумваючыся што да чаго, не зьвяртаючы ўвагі на залю, зьдзіўляцца толькі душою. Разгайдаць яе эмоцыямі, даўшы волю думкам. Ня толькі пра ўбачанае й ня толькі пра прыемнае. Але пакуль свабода выбару ў нас ёсьць.

Зьбіраючыся на фэстываль гітарнай музыкі (які праходзіў у горадзе другі раз), я менш за ўсё настройваў сябе на нейкае дзіва. Але колькі ж разнамаснай багемнай моладзі ў "такім пралетарскім" горадзе! Нейкія юнакі ў мушкетэрскіх капелюшах. Дзяўчаты ў індзейскіх шкэдрах. Бароды мастакоў, пасмы іхных німфаў, кепкі "наблатыканых" тынэйджараў, яркія гальштукі піжонаў, — усё гэта глядзелася амаль што карнавалам пасьля панылых твараў штодзённых мінакоў. Прыемна, хоць і ня дзіўна, усьведамляць што прымусіла іх пакінуць свае майстэрні, кавярні, скляпы. Напэўна, самы распаўсюджаны й касмапалітычны інструмэнт сьвету. Чый сылюэт, падобны на васьмёрку, зь дзяцінства прыцягваў нас. Шмат каго з нас бацькі гвалцілі гамамі, пасажамі на баянах ды віялянчэлях. І толькі акорды шасьці- (усё радзей сямі-) стрункі нашы пальцы прымалі як належнае. Праз брынканьне ў дварах дзяцінства, ня ўсе дайшлі да Івальдзі ці Гомэса. Але хацелі — амаль усе. Гітара застанецца найлепшай вучэцелькай эстэтыкі й прыгажосьці.

Увесь дзень у горадзе панавала недарэчная нэрвовасьць. З нагоды прыезду аднаго чалавека. Праз кожныя сто мэтраў — мільтон. Кажуць, іх нават прымусілі чысьціць сьнег на тратуары каля нейкай прахадной. Нашы мужныя капітаны ды лейтэнанты, думаю, вельмі арганічна й своечасова з дворніцкімі рыдлёўкамі ды мётламі.

Некалькі вуліц перакрылі і я трапіў у "корак". За шклам аўтамабіляў перакошаныя твары кіроўцаў нешта артыкулявалі. Думаю, словы пра прэзыдэнта й ня думаю, што словы цёплыя. Я ж узгадаў першы ягоны візыт, гады два таму. Тады ён не называўся яшчэ бацькам. Памятаю, што пайшоў зь ім на сустрэчу толькі з-за адлегласьці (манеж "Дынама" ў мяне пад носам). На вялізнай трыбуне ўладкавалася чалавек сто пяцьдзесят-дзьвесьце, што ніяк не стасавалася зь іміджам госьця як народнага ўлюбёнца. Пераважна прыйшлі людзі старыя ды нямоглыя. Мне стала крыху шкада выступоўца — столькі шуму вакол і "тры калекі ў залі". Ён жа падаваўся простым "як тры капейкі". Гэткім "сваім мужыком" падаваўся, зь якім "на Вы" гучала б недарэчна. Гатовым узваліць на свае плечы прафэсійнага грузчыка ўсе нашыя праблемы ды балячкі. Гатовым нават "нямножка" павучыцца, калі чаго ня ўмее. Адным словам, дзеля нас гатовым на ўсё. Я нават стараўся асабліва не засмучацца праз месяц, калі ён стаў першаю асобай. Зьніклі, праўда, апошнія ілюзіі наконт мудрасьці нашага люду.

Я злавіў сябе раптам на думцы, што прайшло ўсяго паўтары гады ягонае ўлады. А што б мы ўсе безь яго рабілі! Перад кім яшчэ можна так прагінацца, ці наадварот — выпростацца? Як павінны быць удзячныя яму пазьнякісты за вернуты сьцяг. Колькі вольнага часу мелі б "свабодаўцы", ня будзь яго. І яго не магло ня быць! Мы яшчэ доўга будзем "апяваць" яго, прагназаваць хуткі каляпс ды прысьпешваць у думках крах рэжыму.

Пабачыў сваю фізіяномію ў тэлепраграме "Нірэяновости" і ўзрадаваўся як дзіця. За сябе (як-ніяк прэзыдэнта падкалоў) ды за "Нірэю" (знайшла чым сустрэць госьця Гомельшчыны — маімі кплівымі куплетамі). Як мала нам трэба для шчасьця — жыві, Аляксандар Рыгоравіч!

Дзень Канстытуцыі. Ісьціна не знаходзіцца ў спрэчках. У спрэчках губляецца час. Цэлыя тры гадзіны штосьці даказвалі, у нечым пераконвалі, у чымсьці абвінавачвалі адзін аднаго гожыя маладыя дэмакраты й трухлявыя, пляшывыя камуністы. (Чамусьці ніколі не сустракаў камуністаў з прыемнымі тварамі. У маладых ленінцаў, дарэчы, фізіяноміі яшчэ больш гідотныя, чымся ў іхных бацькоў і дзедаў). А мы зь Мельнікавым, значыцца, ладзілі музычныя паўзы — сьпявалі паміж гарачымі раўндамі свае ня надта патрэбныя тут песенькі.

Тры гадзіны псаваньня маладых нэрваў ды старых сэрцаў скончыліся надзвычай дзіўнымі адкрыцьцямі. Што адныя памруць камуністамі, а другія застануцца вернымі дэмакратамі. Ну памруць адныя, ну застануцца другія. А ці знойдзеца ісьціна, дзе губляецца час? Ці ня лепей ня зьмешваць кампаніі?

Во дзіва! Званок у тэатар ад маці маёй колішняй вучэцелькі-віялянчалісткі — ці не засталося ў мяне інструмэнту? Быццам не пятнаццаць, о божа, гадоў прайшло, а пару тыдняў. Сюр поўны. Яшчэ б хто-небудзь з Усьць-Каменагорскага дзіцячага садка панепакоіў, і можна адчуць сябе пастарэлым адразу гадоў на дваццаць. А я сапраўды некалі граў на віялянчэлі.

Паглядзеў "Залатое вока". Эфэкт заежджанага "Ну, погоди!". Са сканчэньнем "халоднай вайны" 007 выглядае ненатуральна. Новы актор тым больш не паратунак (іншая рэч — Шон Конэры). Дзеяньне, вядома, — у новай Расеі. Герой з каменным тварам, на танку тараніць сабе шлях праз піцерскія сьцены, укладваючы стосы трупаў у форме жаўнераў СА. Паглядзі я гэта гадоў дзесяць таму, абразіўся б, напэўна. А цяпер... Не пра нас. Дый страшны мядзьведзь расейскіператварыўся у дзіравае пудзіла, здольнае напалохаць адно прыдуркаватага дзіцёнка.

Даўно ня памятаю, каб за паўгадзіны да пачатку набываў квіток з рук. І гэта на канцэрце непрафэсійнага артыста, улюбёнца мясцовых студэнтаў, гэроя TV "Нірэя" Лёліка Каструлькіна. "Тры гадзіны гістэрычнага рогату", як абяцала афіша, адбыліся.

Праблема ў нацыянальных стратэгаў — знайсьці ці прыдумаць для Гомеля сваю ролю ў беларускім кантэксьце. І яна ўжо пачынае патроху вырашацца. Якая роля можа быць у самага сьпякотнага гораду краіны, дзе дзясятак гадоў таму ўлетку маскоўскія ды піцерскія нумары курортнікаў былі ня рэдкасьцю. Якая роля можа быць у галоўнага порту, адкуль калі й ісьці ў Кіеў, дык толькі па вадзе. А дзе Кіеў, там і Адэса. Я памятаю машыну аварыйнай службы з надпісам на борце: "Хутка паедзеш — павольна павязем". Хочацца думаць — гэта не апошняя хохма. Ня ўсе ж жыды яшчэ зьехалі.

На выставах, што ладзяцца ў выстаўнай залі краязнаўчага музэю Тацянай Ліцьвінавай, рэчы, якія ляжалі далёка ад вачэй, ня тое што ажываюць, а набываюць нейкі новы, таямнічы сэнс. На выставе старых фатакартак я ў гэтым зноў пераканаўся. Дзякуй богу, мяне тады ня было — ня раз лавіў я сябе на гэтай думцы пры сустрэчы з фатаграфічнымі адбіткамі жудасных часінаў. А цяпер, пераходзячы ад здымку да здымку, на якіх шчасьлівы пачатак і стагодзьдзя, і прамысловага гораду, узіраючыся ў бясклапотныя ці засяроджаныя ў чаканьні "птички" твары гомельцаў, мне, чамусьці, не хацелася туды, да іх. Хоць так прывабна выглядала імпэрыя перад сваім канцом. Як на гэтай выставе — старыя афішы, прыгожая мэбля, старадаўнія люстры. Якім усё роўна, каго адбіваць. А мне ўжо ня ўсё роўна, дзе адбівацца. І прыгожае мястэчка ў расейскай правінцыі няхай застанецца на пажаўцелай паштоўцы. Прыемна воку азірнуцца, што ні кажы.

25.03. Злавіць таксоўку. Пераплаціць у гонар Сьвята. Трохі спазьніцца. На ганку пад Сьцягамі папаліць. Сумесь дыму й веснавога паветра. Прайсьці ў залю, поўную прыгожа апранутых, прыветных людзей. Узьняць келіх шампанскага за Сакавік ды, пацягваючы свой кактэйль, пераходзіць ад кампаніі да кампаніі ў пошуках сваёй. Перакіўнуцца са Старшынём, пераміргнуцца з маладзенькай нацыяналістачкай ды, знайшоўшы нарэшце сваіх, пайсьці па адталым горадзе да каго-небудзь сьвяткаваць Сьвята.

Але ж трэба адзначыць сур'ёзную дату. Гэта значыць, сядзець у задушнай актавай залі ды слухаць усялякую нудню пра тое, якія мы былі магутныя й што някепска было б зноў вярнуць славу продкаў. На камуністычных сходах, думаю, тыя ж самыя прамовы, з розьніцай толькі ў часах магутнасьці. А час усё той жа, што і дзяржава. Са сваімі сьвятамі. І бяз нашых датаў.

Расейскія словы захрасьлі ў маім горле, язык загамаваўся. Стала, можа, упершыню сорамна размаўляць на сваёй роднай мове з чалавекам, які зусім невыпадкова зайшоў у аддзел інфармацыйных тэхналёгіяў. Чалавекам, гадоў на дзесяць маладзейшым за мяне. Які шчасьлівец! Дзесяць гадоў у запасе! Паважна гледзячы на мяне (пазнаў!) ды прагна пагартаўшы дарагога Глёбуса, ён сыйшоў са стосам старых нумароў "НН". Пайшоў наганяць страчанае. І ён, як мяне запэўнілі, не адзіны малады чалавек, які прыходзіць сюды набыць Ніву ды Бонду. Адкуль толькі даведваюцца! Мне стала прыемна й спакойна за яго, за іх. Яны гэтае страчанае наганяць. Пакуль я буду страчваць.

Літва

ЛЬГОТЫ ДЛЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

Арыгінальная сыстэма льготаў для прадпрымальнікаў пачынае ўкараняцца ў Сьвянцянскім раёне на мяжы зь Беларусяй.

Галоўная ўмова для атрыманьня гэтых ільготаў — стварэньне працоўных месцаў. Беспрацоўныя, якія ствараюць прадпрыемства са статусам фізычнай асобы, у першы год вызваляюца ад уплаты падатку на прыбытак. Такія самыя льготы атрымаюць індывідуальныя й малыя прадпрыемствы, на якіх будзе створана 5 і болей працоўных месцаў. Прадпрыемствы, якія маюць іншыя юрыдычныя статусы, пры стварэньні новых працоўных месцаў таксама будуць карыстацца льготамі пры ўплаце падатку на зямлю й нерухомасьць. Раённая Рада вызначыла сфэры прадпрымальніцтва, у якіх прадпрыемствы могуць не плаціць падатак на тую частку прыбытку, якая пойдзе на стварэньне новых працоўных месцаў. Гэта ўсе віды дзейнасьці за выключэньнем гандлю й грамадзкага харчаваньня. Улады спадзяюцца, што такія захады выклічуць прыток капіталу ў адзін з найбяднейшых раёнаў усходняй Літвы й дапамогуць зьняць вастрыню праблемы занятасьці насельніцтва.

НЕСАНКЦЫЯВАНЫ НАДПІС

18 красавіка ўзбуджана крымінальная справа паводле факту спаганьваньня мэмарыялу Тры Крыжы ў віленскім Нагорным парку. На ўсіх крыжах чырвонаю фарбай мэтровымі літарамі было напісана "Жыве Беларусь". Ёнас Мінкяліс, начальнік аддзелу фірмы "Vilniaus zundra", што даглядае мэмарыял, вызначае шкоду прыкладна ў 1000 літаў ($250) і кажа, што ў найбліжэйшыя дні несанкцыяваны надпіс будзе зафарбаваны.

Андранік Антанян

МНОГІЯ ВІЛЕНЧУКІ ХОЧУЦЬ У NATO

43,5% віленчукоў выказваюцца за ўступленьне Літвы ў NATO, 21% гэтага не ўхваляе, а 35% ня маюць сваёй думкі. Мяркуючы са зьвестак апытаньня прыватнае фірмы "Мелаполас", маладыя жыхары Вільні — больш гарачыя прыхільнікі NATO, чым віленчукі ва ўзросьце да 59 гадоў. Больш, чым палякі (38,4%) і расейцы (23%) хочуць уступіць у NATO віленскія літоўцы (59%). Сярод прыхільнікаў NATO большасьць — людзі з вышэйшай адукацыяй. Амаль усе віленчукі (90%) пры гэтым не жадаюць, каб у Літве была разьмешчана атамная зброя. З гэтым згодныя толькі 3%.

BNS

ПАВЯЛІЧАНЫ АДПАЧЫНАК

Да 35 дзён павялічаны каляндарны адпачынак маці або бацьку, што адныя выхоўваюць дома дзіця-інваліда да 16 гадоў. Такі самы адпачынак належыць работнікам ва ўзросьце да 18 гадоў і інвалідам. Працадаўца, які дае работніку чарговы адпачынак, не пазьней, чым за тры каляндарныя дні да пачатку адпачынку абавязаны выплаціць увесь належны работніку да пачатку адпачынку заробак і зарплату за поўны адпачынак.

ELTA

Новая Зэляндыя

ПАМЯЦЬ

Надзвычай добрую памяць маюць карэнныя жыхары Новае Зэляндыі — маоры.

Калі адно ангельскае бюро падарожжаў запыталася ў маоры, ці дазволяць яны прыстаць да іхнага берагу караблю "Endeavor" (копія карабля Джэймса Кука, 230 гадоў плаваньня якога будзе ўрачыста адзначацца праз два з паловаю гады), то яны рашуча адмовілі. Рэч у тым, што каманда Кука ў свой час менавіта тут забіла трох іхных продкаў. Беларусам бы такую памяць.

ПЕРШЫ ПРАМЕНЬ

Яшчэ не пасьпеўшы адпачыць ад Раства ды Велікодных сьвятаў, новазэляндцы рыхтуюцца да Новага году. Да 2000 году. Тутэйшыя турыстычныя кампаніі маюць намер правесьці на выспах Чатэм і Піт "Шоў новага тысячагодзьдзя". Менавіта на гэтых тэрыторыях, якія ляжаць на нулявым мэрыдыяне часавага пасу, надыдзе першы на плянэце сьвітанак трэцяга тысячагодзьдзя. Новазэляндцы гатовыя даставіць сюды ўсіх, хто прагне "стаць сьведкам наступленьня новага веку".

Такая актыўнасьць занепакоіла суседзяў Новае Зэляндыі Рэспубліку Кірыбаці й Каралеўства Тонга, якія не без падставаў сьцьвярджаюць, што маюць такія самыя геаграфічныя правы на падобную ўрачыстасьць. У дадатак, выспы Чатэм і Піт, якія наскрозь прадзімаюцца вятрамі — ненаселеныя. Адзіныя сталыя жыхары тамака — яшчары гатэрыі (гл. "НН" №2'1991). Словам, пэрспэктывы істотна па-

поўніць мясцовыя бюджэты за кошт турыстаў сталі прычынаю дыпляматычных скандалаў у Ціхім акіяне.

Бітва за турысцкія даляры толькі разгараецца, а ў нашых чытачоў яшчэ ёсьць час вызначыцца, куды ўрэшце махнуць: на Чатэм, на Кірыбаці або на Тонга!

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Немаўляты, якія жывуць у адным пакоі з бацькамі, пачуваюцца больш бясьпечна і растуць больш спакойнымі, ураўнаважанымі й здаровымі. Да такой высновы прыйшла група мэдыкаў з Новае Зэляндыі. Як вядома, існуе і іншае глядзішча, паводле яко-

га немаўляці ўжо зь першых тыдняў патрэбны асобны пакой і асобны ложак.

Новазэляндцы на падставе шматгадовых досьледаў сьцьвярджаюць, што ідэальна, калі дзіця жыве ў адным пакоі з бацькамі аж да трох гадоў. Пры гэтым таксама зьмяншаецца небясьпека, што малое задыхнецца падчас сну. Мэдыкі лічаць: калі б немаўляты да 6 месяцаў ня спалі на жываце, а — пад наглядам бацькоў у адной спальні — на сьпіне, то колькасьць сьмяротных выпадкаў падчас сну магла б скараціцца на 60 працэнтаў, а колькасьць захвораваньняў — на 30.

Дасьледаваўшы аналягічныя праблемы ў іншых краінах, новазэляндзкія спэцыялісты выявілі: там, дзе малыя традыцыйна сьпяць у бацькоўскай спальні, верагоднасьць раптоўнае сьмерці непараўнальна меншая. Да прыкладу, толькі ў Францыі штогод у сьне памірае ў сярэднім 500 малых.

ЦІХІ ДОН

Нарэшце часопіс "New Zealand Slavonic Journal" скончыў публікацыю фундамэнтальнае сэрыі камэнтароў да "Ціхага Дону" М.Шолахава — адзінае ў сьвеце энцыклапэдыі гэтай кнігі.

У энцыклапэдыі некалькі аўтараў. Прафэсар Браян Мэрфі — адзін з найбуйнейшых у сьвеце знаўцаў расейскае мовы й літаратуры, які прысьвяціў творчасьці Шолахава больш за 20 гадоў жыцьця і быў знаёмы зь пісьменьнікам асабіста, наведваў яго ў станіцы Вешанскай. Майкал Дункан — вучоны-славіст, выкладчык Парыскага інстытуту славяназнаўства і Оксфардзкага ўнівэрсытэту, жыў і працаваў у СССР. Уладзімер Бут — кандыдат гістарычных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытуту агульнае гісторыі АН Расеі. Віктар Свабода — старэйшы навуковы супрацоўнік Лёнданскага ўнівэрсытэту, сталы аўтар бібліяграфіі ўкраінскае мовы й літаратуры ў гадавіку "The Year's work in modern language stadies". Між іншым, сп. Свабода добра вядомы ў навуковым сьвеце як спэцыяліст у беларуска-ўкраінскіх уплывах на габрайскую мову ідыш. Сярод беларусізмаў "Ціхага Дону" ў камэнтарах сустракаем: "палахлівы", "абраць" ды інш.

"New Zealand Slavonic Journal" — вельмі аўтарытэтнае ў сьвеце і найстарэйшае з славістычных у Паўднёвым паўшар'і выданьне. Яшчэ ў 1910 годзе ў ім распавядалі пра "Нашу Ніву", а пасьля рэгулярна зьмяшчалі матэрыялы зь беларускае мовы й літаратуры.

Сяргей Харэўскі, Ўэлінгтан

Здарэньні

Хлопчык гранату знайшоў...

Маленькі хлопчык з Полацку гранату знайшоў. Гранату РГМ-2, інакш кажучы, лімонку, вучань пятае клясы знайшоў дома, куды яе прыцягнуў бацька, які працуе ў вайсковай частцы. Вынікам гульні ў піянэра-героя сталася сьмерць самога хлопчыка, а ягоны меншы брат, дзьве сястрычкі ды дзядуля пэнсіянэр з раненьнямі дастаўленыя ў мясцовы шпіталь.

"Пекла сатаны"

Сталіся вядомыя некаторыя акалічнасьці забойства, учыненага сатаністам у мястэчку Мачулішчы пад Менскам. Забойства адбылося ў рамонтна-тэхнічнай управе "Мэдык". Пачалося з папойкі трох сантэхнікаў проста на працоўным месцы. Калі дыспэтчар "Мэдыка" паспрабаваў выправіць пітухоў дахаты, адзін зь іх, ня кажучы ні слова, узяў кухонны нож і моўчкі ўсадзіў яго ў дыспэтчара. Са словаў самога забойцы, ён зрабіў гэта выпадкова, проста таму, што яго зачапілі. Як высьветлілася, п'янка сантэхнікаў была наладжаная менавіта дзеля забойства. Праўда, ахвярай сатанінскага ахвярапрынашаньня мусіў стаць сабутэльнік. Забойца сьцьвярджае, што належыць да менскае сэкты "Пекла сатаны" і не баіцца суда, бо мае заступніка — самога князя цемры. Сваёй мэтай чальцы сэкты лічаць зьнішчэньне чалавецтва, якое верыць у Бога. Ужо ў 15 гадоў гэты слуга Люцыпара меў на сваім рахунку 666 забітых катоў ды шмат галубоў. Апошні кот, зь ягоных словаў, быў сыгналам да забойства людзей.

"Матэрыял"

Паблізу ад тых самых Мачулічшаў, побач з чыгункай быў знойдзены труп навародка. У яго былі да локцяў адрэзаныя рукі і ніжняя палова тулава. Экспэрты зрабілі выснову, што дзіця было мёртванароджанае. Падобна на тое, што навародак быў выкарыстаны ў якасьці вучэбнага дапаможнага матэрыялу ў нейкай мэдычнай установе, бо труп знаходзіўся ў коўбе з рэшткамі фармаліну. Наступным днём у самім Менску ў мікрараёне Ўручча быў знойдзены яшчэ адзін дзіцячы трупік. Таксама навародка. Гэтым разам — цэлы і загорнуты ў поліэтыленавы пакет.

Грыбы перасяленца

На менскім Камароўскім рынку быў затрыманы дзед, які гандляваў радыёактыўнымі сушанымі грыбамі ды журавінамі. Грыбы "засьвяціліся" ажно на 20.000 Бк/кг, пры максымальна дапушчальнай норме 3700. Як высьветлілася, дзед — перасяленец зь Лельчыцкага раёну Гомельшчыны. Затрымалі яго выпадкова. Проста адна кабеціна, супрацоўніца НТЦ "Белрад", набыла грыбоў за надта малую цану і пахвалілася на працы. Калегі параілі праверыць грыбы дазымэтрам. Кабета знайшла дзеда на рынку і здала ў міліцыю.

Бомба

А вось жыхар вёскі Майская на Крупшчыне вырашыў зрабіць бізнэс на рыбе. Нагледзеўшыся, відаць, як глушаць рыбу змагары зь лёдам, ён таксама змайстраваў бомбу. Але запалы аказаліся ня той сыстэмы. У выніку бомба выбухнула ў руках і "прыглушыла" самога рыбака. Пацярпела таксама і ягоная знаёмая, што падрыхтавала для рыбы вялікую торбу. Ёй высмаліла вока.

Пакараньне і злачынства

Сьледчым ізалятарам скончылася спроба стралка-інкасатара ВОХР станцыі Віцебск грамадзяніна Д. пазмагацца з курцамі. Аб адзінаццатай гадзіне вечара Д. шпацыраваў уздоўж чыгункі праз мост. Раптам наперадзе ён убачыў агеньчык цыгарэты, што плыў у цемрадзі проста на яго. Скарыстаўшыся тым, што на ім была форма ды фуражка з кукардай, Д. падышоў да курца і сказаў, што на чыгуначных мастах паліць "не паложана". І запатрабаваў штраф у 20 тыс. руб. Курэц-небарака спалохаўся ды заплаціў, але неўзабаве засумняваўся — ці то ў правілах пра мост, ці то ў форме стралка ВОХРа. Зьвярнуўся ён у міліцыю, і змагара з паленьнем затрымалі.

"Хто там?"

А злодзеі, што пайшлі рабаваць кватэру ў Менску, маскавацца ня сталі. Проста пазванілі ў дзьверы з надзеяй, што адчыніць малое дзіця ці нямоглая бабулька. Але адчыніў здаровы бамбіза — вучань аднаго са сталічных тэхнікумаў. Хлопец, напэўна, быў ня надта гасьцінны, бо атрымаў ад нязваных госьцяў стрэл ва ўпор з газавага пісталету. Злодзеі ўцяклі. Таму парада ўсім чытачам "НН": перш, чым адчыніць дзьверы, глядзіце ў вочка ды пытайцеся "хто там?"

Госьці больш не прачнуліся

Зноў гарэлі на менскай вуліцы Малая Трасьцянецкая. Тут у адным прыватным доме два дні гула папойка з удзелам гаспадароў ды двух прыяцеляў сям'і. У канцы другога дня сябры стаміліся ды пайшлі ў розныя пакоі спаць. Але ўначы гаспадары прачнуліся ад паху дыму. Ратуючы свае жыцьці, яны выскачылі ў вакно. Пасьля кінуліся ратаваць госьцяў. Паспрабавалі паклікаць іх з пакою, адкуль ужо было бачнае полымя. Пасьля разьбілі вакно, дзе спалі п'яныя прыяцелі. І дарэмна. Скразьняк стварыў моцную цягу, і госьці так і не прачнуліся.

Вынаходнік

У Барысаве пацярпеў ад агню адзін беспрацоўны народны ўмелец. У ягоным прыватным доме сапсавалася сыстэма ацяпленьня і ён змайстраваў электраабагравальнік уласнай канструкцыі. Узяў цагліну, абкруціў яе ніхромавым дротам ды прыладзіў шнур са штэпсэлем — вось і абагравальнік. Зрабіў аж два такія прыстасаваньні: адно на кожны пакой. Аднойчы ўвечары, будучы нападпітку, ён пакінуў награвальнікі ўключанымі на ноч, а сам заснуў. У прыладах нешта не спрацавала, і ўзьнік пажар. Ад пагібелі вынаходніка выратавала ягоная сужыцелька, што прачнулася ад паху дыму і пабегла да суседзяў выклікаць пажарнікаў. Тыя выцягнулі небараку з агню і з апёкамі чацьвертай ступені даставілі ў шпіталь.

Англія

ПРАЦЭС СЕРАФІНОВІЧА

Сымон Серафіновіч, беларус, які жыве ў Вялікабрытаніі, будзе першай асобай, засуджанай на падставе новага закону аб ваенных злачынст-

Працяг на старонцы 19

№ 6/96
29 красавіка — 5 траўня

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы - штотыдзень 12 палосаў патрэбнае інфармацыі

ІНФАРМАТАР
НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ
BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ



Лік беспрацоўных, якія згубілі працу з ініцыятывы адміністрацыі, узрос у большай ступені, чым лік тых, хто згубіў працу з уласнай ініцыятывы.

Кожны чацьверты беспрацоўны выйшаў на рынак працы без прафэсіі, досьведу працы, ці страціўшы сваю кваліфікацыю ў выніку доўгага перапынку. Дзеля падвышэньня канкурэнтаздольнасьці гэтай групе беспрацоўных патрабуецца прафэсійнае навучаньне, падвышэньне кваліфікацыі ці стажаваньне.

Прааналізаваўшы структуру беспрацоўных паводле катэгарыйнай прыкметы, можна зрабіць наступныя высновы: вызваленыя работнікі працягваюць заставацца асноўнай крыніцаю беспрацоўя.

БІРЖА ПРАЦЫ стар. 8



У гэтым нумары "Інфарматар" у рубрыцы **РЫНАК** прэзэнтуе кошты на будаўнічыя матэрыялы ў краіне. ***Глядзіце старонку 9***

Фэдэральная рэзэрвовая сыстэма ЗША распаўсюдзіла паведамленьне пра тое, што з 1996 году ва ўжытак будуць выпушчаны новыя віды купюраў. Першымі будуць выпушчаны банкноты вартасьцю 100 даляраў. Зьвяртаем Вашу ўвагу на тое, што адначасова з новымі купюрамі будуць хадзіць даляры старога ўзору.

У 1996 годзе Злучаныя Штаты Амэрыкі распачнуць увядзеньне грашовых знакаў з новымі сродкамі больш высокай абароны. Гэтыя сродкі дазволяць, наколькі магчыма, адмежаваць валюту ЗША ад падробак, якія вырабляюць з дапамогай дасканалае тэхнікі.

Старыя грашовыя знакі ЗША не падпадаюць пад зьняцьце і дэвальвацыю. Пры паступленьні ў Фэдэральную рэзэрвовую сыстэму яны будуць замяняцца на банкноты новага ўзору. Усе старыя і новыя грашовыя знакі ЗША захоўваюць свой поўны кошт. СПАЖЫВЕЦ стар. 11

Беларускае Таварыства "КНІГА"

Шаноўнае спадарства!

Выдадзены ўнікальны поўны збор твораў Уладзіміра Высоцкага ў 8 тамах. Сем з васьмі тамоў уключаюць у сябе ўсе паэтычныя і празаічныя творы У.Высоцкага. У першыя пяць тамоў увайшлі вершы і песьні паэта з усімі вядомымі на сёньня варыянтамі — усіх больш за тысячу тэкстаў. Шмат якія вершы друкуюцца ўпершыню. Шосты і сёмы тамы ўключылі ў сябе прозу, напісаную Высоцкім, лісты і дзёньнікавыя запісы, якія былі невядомыя да самага апошняга часу.

Восьмы том — даведкавы. Тут апублікаваныя біяграфія паэта, фільмаграфія, сьпіс спэктакляў, у якіх браў удзел Высоцкі, дыскаграфія, паказальнік фанаграмаў публічных выступаў і хатніх запісаў і канцэртаў, апісаньне архіваў. Збор твораў багата ілюстраваны — у яго ўвайшло блізу 200 фотаздымкаў, значная частка якіх публікуецца ўпершыню. Трэба вылучыць яшчэ адзін момант: сумарны аб'ём апублікаваных у Расеі твораў У.Высоцкага і матэрыялаў пра іх на сёньня як мінімум удвая меншы за тое, што прапанавана ў гэтым выданьні. У паліграфіі да гэтага выданьня ўжыты агульнасусьветны стандарт высокамастацкіх выданьняў.

Усе тамы аддрукаваныя на крэйдаванай паперы, абароненай ад пажаўценьня зь цягам часу, пераплёт цьвёрды. Фармат тамоў 12,5х20 см, сярэдні аб'ём кожнага тома — 580 старонак.

Гэты збор твораў — адзінае легальнае выданьне творчасьці У.Высоцкага ў Расеі.

Зьвяртацца на тэлефоны:
226-10-39, 227-76-06.
Беларускае Таварыства "КНІГА".





Рамонтная арганізацыя ажыцьцяўляе рамонтна-будаўнічыя працы са сваіх матэрыялаў ці з матэрыялаў замоўцы і адказвае перад замоўцам за якасьць працы і захаваньне вызначаных тэрмінаў рамонту. У кожнай жыльлёва-эксплюатацыйнай службе пры дыспэтчарскіх і аб'яднаных дыспэтчарскіх службах, а таксама пры вытворчым аддзеле аб'яднаньняў створаныя пункты прыёму замоваў на зьдзяйсьненьне бытавых паслугаў насельніцтву. Пры гэтым пункты прыёму замоваў маюць навочную інфармацыю й неабходную дакумэнтацыю.

Адрэсы гэтых службаў мы падаем на **стар. 10**

КОШТЫ НА РЭКЛЯМУ Ў ГАЗЭЦЕ "НАША НІВА" І ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ДАДАТКУ "ІНФАРМАТАР"

	"НАША НІВА"	"ІНФАРМАТАР"
Базавая стаўка ч/б	$0,5 см.кв.	$0,4 см.кв.
Замова ў рэклямным бюро	$0,5 см.кв.	$0,4 см.кв.
Замова праз тэлефон	$0,6 см.кв.	$0,5 см.кв.
Першая паласа	ч/б – $1 см.кв. Колер (ня меней за 100 см.кв.) – $2,5 см.кв.	ч/б – $0,9 см.кв.
Радковая рэкляма на паласе "Біржа працы"		5.000 руб. (зьмяшчаецца запар у двух нумарах)
Колер	ня меней за 50 см.кв. – $1	ня меней за 20 см.кв. – $1,5 см.кв.
TV–праграма		ч/б – $1 см.кв. колер – $1,5 см.кв. (ня меней за 50 см.кв.)

Замовіць рэкляму можна праз тэлефон 36–76–75 з 10.00 да 20.00 штодня, ці на адрасе: вул. Пуліхава, 29, кв. 61 да 18.00. Пры гэтых коштах ня ўлічваецца выраб арыгінал-макету.

Падпісны кошт 12.000 на месяц
36.000 на квартал

*** Прадугледжаны скідкі на колькасьць выхадаў і плошчу рэклямных аб'яваў**

Падпіска на газэту
"НАША НІВА"
праз пошту і "САЮЗДРУК"
індэкс 63125.
Падпіска праз недзяржаўную сетку дастаўкі
тэлефон 29-22-10 (Цыбульскі Леанід).

НОВЫЯ ВАКАНСІІ Й ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ. МЕНСК

ГРУПА "СЬЛЕСАРЫ, ЭЛЕКТРЫКІ, ЭЛЕКТРАМАНЦЁРЫ"

ТЭХНІКУМ ЭНЭРГЕТЫЧНЫ, вул. Радыяльная, 38, тэл. 45-41-15
Электрык
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя. Заробак 650.000 руб.

АБ'ЯДНАНЬНЕ МЯСНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ Г. МЕНСКУ, вул. Казінца, 46, тэл. 78-91-61
Электраманцёр
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

АБ'ЯДНАНЬНЕ ЖЫЛЬЛЁВАЕ ЖРЭА ПЕРШАМАЙСКАГА РАЁНУ, вул. Кедышкі, 27, тэл. 69-10-93, 66-28-48
Сьлесар-сантэхнік 4-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак 800.000 руб. Толькі жыхары Першамайскага раёну.

АБ'ЯДНАНЬНЕ СТАНКАБУДАЎНІЧАЕ ІМЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ, вул. Кастрычніцкая, 16, тэл. 26-17-11
Сьлесар эксплюатацыі й рамонту газавага абсталяваньня
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

ЦЭНТАР РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭХНІЧНЫ (МЭДРАМЗАВОД), вул. Батанічная, 16, тэл. 36-91-92
Сьлесар-інструмэнтальнік 5-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак 1.500.000 руб.

АБ'ЯДНАНЬНЕ "АХОВА", КАСТРЫЧНІЦКІ РАЁННЫ АДДЗЕЛ, вул. Маплёўская, 26, тэл. 24-36-12
Сьлесар-рамонтнік аўтамабіляў (аўтасьлесар) 4 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак 500.000—600.000 руб.

ЗАВОД "ТЭРМАПЛЯСТ", вул. Кнорына, 50, тэл. 69-94-21
Сьлесар-рамонтнік 5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны. Рамонт машынаў ліцейнага абсталяваньня.

ЗАВОД СРОДКАЎ КОМПЛЕКСНАЙ АЎТАМАТЫЗАЦЫІ, вул. Ляшчынскага, 8, тэл. 58-71-23
Сьлесар-рамонтнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Заробак дамоўны. Рамонт прамысловага абсталяваньня.

ІНСТЫТУТ СРОДКАЎ АЎТАМАТЫЗАЦЫІ (ІІСА), пр. Ф.Скарыны, 117, тэл. 54-61-18
Сьлесар-сантэхнік 4-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак 1.200.000 руб.

ЗАВОД ОПТЫКА-МЭХАНІЧНЫ ІМЯ ВАВІЛАВА, аб'яднаньне "Белома", вул. Макаёнка, 23, тэл. 64-15-61
Сьлесар-рамонтнік 3-4 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 5 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны. Рамонт і абслугоўваньне сантэхабсталяваньня.

ДОМ АФІЦЭРАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫ, вул. Чырвонаармейская, 53, тэл. 27-77-31
Сьлесар-сантэхнік 5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

ЦЭНТАР ІНЖЫНЭРНЫ НАВУКОВАГА ПРЫБОРАБУДАЎНІЦТВА, вул. Жодзінская, 1-3, тэл. 64-65-66
Сьлесар МСП (мэханазборных працаў) 5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак 800.000 руб.

УПРАВА (УПТК) ТРЭСТУ БЕЛРАМБУДСУВЯЗЬ, Калядзічы, тэл. 98-98-68
Сьлесар-сантэхнік 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.
Сьлесар-рамонтнік 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

"СТЭЛУС" МВКП, вул. Гараўца, 2, 6-ы пад'езд, тэл. 38-47-10
Электрамантажнік сілавых сетак і электраабсталяваньня
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 10 чалавек. Заробак дамоўны.
Электрамантажнік асьвятленьня й асьвятляльных сетак
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 10 чалавек. Заробак дамоўны.
Сьлесар-сантэхнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 10 чалавек. Заробак дамоўны. Мантаж сантэхабсталяваньня.

ПРАДПРЫЕМСТВА БЕЛАТЭП АП, вул. Стралковая, 14, тэл. 27-39-84
Сьлесар рамонту дызэльных рухавікоў
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.
Сьлесар рамонту аўтамабіляў (аўтасьлесар)
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.
Электрамантажнік сілавых сетак і электраабсталяваньня
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.
Сьлесар рамонту агрэгатаў
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

УПРАВА АДМІНІСТРАТЫЎНЫХ БУДЫНКАЎ ГАЛОЎНАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗЫДЭНТА, вул. Мясьнікова, 37, тэл. 20-44-19
Сьлесар-сантэхнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

БУДТЭХПРАГРЭС ГУ, Старабарысаўскі тракт, 15а, тэл. 64-40-62
Сьлесар-інструмэнтальнік 5-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны.

"БРУК" ВКФ, пр. Пушкіна, 13, 168, тэл. 51-23-61
Сьлесар-сантэхнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

ГРУПА "БУДАЎНІЧЫЯ СПЭЦЫЯЛЬНАСЬЦІ"

ЗАВОД УДАРНІК АТ "АМКАДОР", вул. Броўкі, 8, тэл. 32-15-15
Стропальнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Заробак 700.000 руб.

ЗАВОД 407 ГРАМАДЗЯНСКАЙ АВІЯЦЫІ, вул. Аэрадромная, 10, тэл. 21-91-33
Сталяр
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

ТРЭСТ 35 АТ, вул. Якуба Коласа, 38, тэл. 31-49-88, 66-39-05
Сталяр 3-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны. Зьвяртацца на тэл. 66-18-46
Маляр-тынкоўнік 3-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 10 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны. Зьвяртацца на тэл. 66-18-46, Галіна Пятроўна.

АСАЦЫЯЦЫЯ БУДІНДУСТРЫЯ, вул. Маскоўская, 18, тэл. 22-82-91
Цясьляр-бэтоньнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны. Зьвяртацца на тэл. 244-86-61.

ПРАДПРЫЕМСТВА РАЙДАРАЗЕЛЯНЕНЬНЕ ВРА, вул. Кутузава, 18, тэл. 64-14-62
Маляр-тынкоўнік 3-4 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 4 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак 800.000 руб.

ПРАДПРЫЕМСТВА МЕНСККАМУНЦЕПЛАСЕЦЬ, вул. Валгаградзкая, 12, тэл. 64-37-40
Электрагазазварнік (газаэлектразварнік) 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак 1.500.000 руб. Зварка сантэхабсталяваньня.

БЕЛАЎТАМОТАСЭРВІС МГП, вул. Брэсцкая, 2, тэл. 77-08-33
Электрагазазварнік (газаэлектразварнік) 5-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 5 чалавек. Заробак дамоўны. Зварка кодабаў і рамонт аўтамабіляў.

СЛУЖБА ЖЫЛЬЛЁВАЯ 79 (ЖЭС), вул. Чкалава, 22, тэл. 24-25-54, 25-16-86
Маляр 4 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак спрацаваны.

ЦЭНТАР ЭКАЛЯГІЧНЫ НАВУЧЭНЦАЎ, вул. Макаёнка, 8
Сталяр
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак 310.000 руб. Можна пэнсіянэра.

ШПІТАЛЬ 432 ГАЛОЎНЫ ВАЙСКОВЫ КЛІНІЧНЫ, вул. Варвашэні, 26, тэл. 34-98-42
Электрагазазварнік (газаэлектразварнік)
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак 500.000 + сумяшчэньне

ЗАВОД ТЭРМАПЛЯСТ, вул. Кнорына, 50, тэл. 69-94-21
Электрагазазварнік (газаэлектразварнік) 5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны.

УПРАВА РБУ БЕЛРАМБУДМАНТАЖ ВА "БЕЛОМА", пр. Ф.Скарыны, 76а, тэл. 66-06-29
Аздобнік (абліцоўнік) 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб.
Цясьляр 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб.
Тынкоўнік 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб.
Муляр 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб.

ДОМ АФІЦЭРАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫ, вул. Чырвонаармейская, 3, тэл. 27-77-31
Тынкоўнік 5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.
Цясьляр 5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.
Стрэшнік 4 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

АРГАНІЗАЦЫЯ АРАНДАТАРАЎ СРБУ 1, вул. К.Чорнага, 5а, тэл. 32-85-92
Стрэшнік 4-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 4 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны.
Тынкоўнік 4-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 5 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны.

УПРАВА 10 НАЧАЛЬНІКА ПРАЦАЎ МА РБ, вул. Уручанская, 21, тэл. 69-84-84
Стрэшнік рулённых дахаў
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны.
Маляр-тынкоўнік 2-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 15 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны.

ПРАДПРЫЕМСТВА БЕЛАТЭП АП, вул. Стралковая, 14, тэл. 27-39-84
Маляр-тынкоўнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Замова дамоўная.

УПРАВА БУДАЎНІЧАЯ БУ 211 ТРЭСТУ 35, вул. Я.Коласа, 38, тэл. 31-68-29, 68-37-29
Маляр 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 10 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. З досьведам працы ня меншым за 5 год.
Аздобнік-плітачнік 4-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 4 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. Зьвяртацца на тэл. 68-37-29. З досьведам працы ня меншым за 5 год.

БЕЛДОМ ТАА, вул. Багдановіча, 129а, тэл. 34-92-29
Маляр-тынкоўнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 8 чалавек. Заробак дамоўны. Зьвяртацца да Калесьнікава. Праца па ўсёй Беларусі.
Аздобнік-плітачнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны. Зьвяртацца да Калесьнікава. Праца па ўсёй Беларусі.
Цясьляр
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 4 чалавекі. Заробак дамоўны. Зьвяртацца да Калесьнікава. Праца па ўсёй Беларусі.
Муляр
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 12 чалавек. Заробак дамоўны. Зьвяртацца да Калесьнікава. Праца па ўсёй Беларусі.

ТАА "ПРЫЗНАНЬНЕ", вул. Аэрадромная, 2
Муляр 3-4 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак спрацаваны.
Маляр-тынкоўнік 4-5 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 6 чалавек. Заробак спрацаваны.

ДП БУДТЭХПРАГРЭС, Старабарысаўскі тракт, 15а, тэл. 64-40-52
Маляр-тынкоўнік 4-6 ступені
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 8 чалавек. 4 жанчыны. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак спрацаваны. Зьвяртацца на тэл. 64-79-64

НВАС МП, вул. Казінца, тэл. 77-01-72
Сталяр-станочнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 4 чалавекі. Заробак дамоўны.

"БРУК" ВКФ, пр. Пушкіна, 13-162, 51-168, тэл. 51-23-61
Газаэлектразварнік (электрагазазварнік)
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

МЕНСК 90 (КААПЭРАТЫЎ), вул. Р.Люксэмбург, 205, тэл. 56-72-51
Муляр
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.
Маляр
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Заробак дамоўны.
Тынкоўнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

ГРУПА "ПРАЦА БЕЗ СПЭЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ"

ПРАДПРЫЕМСТВА "БЕЛЭНЭРГАРАМНАЛАДКА", вул. Ф.Скарыны, 18, тэл. 33-82-57
Даглядчык-прыбіральнік
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак 500.000 руб. Зьвяртацца на тэл. 39-52-57

ІНСТЫТУТ (ПІ) "БЕЛППРААГРАХАРЧПРАМ", вул. Кальварыйская, 1, тэл. 26-46-80
Даглядчык (дворнік)
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак 145.000 руб.
Ліфцёр
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

БІБЛІЯТЭКА НАВУКОВА-МЭДЫЧНАЯ, вул. Фабрыцыўса, 28, тэл. 25-51-67, 26-41-45
Прыбіральніца службовых памяшканьняў
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак 300.000 руб.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ПОЛІТЭХНІЧНАЯ АКАДЭМІЯ (БДПА), пр. Ф.Скарыны, 65, тэл. 32-77-97
Даглядчык
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак 450.000 руб. Зьвяртацца на тэл. 39-91-71

ТЭАТАР ДЗЯРЖАЎНЫ МАЛАДЗЁЖНЫ, вул. Даўмана, 1, тэл. 50-29-51
Даглядчык
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак 250.000 руб. Праца з малым аб'ёмам.

"ВЯСЁЛКА" ФІРМА, вул. Ліфкова, 16, тэл. 21-76-63
Прыбіральніца службовых памяшканьняў
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак 210.000 руб. Двойчы на тыдзень.

ПРАДПРЫЕМСТВА РАЙДАРАЗЕЛЯНЕНЬНЕ ВРА, вул. Кутузава, 18, тэл. 64-14-62
Работніцы зялёнага будаўніцтва
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачатковая сярэдняя. Заробак да 1.000.000 руб.

КЛІНІКА ДАРОЖНАЯ, вул. Каржанеўскага, 4, тэл. 78-21-21
Санітарка
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак 550.000 руб.

ФІРМА ТРЫКАТАЖНАЯ "АЛЕСЯ", вул. Старавіленская, 131, тэл. 34-16-52
Даглядчык
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 2 чалавекі. Заробак 440.000 + 40 працэнтаў. Бронь Савецкага выканкаму

КЛІНІКА ДЗІЦЯЧАЯ N2, вул. Стаханава, 16, тэл. 23-14-97
Сястра-гаспадыня
Сталая занятасьць. Поўны працоўны дзень. Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны. Бронь Фрунзэнскага раёну.

Рынак працы: студзень - сьнежань 1995

6. Прапанова працоўнае сілы

Лік беспрацоўных, якія згубілі працу з ініцыятывы адміністрацыі, узрос у большай ступені, чым лік тых, хто згубіў працу з уласнай ініцыятывы.

Кожны чацьверты беспрацоўны выйшаў на рынак працы без прафэсіі, досьведу працы, ці страціўшы сваю кваліфікацыю ў выніку доўгага перапынку. Дзеля павышэньня канкурэнтаздольнасьці гэтай групе беспрацоўных патрабуецца прафэсійнае навучаньне, павышэньне кваліфікацыі ці стажаваньне.

Прааналізаваўшы структуру беспрацоўных паводле катэгарыйнай прыкметы, можна зрабіць наступныя высновы: вызваленыя работнікі працягваюць заставацца асноўнай крыніцаю беспрацоўя. Іхная доля ў ліку беспрацоўных пасьля доўгачасовай тэндэнцыі зьніжэньня ізноў пачала ўзрастаць і на 01.01.96 г. склала 41,6% (на 01.01.95 г. — 39,1%, на 01.01.94 г. — 48%, на 01.01.93 г. — 77%).

Звольненыя з прычынаў плыннасьці складаюць пятую частку беспрацоўных (20,2%), іхная доля ў ліку беспрацоўных пасьля доўгачасовай тэндэнцыі нарастаньня стабілізавалася.

На трэцім месцы сярод беспрацоўных — 12% — збольшага работнікі, звоненыя па сканчэньні тэрміну працоўнай дамовы, контракту ды інш. На 01.01.95 г. іхная доля была таксама досыць высокай — 13%.

Выпускнікі навучальных установаў — на чацьвертым месцы. Доля іх у ліку беспрацоўных працягвае зьніжацца (на 01.01.96 г. — 11,5%, на 01.01.95 г. — 13,1%, на 01.01.94 г. —16,7%).

На долю астатніх катэгорыяў прыпадае 14,7% беспрацоўных.

Пераважную частку зарэгістраваных беспрацоўных складаюць жанчыны — 77,7%; рабочыя — 52,8%; асобы, якія маюць сярэднюю й няпоўную сярэднюю адукацыю — 58,1%.

	на 01.01.96	на 01.01.95
Полаўзроставая структура беспрацоўных, %		
мужчыны	22,3	20,5
жанчыны	77,7	79,5
Наагул:	100,0	100,0
Узрост		
да 18 гадоў	5,3	7,2
18-25 гадоў	28,8	24,8
26-30 гадоў	11,9	14,6
31-40 гадоў	27,8	28,5
41-50 гадоў	19,8	17,9
старэйшыя за 50 гадоў	6,4	7,0
Усяго:	100,0	100,0
Адукацыя		
з вышэйшай адукацыяй	23,8	35,6
зь сярэдняй спэцыяльнай адукацыяй	18,1	20,0
зь сярэдняй адукацыяй	51,9	38,6
бяз поўнай сярэдняй адукацыі	6,2	5,8
Наагул:	100,0	100,0

Полаўзроставая структура беспрацоўных зьмянілася ў бок павелічэньня долі беспрацоўных мужчынаў, а таксама павелічэньня долі беспрацоўнае моладзі ва ўзросьце да 25 гадоў і долі беспрацоўных ва ўзросьце 41-50 гадоў. У выніку сярэдні ўзрост беспрацоўнага амаль не зьмяніўся і склаў на канец 1995 г. 32,6 году. Рэзка зьнізіўся адукацыйны ўзровень беспрацоўных: доля тых, якія маюць вышэйшую й сярэднюю спэцыяльную адукацыю, у параўнаньні з пачаткам году зьнізілася з 55,6% да 41,9%. Гэта зьвязана з рэзкім узрастаньнем долі беспрацоўных рабочых у агульным іх ліку з 34,4% (на 01.01.95 г.) да 52,8% (на 01.01.96 г.). Такім чынам, за мінулы год афіцыйны рынак працоўнае сілыператварыўся зь пераважна "белакаўнерыкавага" ў "сінекаўнерыкавы".

Сярэдняя працягласьць беспрацоўя ўзрасла з 6,2 да 7,1 месяца. Доўгачасовым беспрацоўем (працягласьцю болей за 1 год) ахопленыя 1295 беспрацоўных, гэта значыць 10% да іхнага ліку на 01.01.96 г.

Зыходзячы з наяўных статыстычных зьвестак можна ўмоўна вылучыць наступныя тыпы беспрацоўя, уласьцівыя для рынку працы гораду паводле стану на канец 1995 г.:

— лятэнтнае (схаванае) беспрацоўе, якое найбольш распаўсюджанае й нясе ў сабе пагрозу масавага беспрацоўя. Паводле нашай ацэнкі ўвогуле ў народнай гаспадарцы ёю ахоплена каля 60 тыс. чалавек. Узровень беспрацоўя, разьлічаны з улікам схаванага беспрацоўя ў прамысловасьці, склаў 3,9%, з улікам схаванага ў народнай гаспадарцы — каля 8%, што нашмат перавышае велічыню памежнага сацыяльна-допушчальнага ўзроўню беспраўцоўя ў г. Менску, усталяванаму спэцыялістамі НДІ працы Міністэрства працы РБ і цалкам адпавядае графіку Фінбаначы (8-13% — крызыс у эканоміцы).

Прыблізна можна таксама ацаніць фрыкцыйнае беспрацоўе, якое склала 4,2 тыс. чалавек ці 32% агульнага ліку беспрацоўных на канец году. Кожная спроба ацаніць структурнае беспрацоўе для сытуацыі на рынку працы г. Менску ў цяперашні час будзе загадзя недакладнай, бо не існуе дакладных мэтадаў ягонага вызначэньня.

Прыблізная ацэнка агульнае прапановы працоўнае сілы на рынку працы паказала наступнае:

	1995 г.	1994 г.	гр. 2 у % да гр. 3
Агульная прапанова працоўнае сілы, чал.	119.409	105.935	112,7
у тым ліку:			
беспрацоўныя (у сярэднім)	10.331	10.327	100,0
звольненыя з прычынаў плыннасьці і ў сувязі са скарачэньнем штату	109.078	95.608	114,1
зь іх:			
звольненыя ў сувязі са скарачэньнем штату	16.729	11.207	149,3

Агульная прапанова працоўнае сілы ўзрасла на 12,7% найперш за кошт павелічэньня з прычынаў плыннасьці (60%), а таксама звольненых у сувязі са скарачэньнем штату (40%). Беспрацоўе на агульную прапанову працоўнае сілы на рынку працы не паўплывала. Паводле нашай ацэнкі ў службе занятасьці летась рэгістраваўся кожны шосты-сёмы з тых, хто шукаў працу (паўплывала зьмяненьне структуры рынку працы ўвогуле), і кожная трэцяя вакансія. Пры накладаньні тэндэнцыі ў руху агульнага попыту на працоўную сілу й яе прапановы, разьлічаных з выкарыстаньнем каэфіцыентаў далікy, удалося выявіць абсалютны лішак працоўнае сілы на рынку працы (прыблізна 35 тыс. чалавек). Цяперашняя дзяржаўная статыстыка не дазваляе зрабіць больш дакладнага аналізу.

Кан'юнктура рынку працы службоўцаў (студзень-сьнежань 1995 г.)



Працяг у наступным нумары

Паводле інфармацыі Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва

БУДАЎНІЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ (кошты пададзены ў тыс. руб.)

Агульнабудаўнічыя матэрыялы

Даламіт драбл. для дарожн. будаўн. ф. 20-40 мм, т.	39,96
ф. 40-80 мм, т.	35,7
ф. 5-12 мм, т.	35,04
Мармуровая крошка 5-10 мм, т.	1220
белая, т.	2500
шэрая, т.	2000
Мука даламіт. для вапнаваньня кісл. глебаў, т.	81,95
Пясок мыты, м^3	19-20,7
Пясок будаўнічы, м^3	17
Пясочна-жвіравая сумесь узбагачаная, м^3	25
Друз жвіравы, м^3	70
Бэтон бяз друзу М 200	354
М 300	398
Бэтон М 100-300, м^3	418
Бэтон таварны М 100 (В7,5), м^3	315,2
М 100 фр. 5-20 і фр. 20-40, м^3	454,5
М 150 фр. 20-40 і фр. 5-20, м^3	465,04
М 200 (В15), м^3	370
М 200 фр. 5-20 і фр. 20-40, м^3	522,7
М 250 (В20), м^3	375
М 300 (В22,5), м^3	411,3
М 300 фр. -20 і фр. 0-40, м^3	562,9
М 400, м^3	467
М 60 (В3,5), м^3	278,5
М 75 (В5), м^3	278,5
Рошчына вапнавая, м^3	325
Рошчына М 050, м^3	317,84
М 100, м^3	409,87
М 200, м^3	516,75
М 75-300, м^3	390
Рошчына таварная вапнавая, м^3	390
Рошчына таварная М 100, м^3	333,1
М 100, т.	469,3
М 200, м^3	500,46
М 75, м^3	314,94
Рошчына таварная складаная, м^3	415
Рошчына таварная цэмэнтавая, м^3	420
Рошчына цэмэнтавая М 100, м^3	342
М 50 – М 200, м^3	545,6
Сумесь гарачатрывалая, т.	856,6
Гіпс будаўнічы, т.	1151
Вапнава-пясочная сумесь, т.	287,5
Вапна ў мяхах, мех 35 кг	42,8
Вапна будаўн. комавая слабагідраўлічн. ДАСТ 9-179-77, т.	445,3
Парашок мінэр. для асфальтава-бэтонных сумесяў, т.	119,2
Портляндцэмэнт белы М 400 у тары, т.	3100
Портляндцэмэнт М 500 у тары, т.	800
Цэмэнт у мяхах, т.	760
Блёкі зь ячэйкавага бэтону для перагародак, м^3	360
сьценав. дробныя, м^3	354
для ўнутр. перагародак, м^3	382
Блёкі дробныя, м^3	385,05
Блёкі сьценавыя аздобныя 20x20x40, 10x20x40, м^3	369
Камень керамічны падвойны М 100, тыс. шт.	2120
Цэгла керамічн. для кладкі комінаў, тыс. умоўн. шт.	1256
Цэгла керамічная аздобная, тыс. умоўн. шт.	1265
Цэгла керамічная паўнацелая, тыс. умоўн. шт.	1510
шараговая эфэктыўная, тыс. умоўн. шт. 1170	
Цэгла пярэдняя М 100, тыс. шт.	1300
М 125, тыс. шт.	1320
Цэгла звыч. высакамарачн. М 150, тыс. шт.	1200
М 175, тыс. шт.	1250
Цэгла сылікатн. адзінарная, тыс. шт.	588,25
палутарная, тыс. шт.	551,35
патоўшчаная М 200, тыс. шт.	550
Цэгла сылікатная, тыс. умоўн. шт.	620
СКЦ-2Л-ББ10 390x90x190 2200 кг на м^3 без фарбавальніка	5,29
390x90x56 2200 кг на м^3 з фарбавальнікам	6,67
Цэгла СКЦ-2Л-ББ9 190x90x56 1900 кг на м^3 без фарбавальніка	0,736
190x90x56 1900 кг на м^3 з фарбавальнікам	0,92
190x90x56 2100 кг на м^3 без фарбавальніка	0,736
190x90x56 2100 кг на м^3 з фарбавальнікам	0,92
Цэгла СКЦ-3Л-ББ11 390x90x190 2200 кг на м^3 без фарбавальніка	8,625
з фарбавальнікам	6,9
Цэгла трубная пляст. прэсаваньня М 100, тыс. шт.	1170
М 125-150, тыс. шт. 1210	
М 75, тыс. шт.	1130
Цэгла эфэктыўная М 100, тыс. шт.	1000
М 125, тыс. шт.	1050

Матэрыялы аздобныя

Пліты гарачатрывалыя, м^3	2728,3
Дзюбэль для падвясн. столі NA-24 4, 8x24 мм, шт.	$0,19
Кафля дэкаратыўная, м^2	585
непаліваная, м^2	352,25
Маркізы	$230+
Пліта ДСП 1750x3500x16 мм Е1, гатунак 1, м^2	29
2750x1800x16 мм Е-1, П-А гатунак 1, м^2	29,1
лямінаваная 1750x3500x16 мм Е1 гатунак 1, м^2	65
Плітка гранітная паліраваная, таўшч. 30 мм, м^2	1050
шліфаваная, таўшч. 30 мм, м^2	950
Плітка мэтляхская паліваная, м^2	87
непаліваная, м^2	63,5
мармуровая піленая, таўшч. 15мм, м^2	405
таўшч. 20 мм, м^2	455
таўшч. 25 мм, м^2	460
Плітка аздобная, італьянская тэхналёгія, м^2	$8,5
Плітка аздобная, м^2	46,9
фасадная, м^2	66,3
Плітка керамічная паліваная каляровая для ўнутр. аздабл. муроў, м^2	51
Плітка керамічная паліваная для ўнутр. аздабл. муроў, м^2	50
Пліты ДВП цьвёрдыя СТ, ТСВ група А ДАСТ 4598-86, м^2	7800
Шпатлёўка БНШ, кг	12,5+
Ізаплен, м^2	15,1
Дывановыя пакрыцьці ў асарт., м^2	$3,4+
Дывановыя пакрыцьці для офісаў Бэльгія, Нямеччына, м^2	$6
Ліналеўм усьпенен. аснова, Польшча, м^2	89,7
на цеплагукаізал. аснове, м^2	59,8
на тканінавай аснове, м^2	77,7
ПВХ для аўтатранспарту (аўталін), м^2	70,7
на тканінавай аснове, Польшча, м^2	92,3
уцепл. шыр. 1,5м Чэхія, м^2	$5
Бяліла тытанавыя, кг	24
Грунт ГФ-021, кг	21
ГФ-230 розных колераў, фас. 2,3 кг, кг	100
Грунтоўка Senerprimer на 100-200 м^2, 25 кг/вядро	$222
Tited Primer на 70-100 м^2, 20,5 кг/вядро	$198
Клей КМЦ канц., тара 0,5 кг, 20 кг, кг	39
касьцявы, мэздровы, кг	16
ПВА, кг	26
Фарба Polinak, для ўнутр. працаў, л	28
Polinit, белая эмульс. для ўнутр. і вонкав. працаў, л	34
пясочная, водаэмульс., л	30
Фарба водаэмульс. у бляшанках белая, Чэхія, кг	12
Фарба водаэмульс., кг	26
Фарба водаэмульс. Superlex, Чэхія, кг	8,5
Фарба водаэмульс., Чэхія, бляшанка 5,5 кг	58,5
блакітная, кг	13,2
КФ Вохра, фас. 2,4 кг	57
пятэксная фасадн. і ўнутр., кг	$2,3
МА-15, кг	24
МА-25 белая ноч, Берасьце, бляшанка 1,3 кг, кг	25
МА-25, Берасьце, бляшанка 3 кг, кг	25
алейн. блакітная ў бочках, кг	22
алейн. для ўнутр. працаў, кг	22
Нітраляк Kapon-lux, л	46
Kapon-Super, л	50
Нітраэмаль белая, л	51
чырвоная, л	67
сьветла-блакітная, л	53
сьветла-жоўтая, л	60
сьветла-гарэхавая, л	51
сьветла-шэрая, л	52
цёмны хакі, л	52
чорная, л	49
Пакост Аксоль, Віцебск, кг	15
Пакост Аксоль, кг	12
Пакост, т	24,444
Пудра алюміневая, кг	60
сьпіжовая (бронз.), кг	70
Распушчальнік для фарбаў АСП-3, АСП-3М, АСП-4, л	1,1$
Сумесь сухая для бясшвовай падлогі, т	995,5
для замазваньня міжпліткавых швоў (запаўн. – даламіт), т.	3753
Сумесь сухая для тынкаваньня вонкавых муроў з каляр. дамешкамі, т	2091,5
Сурык дэкаратыўны жалезны, кг	23
Сурык жалезны МА-15 гатовы да ўжываньня, чырвона-брунатны, бляшанка 3 кг, кг	33
Сурык жалезны сухі, кг	15
Шпатлёўка БНШ, кг	12,5+
клеевая, кг	3
Эмаль ПФ-115 белая, Берасьце, бідоны, 70 кг, кг	35
белая, бляшанка 3,2 кг, кг	140,4
белая, кг	33,8
сьветла-жоўтая	41503
шэра-зялёная, кг	20
ПФ-116 вішня	33,176
цёмна-жоўтая	41,503
ПФ-1217 розных колераў, фас. 2,3 кг	110
Шкло "Рытм", м^2	100
вітрын. непаліраў., ДАСТ 111-90, таўшч. 5,6 мм, м^2	33,4
вакон. непаліраў., ДАСТ 111-90, таўшч. 3,4,5 мм, м^2	15,5
вакон. 4 мм, 1,2x2,0, м^2	37
вакон. вітрын., м^2	43+
танаван. 120x160 см, таўшч. 3-10 мм, м^2	69
Шкляны блёк каляр., шт.	5,1
Бітум БН-4, т	2730
М 5, т	1400
Маса гідраізаляцыйная Фаргум, бочка, кг	$1,33
Мастыка асфальт, бочка, кг	$0,64
навал, кг	$0,57
бітумная, т.	2600
бітумна-палімэрная, бочка 175 кг, кг	9,8
стрэхавая, т.	5006,3
Напаўняльнік для пакрыўнага пласту рубэроіда, т.	119,2
Пакрыцьцё падсьціл. Senerflex Alpha Base Coat, на 11,2 м^2, 27,2 кг/вядро	$134
на 7,43 м^2, 27,2 кг/вядро	$130
Рубэроід браняваны, м^2	5,952
пракладкавы, м^2	5,054
РКК, рулён 10 м^2	RUR29,25
РКК-400, рул. 10 м	75,4
РКП, м^2	5,835
РКП-350 15 м	85
РКП-350Б, рулён 15 м^2	30,02RUR
Шклопластык РСТ, м^2	23
СТЛ, мп	17
Толь асфальт. верхняпласт. W400/1200, м^2	$1,42
мадыф. шэры з фольгай, м^2	$1,85
W400/1400 мадыф. шэры з фольгай, м^2	$20,7
каляр. з фольгай, м^2	$1,96
Толь асфальт. ізаляцыйны 1400, м^2	1,08
Р400/1200, м^2	$1,42
Дахоўка з адкідаў чорнае сталі, шт.	13,6
з ацынк. сталі, шт.	417
вільчыкавая, шт.	7,4
палавінавая, шт.	5,4
шараговая, шт.	6,95
франтавая правая, шт.	9,4
франтавая левая, шт.	9,4
Шыфер 8-хвалевы, шт.	32
СВ-1750 8-хвалевы ліст.	17,6
СВ-40, ліст.	24,29
Антыпірын з нэфэліну, кг	8
Карбід вапню (кальцыю)	10,27
Карбід вапню 25/80 125 кг, кг	8,5
фр. 25-80, кг	7,3
Медны купарвас, кг	18,5
Крэйда кармавая, т.	259,47
молатая, т.	467,7
Пэнаполістырол, скл., м^3	650
Поліўрэтанавыя апорныя часткі ПЧ-15 (3,38 кг)	885,95
ПЧ-21 (5,30 кг)	1442,3
ПЧ-33 (7,08 кг)	1866,9
Шкложылка, мп	27

Бэтонныя й жалезабэтонныя вырабы

Бэлька ж/б для вытворч. будынкаў ФБ6-01 даўж. 450 мм, м^3	1584,7
падмуркавая ФБ6-1, м^3	1770,9
ФБ сэрыя 1.415.1, м^3	177
Бэтон зборны ФБС 24.3.6, м^3	822
24.4.6, м^3	821
24.5.6, м^3	820
24.6.6, м^3	819
Блёкі бэтонныя ФБС, м^3	432,1
муроў сутарэньня, м^3	520
ФБС 12.3.3т, V выр. 0.108 м^3, м^3	320
24-3-6т, V выр. 0.59 м^3, шт	215,18
24-4-6т, V выр. 0.62 м^3, шт	287,79
24-5-6т, V выр. 0.4 м^3, шт	359,87
24.3.6, V выр. 0.406 м^3, м^3	617
Пліты П6 ВА, V выр. 0.7 м^3, м^3	1375,8
ж/б стужкавых падмуркаў ФЛ, м^3	830,9
стужкавыя падмуркавыя ФЛ 10.12.24 V выр. 0.52 м^3, м^3	990
стужкавыя падмуркавыя ФЛ 12.12.24 V выр. 0.64 м^3, м^3	992
стужкавыя падмуркавыя ФЛ 6.12.24 V выр. 0.37 м^3, м^3	941
стужкавыя падмуркавыя ФЛ 8.12.24 V выр. 0.42 м^3, м^3	981
стужкавых падмуркаў ФЛ 10.12.4 V выр. 0.26 м^3, м^3	881,7
стужкавых падмуркаў ФЛ 10.24.4 V выр. 0.55 м^3, м^3	869,3
стужкавых падмуркаў ФЛ 12.12.4 V выр. 0.31 м^3, м^3	948
стужкавых падмуркаў ФЛ 12.24.4 V выр. 0.65 м^3, м^3	935
стужкавых падмуркаў ФЛ 14.12.4 V выр. 0.36 м^3, м^3	1153,2
стужкавых падмуркаў ФЛ 14.24.4 V выр. 0.76 м^3, м^3	1084,5
стужкавых падмуркаў ФЛ 32.12.3 V выр. 1.29 м^3, м^3	1338,4
Палі з насадкай СН-5, V выр. 0.37 м^3, шт	810
СН-6, V выр. 0.43 м^3, шт	905
СН-7, V выр. 0.49 м^3, шт	1018
Палі сяч. 30x30 даўжыня ад 4 да 7 м, м^3	1072,2
Палі сячэньнем 300x30 мм 13-12 м, м^3	1196,75
Палі СПК 380x70, V выр. 0.65 м^3, м^3	1837,3
Палі будаўнічыя, 30x30 см С 10/30 V выр. 0.91 м^3, шт	1339
Палі будаўнічыя, 30x30 см С 3/30 V выр. 0.28 м^3, шт	436
Падмуркавыя блёкі, м^1	510,9
Падмуркі 1Ф 21.9 V выр. 2.2 м^3, м^3	803,8
1Ф 9.9.1, V выр. 0.36 м^3, м^3	926,6
СФК 10, V выр. 0.408 м^3, м^3	772,2
Ф 13, V выр. 1.27 м^3, м^3	710,2
Ф 17, V выр. 1.67 м^3, м^3	816,2
Ф 21, V выр. 2.19 м^3, м^3	842,2
1Ф 12-12-2, V выр. 0.55 м^3, м^3	1017,3
стужкавыя ФЛ, м^3	484+
стужкавыя ФЛ, м^3	717,7
Блёкі бэтонныя М 100, V выр. 1.117 м^3, м^3	462,1
пустыя, м^3	480,8
Блёкі керамзытава-бэтонныя, м^3	370
сьценкавыя аздабл., V выр. 0.0158 м^3, м^3	402,1
Колцы сьценкавыя d1000 мм, м^3	972,56
Панэлі бэтонныя эл. награвальныя ад сеткі 220В, кампл.	868,3
Панэлі ўнутр. сьценак, для сутарэньняў без вэнтыляц. каналаў таўшч. 16 см, м^3	811,3
Панэлі двухпластавыя сьценкав. керамзытава-бэтон. для с/г будынкаў, ПСД, м^3	1573,37
Панэлі са шчыльнага сэлікабэтону, м^3	738
Кроквы 18 м, м^3	2172,5
1БСД9, м^3	1998
1БСТ6, м^3	1417
6м 1БСТ 6-5АШ, V выр. 0.45 м^3, м^3	2909,9
6м БСТ 6-2АШ, V выр. м^3, м^3	2287,6
9м БСТ 9-4АШ, V выр. 1.1 м^3, м^3	2237,1
падкранавыя даўж. 12, м^3	2163,76
6, м^3	2337,85
Кроквы БСП 6.1.3АШ, V выр. 0.4 м^3, м^3	1718,2
6.1.4АШ, V выр. 0.4 м^3, м^3	1919,5
6.1.5АШ, V выр. 0.4 м^3, м^3	2026,4
6.1.6АШ, V выр. 0.4 м^3, м^3	2068,8
6.1.8АШ, V выр. 0.4 м^3, м^3	2122,6
6.1.9АШ, V выр. 0.4 м^3, м^3	2350
9.2-4АШ, V выр. 1.1 м^3, м^3	1438,5
9.2-5АШ, V выр. 1.1 м^3, м^3	1592,1
9.2-7АШ, V выр. 1.1 м^3, м^3	1844
9.2-8АШ, V выр. 1.1 м^3, м^3	1975,5
9.2-9АШ, V выр. 1.1 м^3, м^3	2189,9
падмуркавыя ФБ 6-1, V выр. 0.57 м^3, м^3	1695,5
6-11, V выр. 0.71 м^3, м^3	1654,9
6-1, V выр. 0.62 м^3, м^3	1061,4
6-13, V выр. 0.57 м^3, м^3	1256,1
6-14, V выр. 0.53 м^3, м^3	1532,6
6-15, V выр. 0.51 м^3, м^3	1494,73
6-16, V выр. 0.48 м^3, м^3	1074,3
Вэнтыляцыйныя блёкі с1.0.34 В 15-33, шт.	1474,4
с1.0.34 В 8-33, шт.	929,9
сумешч. з дыяфр. 2 ВДП 26-33, шт	3277,4
1 ВД 26-33, шт.	3209,6
Паўрамы пралётам 18,21 м, м^3	2580
Дыяфрагмы	2013
Дыяфрагмы 1Д-30-33	121,913
с1.020 2 Д 30-33, шт	3025,2-3329,7
Дно ПН-10 для колцаў КС-10-9 калодзежаў, шт	198
Колцы 1,0x1,5x2,0 м, м^3	852
10-9, м^3	1222,8
15-9, м^3	1082,6
ж/б для калодзежаў КС-10-9 d1000 мм, выш. 890 мм, шт	270,7
ж/б для калодзежаў КС-15-9 d1000 мм, выш. 890 мм, шт	452,5
Колцы й перакрыцьці калодзежаў, м^3	1415
Агароджа	1634
Агароджа ПІВ 5320x2000 1.1	1241,29
Панэлі плоту П-5В, м^3	1321,8
2,5x2,7 м, м^3	1170
Пліта агароджы, V выр. 1 м^3, м^3	1600,8
"Шклянкі" агароджы	801,774
пад агароджу ППС-10,52	1725,93
Слупы агароджы СЗБА, V выр. 0.05 м^3, м^3	1871
Слупкі агароджавыя ст. 1, V выр. 0.0448 м^3, м^3	1414,9
Слупы агароджы даўж. 1,8, 2,5 м, м^3	1313
С-19,5, м^3	2445,5
Бардзюр БР-100-20-8 ходнікавы, м^3	721,8
БР-100-30-8 дарожны, м^3	639,3
БР 100.20.8, м^3	1295,6
БР 100.30.15, V выр. 0.043 м^3, м^3	1013
БР 100.30.8, V выр. 0.016 м^3,м^3	949
Бардзюр дарожны БР 100.20.8, м^3	1287,5
Пліта дарожная, м^3	1684
ПЛ-50, м^3	2998,9
ходніка П-10, V выр. 0.60 м^3, шт	912
Плітка ходнікавая 500x500 мм, м^3	132,05
500x500x70, м^3	1321,8
7к-Б, м^3	953,9
фігурная таўшч. 50 мм, м^2	33,7
Плітка ходнікавая, м^3	832
Пліты дарожныя ПД 1-6а, шт	423,5
Элемэнты гаражоў П 62-20-12т, шт	2185,7
ПС 34-22-8ат, шт	1081,3
ПС 60-21-8ату, шт	1971
ФБ 10-3-2т, шт	993

Піламатэрыялы й сталярныя вырабы

Балянсы хваёвыя й бярозавыя, м^3	$36
Брусы розных памераў, шт	1200
Брусок аздобны, мп	3
Дошка вагонка фігурная, м^3	2480
хвойная сухая, м^3	3600
Дошка неабразная 25-60	790
лістоўная, м^3	400
хвойных пародаў 1 гатунак, м^3	862
Дошка абразная 25-60	1000
хвойных пародаў 1 гатунак, м^3	1281
Дошка падлогі 27, 35, м^3	2000
хвойная т.27, сухая, м^3	3300
Лесаматэрыял круглы лістоўн. пародаў, м^3	290
Спэцнапіл лістоўн. пароды на варштаце, м^3	783,7
Стружка драўляная, т	800
Фанэра А/АВ ДАСТ 3916-89 Е1, таўшч. 12-14 мм, м^3	4230
15 мм і больш, м^3	4980
4 мм, м^3	6230
5-7 мм, м^3	4910
8-10 мм, м^3	4650
12-14 мм, м^3	3530
Ліштва ш. 74 мм, мп	5,2
ш. 84 мм, мп	6,4
Вокны, дзьверы, перагародкі, м^2	$120+
Паркет бярозавы 30%, м^2	41
50%, м^2	68
80%, м^2	100
дубовы 30%, м^2	93,5
50%, м^2	155,5
80%, м^2	248,5
В, м^2	310,5
хваёвы 30%, м^2	24
50%, м^2	40
80%, м^2	63,5
В, м^2	79,5
Рэйка падлогавая, м^3	1350
Шпон габляваны таварны, м^2	5,5+
Штапік дзьвярны В, м^2	3,25
лістоўны, мп	2,1
ваконны В, м^2	1,4
ваконны, дзьвярны, мп	1,09+
Блёкі дзьвярныя ДГ 21-13, м^2	195,95
ДГ 21-9, м^2	197,36
ДГ, фанэраваныя, м^2	467
ДН 21-10, м^2	215
ДН 21-9, м^2	241,79
з ДВП ДГ21x8, шт	310
ДГ21x9, шт	350
ДН21x9, шт	370
ДО21x13, шт	480
ДО21x8, шт	250
ДО21x9, шт	330
Блёкі дзьвярныя філёнкавыя ДГ 21-13, шт	604,55
ДГ 21-9, шт	402,95
ДО 21-13, шт	532,25
ДО 21-9, шт	376,4
Блёкі дзьвярныя, алюмінь, шкло, на замову, м^2	$110+
дошкавая філёнка, м^2	280
Дзьверы ўваходныя з ПВХ, памеры замоўцы, м^2	$350
ДГ 21-7/ДГ 21-13	$39+
ДО 21-8/ДО 21-10	$31
з ПВХ, памеры замоўцы, м^2	$260
фанэраваныя ДГ 21-7/ДГ 21-10	$97
ДО 21-8/ДО 21-13	$114
Дзьвярное палатно філёнкавае, глухое, м^2	500,6
Дзьверы гаўбцовыя, м^2	552,3
ДГ 21-13 падвойныя	$66
ДГ 21-9 падвойныя	$82
з аднаго боку філёнкавыя, з другога – нашыўныя, м^2	917,5
філёнкавыя глухія да 10 шт., м^2	517,3
да 5 шт., м^2	573,4
філёнкавыя зашклёныя да 10 шт., м^2	528,4
Перагародкі ўнутраныя, алюмінь, шкло, замова, м^2	110$
з ПВХ, памеры замоўцы, м^2	$120
Палатно дзьвярное, м^2	800+

ЖЭС. Рамонт жытла

Заявы на рамонтна-будаўнічыя працы прымаюцца жыльлёва-эксплюатацыйнымі службамі (ЖЭС) ад насельніцтва ў пісьмовай ці вуснай форме, а таксама праз тэлефон. Аб'ём працы вызначаецца прадстаўнікамі рамонтнай арганізацыі пры ўдзеле замоўцы на кватэры апошняга. Кошт рамонтна-будаўнічых працаў вызначаецца на падставе аб'ёму працы паводле прэйскуранту N Б 66-03.

Тэрміны рамонту вызначаюцца прадстаўніком рамонтнай арганізацыі з узгадненьнем з замоўцам. Паміж замоўцам і рамонтнай арганізацыяй складаецца ў двух асобніках дамова, зь якіх адзін асобнік даецца замоўцу, а другі застаецца рамонтнай арганізацыі. За пяць дзён да пачатку рамонту замоўца ўносіць у ашчадную касу на рахунак рамонтнай арганізацыі адпаведную суму за рамонт, вызначаную дамовай.

Разьлік з замоўцам за зробленыя паслугі робіцца з выпіскай квітанцыі непасрэдна на месцы ў кватэры ці ў прыёмным пункце.

Рамонтная арганізацыя ажыцьцяўляе рамонтна-будаўнічыя працы са сваіх матэрыялаў ці з матар'ялаў замоўцы і адказвае перад замоўцам за якасьць працы і захаваньне вызначаных тэрмінаў рамонту.

Рамонт жыльлёвае плошчы й месцаў агульнага карыстаньня, якія вызваляюцца ў зьвязку з капітальным рамонтам, рэканструкцыяй будынкаў, зносам праз аварыйны стан, зьменаю прызначэньня, за кошт сродкаў кватэраздымальніка не робіцца.

Пры атрыманьні другое кватэры і вызваленьні ранейшай рамонт вызваленай жыльлёвае плошчы (кватэры) робіцца ў месячны тэрмін з дня яе вызваленьня за кошт кватэранаймальніка. Замоўца абавязаны да пазначанага ў дамове тэрміну падрыхтаваць аб'ект да рамонту, вызваліўшы кватэру (дом) ад рэчаў і мэблі.

Калі зь не залежных ад замоўцы прычынаў праца ня можа распачацца ў вызначаны ў дамове тэрмін, замоўца абавязаны папярэ-дзіць рамонтную арганізацыю за тры дні да пачатку працы.

Пры ўзьнікненьні неабходнасьці ў дадатковай працы, не прадугледжанай дамовай, і выкананьні яе рамонтная арганізацыя разам з замоўцам складаюць дадатковую дамову. Замоўца абавязаны аплаціць дадатковую працу. Рамонтная арганізацыя матар'яльна адказная за псаваньне маёмасьці замоўцы, абсталяваньня кватэраў і дамоў праз неахайныя адносіны рабочых пры рамонце — у памеры фактычнае шкоды.

Рамонтная арганізацыя ў дзень заканчэньня працы абавязаная за свой кошт прыбраць інвэнтар, рэшткі матар'ялаў, а таксама будаўнічае сьмецьце, якое ўтварылася ў працэсе рамонту. Выкананая на дамову праца прымаецца замоўцам з удзелам прадстаўніка рамонтнай арганізацыі. Пры выяўленьні недаробак і дэфэктаў прыёмка перапыняецца да канчатковага іх выпраўленьня. Перарабка праз нізкую якасьць працы робіцца за кошт рамонтнай арганізацыі.

За непадрыхтаванасьць кватэры (дому) да пачатку рамонту ў тэрміны, абумоўленыя дамовай, замоўца выплочвае фактычныя выдаткі за прастой рабочых, з разьлікам аднаго працоўнага дня. Акрамя рамонтна-будаўнічых працаў жыльлёва-эксплюатацыйныя службы раёнаў (ЖЭС) выконваюць:

замену сантэхабсталяваньня;

замену водаразборнай арматуры;

усталяваньне унутраных замкоў;

шкленьне вокнаў;

шкленьне дзьвярэй аздобным шклом;

замену й рамонт электраарматуры;

уцяпленьне вокнаў;

навеску кухняў;

падключэньне бытавой тэхнікі да сыстэмаў водазабесьпячэньня, каналізацыі, электразабесьпячэньня;

прачыстку ўнутрыкватэрнай сыстэмы каналізацыі, засьмечанай наймальнікам, іншыя працы.

Афармленьне дамовы на рамонт жытла і іншых будынкаў і вызначэньня коштаў працы ажыцьцяўляецца без дадатковае платы ў рамонтнай арганізацыі ў адпаведнасьці з поўным пералікам працаў, складзеным на кватэры замоўцы. Пры афармленьні дамовы бярэцца аванс, які залічваецца пры канчатковым разьліку за выкананы аб'ём працы. У выпадку адмовы замоўцы ад выкананьня рамонтна-будаўнічых працаў пасьля вызначэньня аб'ёму і кошту працаў сума авансу замоўцу не вяртаецца.

Усе канфлікты, якія ўзьнікаюць паміж рамонтнай арганізацыяй і замоўцам, пры немагчымасьці вырашэньня іх на месцы, а ў неабходных выпадках і пры ўдзеле работнікаў жыльлёвых рамонтна-эксплюатацыйных арганізацыяў (ЖРЭА) ці ўправы жыльлёвае гаспадаркі (УЖГ), канчаткова вырашаюцца ў судовым парадку.

У кожнай жыльлёва-эксплюатацыйнай службе пры дыспэтчарскіх і аб'яднаных дыспэтчарскіх службах, а таксама пры вытворчым аддзеле аб'яднаньняў створаныя пункты прыёму замоваў на зьдзяйсьненьне бытавых паслугаў насельніцтву. Пры гэтым пункты прыёму замоваў маюць наваочную інфармацыю й неабходную дакумэнтацыю, у тым ліку: пералік паслугаў, якія ажыцьцяўляюць насельніцтву ЖЭСы й ЖРЭА; узоры прапанаваных вырабаў і матар'ялаў; каштарыс асноўных відаў паслугаў; каштарыс Б 66-03 на рамонтна-будаўнічыя працы на замовы насельніцтва. Ахвочыя зрабіць рамонтна-будаўнічыя працы з дапамогай рамонтных арганізацыяў могуць зьвяртацца ў прыёмныя пункты пры месцы жыхарства.

Падрыхтаваў Я.Козік

Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы

Назва арганізацыі	Адрас	Нумар тэлефону	Час працы
	Заводзкі раён		
ЖРЭА	Бехцерава, 5	243-32-61	9.00-18.00
ЖЭС N			
18	Партызанскі пр., 36	245-32-83	
21	Народная, 33	245-15-78	
28	Ташкенцкая, 16/4	241-45-84	
32	Гападзеда, 39/2	241-13-48	
39	Гападзеда, 7	241-39-11	
40	Народная, 8	245-02-42	
56	Ангарская, 18/1	243-35-57	
74	Герасіменкі, 1	246-87-61	
75	Ташкенцкі праезд, 6/1	240-96-89	
87	Алтайская, 64/1	243-74-16	
91	Герасіменкі, 26	243-76-23	
95	Ілімская, 29	242-92-67	
	Ленінскі раён		
ЖРЭА	Палявая, 24	221-58-04	8.45-18.00
ЖЭС N			
2	Рыбалкі, 3а	229-08-03	8.45-21.00
4	Энгельса, 32а	227-52-30	
9	Барадзінская, 17/2	221-40-01	
41	пр. Ракасоўскага, 113	248-96-93	
45	Пляханава, 97/2	238-42-24	
51	Пляханава, 42	247-26-80	
58	пр. Ракасоўскага, 132	247-42-40	
64	Пляханава, 73	248-96-93	
67	Сьвярдлова, 19	221-21-61	
76	Пляханава, 42	247-26-80	
80	Пляханава, 68/4	247-31-89	
82	пр. Ракасоўскага, 48	248-37-30	
ПРБУ	Надзеждзінская, 58	221-17-00	8.30-17.30
	Маскоўскі раён		
ЖРЭА	Гурскага, 26	271-79-80	
ЖЭС N			
11	Грушаўская, 131	25-44-96	8.00-21.00
14	2-і зав. Р.Люксэмбург, 4/2	220-25-53	
15	Караля, 47	220-24-82	
31	Волаха, 53а	256-48-11	
70	пр. газ. "Правда", 20	272-51-08	
73	пр. газ. "Правда", 40	271-68-61	
84	пр. газ. "Известия", 18	272-68-93	
90	Алібегава, 27	271-31-00	
98	Ясеніна, 6/2	271-35-19	
99	пр. газ."Известия", 61	271-79-80	
ПРБУ	Гурскага, 26	52-88-09	8.30-17.45
	Кастрычніцкі раён		
ЖЭС N			
24	Каржанеўскага, 8/2	278-53-31	8.00-21.00
55	Каржанеўскага, 25,	278-15-19	
50	Ляўкова, 8/2	225-33-57	
63	Кіжаватава, 66	278-67-26	
69	Асаналіева, 26	278-03-12	
79, 92	Чкалава, 12,	225-85-61	
ПРБУ	Магілёўская, 2/2	229-53-22	9.00-18.00
	Партызанскі раён		
ЖРЭА	Шчарбакова, 34	236-55-37	9.00-18.00
ЖЭС N			
3	Іванаўская, 38	236-55-37	8.00-21.00
12	пр. Скарыны, 38	233-17-09	
23	Уральская, 9	230-85-13	
26	Партызанскі пр., 20	249-82-06	
44	Даўгабродзкая, 10	230-24-08	
ПРБУ	зав. Казлова, 8	244-25-50	9.00-18.00
	Першамайскі раён		
ЖРЭА	Славінскага, 45	263-17-55	9.00-18.00
ЖЭС N			
6	К.Чорнага, 7	232-23-43	
19	Кедышкі, 12	263-45-46	
22	Сядых, 24а	265-52-29	
29	Славінскага, 45	264-85-89	
33	Наўгародзкая, 7	266-04-03	
35	Каліноўскага, 55	265-12-33	
36	Каліноўскага, 56	264-00-13	
52	пр. Скарыны, 133	264-70-57	
61	Цікоцкага, 34, корп. 2	263-75-51	
71	Чарнышэўскага, 4	231-73-30	
96	Нікіфарава, 12	260-80-59	
ПРБУ	Валгаградзкая, 18	266-85-39	
	Савецкі раён		
ЖРЭА	пр-т Скарыны, 46	232-57-32	9.00-18.00
ЖЭС N			
5	зав. Горны, 6	239-62-22	8.00-21.00
7	зав. Я.Коласа, 11	232-21-44	
8	Кальцова, 10	262-41-32	
25	Я.Коласа, 8	232-61-33	
42	Кульман, 13	231-79-93	
49	Сурганава, 49	232-66-33	
59	Мележа, 4	262-50-67	
65	Я.Коласа, 53, корп. 2	232-85-77	
68	Мірашнічэнкі, 51	261-25-51	
72	Варвашэні, 8	233-39-21	
77	Гамарніка, 14	261-24-74	
85	Бяды, 11, корп.1	231-03-25	
ПРБУ	Тапаграфічная, 5	265-42-30	9.00-18.00
	Фрунзэнскі раён		
ЖРЭА N1	Гусоўскага, 61	254-40-06	9.00-18.00
ЖЭС N			
16	пр. Пушкіна, 28	251-22-21	8.00-21.00
30	Скрыганава, 3	254-40-06	
47	Адоеўскага, 81	252-22-83	
48	Я.Маўра, 42	252-94-56	
54	Дуніна-Марцінкевіча, 6	251-15-44	
81	Цімашэнкі, 20, корп. 1	258-96-87	
83	Бурдэйнага, 23	258-22-00	
86	Адзінцова, 47	258-73-59	
94	Адзінцова, 77, корп. 1	258-73-59	
ЖРЭА N2	Матусевіча, 42	255-32-13	9.00-18.00
ЖЭС N			
17	Прытыцкага, 10	254-43-71	
37	Прытыцкага, 46	253-47-13	
43	Альшэўскага, 57	255-32-13	
53	Жудро, 67а	255-57-06	
57	Прытыцкага, 46	253-67-14	
60	Прытыцкага, 38	253-47-13	
62	Заслаўская, 23, корп. 2	223-25-96	
66	П.Глебкі, 118	253-10-02	
89	пр. Машэрава, 47	223-54-09	
97	пр. Машэрава, 83	250-61-02	
ПРБУ	Матусевіча, 42	253-08-95	
	Цэнтральны раён		
ЖРЭА	Камсамольская, 20а	227-69-55	9.00-18.00
ЖЭС N			
1	Няміга, 8	227-69-55	8.00-21.00
13	Нававіленская, 10	237-86-22	
20	Асіпенкі, 37	237-16-94	
27	Арлоўская, 24	237-26-80	
34	пр. Скарыны, 27а	226-04-81	
38	Старажоўская, 8	234-53-64	
ПРБУ	Гандлёвая, 25	222-35-72	8.30-17.30
	Замкавая, 29	223-87-13	
	В.Харужай, 46, корп. 2	237-07-72	

ПРА НОВЫЯ ДАЛЯРЫ

Фэдэральная рэзэрвовая сыстэма ЗША распаўсюдзіла паведамленьне пра тое, што з 1996 году ва ўжытак будуць выпушчаны новыя віды купюраў. Першымі будуць выпушчаны банкноты вартасьцю 100 даляраў. Зьвяртаем Вашу ўвагу на тое, што адначасова з новымі купюрамі будуць хадзіць даляры старога ўзору.

У 1996 годзе Злучаныя Штаты Амэрыкі распачнуць увядзеньне грашовых знакаў з новымі сродкамі больш высокай абароны. Гэтыя сродкі дазволяць, наколькі магчыма, адмежаваць валюту ЗША ад падробак, якія вырабляюць з дапамогай дасканалае тэхнікі.

Старыя грашовыя знакі ЗША не падпадаюць пад зьняцьце і дэвальвацыю. Пры паступленьні ў Фэдэральную рэзэрвовую сыстэму яны будуць замяняцца на банкноты новага ўзору. Усе старыя і новыя грашовыя знакі ЗША захоўваюць свой поўны кошт.

Абазначэньні Фэдэральнай рэзэрвовай сыстэмы

Уся Фэдэральная рэзэрвовая сыстэма прэзэнтаваная новым унівэрсальным друкам. Літара й нумар пад левым сэрыйным нумарам паказваюць на фэдэральны рэзэрвовы банк, які выпусьціў банкноту.

Мікрадрук

Надрукаваныя асабліва дробным шрыфтам словы цяжка падрабіць. Угары банкноты надпіс "USA 100" не выходзіць за межы нумару, які зьмешчаны ў левым кутку, а словы "United States of Amerika" нанесены на сурдут Бэнджаміна Франкліна.

Абаронная палоска

Палімэрная палоска праходзіць унутры папяровае роўнасьці ў вэртыкальным кірунку і сваім унікальным разьмешчаньнем паказвае намінал банкноты. Надпіс "USA 100", які маецца быць на палосцы, праглядаецца на сьвятле з абодвух бакоў грашовага знаку. Акрамя таго, пры апрацоўцы ультрафіялетавым выпраменьваньнем палоска высьвятляецца чырвоным.

Партрэт

Павялічаны партрэт Бэнджаміна Франкліна лягчэй пазнаць, а вось падрабіць новыя дэталі партрэту досыць складана. Цяпер ён крыху зрушаны ўбок ад цэнтру банкноты, у выніку чаго зьяўляецца месца для разьмяшчэньня вадзяных знакаў, а сам партрэт меней падпадае пад знос.

Вадзяныя знакі

Калі зьмясьціць банкноту супраць сьвятла, добра відаць вадзяныя знакі, якія ўяўляюць сабой выяву Бэнджаміна Франкліна.

Тонкія канцэнтрычныя лініі

Гэтыя лініі, нанесеныя друкаваным чынам у якасьці тла партрэту Бэнджаміна Франкліна і выяўленьня Залі незалежнасьці, цяжка будзе падрабіць.

"Вясёлкавая" друкарская фарба

Калі глядзець на банкноту пад простым вуглом, нумар у ніжняй правай частцы яе верхняга боку мае зялёны колер. Калі зірнуць на банкноту пад касым вуглом, колер нумару зьмяняецца на чорны.

Нумары сэрыяў

Да нумару сэрыі дадаецца дадатковая літара. Унікальная камбінацыя адзінаццаці лічбаў і літараў двойчы зьяўляецца ўгары банкноты.

ШТРЫХАВЫ КОД — ЯК ЯГО РАСШЫФРАВАЦЬ

У апошні час на прылаўках крамаў, асабліва камэрцыйных, усё часьцей зьяўляюцца імпартовыя тавары, найперш ласункі, кандытарскія вырабы, напоі, на пакунку якіх нанесены нейкія лічбы, чорныя і белыя вэртыкальныя палосы. Гэта так званы штрыхавы код, з дапамогай якога зашыфравана інфармацыя пра некаторыя найбольш істотныя парамэтры вырабаў. Але калі сам код ужо не выклікае зьдзіўленьня ў спакушаных пакупнікоў, то ягоная расшыфроўка ўяўляецца таямніцаю за сямю пячаткамі. А між тым аніякае таямніцы тут няма. Паспрабуем у гэтым разабрацца.

Трошкі гісторыі

Нягледзячы на тое, што першая згадка пра штрыхавы код ідзе з 30-х гадоў – у Гарвардзкай школе бізнэсу была абаронена адпаведная дысэртацыя, – а хутка пасьля канца Другой сусьветнай вайны атрыманы патэнт на штрыхавыя коды, упершыню на практыцы іх скарысталі чыгуначнікі ЗША толькі ў 60-я гады, калі ў чарговы раз ажыцьцяўлялі ідэнтыфікацыю чыгуначных вагонаў.

З разьвіцьцём мікрапрацэсарнай тэхнікі рэч з кодамі пайшла значна хутчэй. І ўжо ў 1973 г. ЗША прынялі Ўнівэрсальны таварны код – UPC, прыдатны для карыстаньня як у прамысловасьці, гэтак і ў гандлі. Ня надта адстала ад Амэрыкі Эўропа: у 1977 г. спачатку на эўрапейскім кантынэнце, а потым і на іншых усталявалася Эўрапейская сыстэма кадаваньня – EAN.

Цяпер у сьвеце існуюць і іншыя коды, напрыклад, "2 з 5", "93", "Codabar", "Code 11", але яны не атрымалі такога шырокага распаўсюджаньня, як першыя два. Сёньня гэтымі двума кадуюцца да 90% усіх выпусканых тавараў у ЗША, 80% – у Нямеччыне, каля 70% – у Францыі, амаль 45% – у Швэцыі і г. д.

Што стаіць за лічбамі

Дык што ж такое штрыхавы код спажывецкага тавару? Згодна з той ці іншай сыстэмай, кожнаму віду вырабаў прыўлашчваецца свой нумар, які складаецца найчасьцей з 13 лічбаў (EAN-13). Возьмем, напрыклад, лічбавы код: 5449000000996. Першыя дзьве лічбы (54) хаваюць за сабою краіну паходжаньня (вытворцы ці прадаўца) прадукту ("сьцяг" краіны), наступныя пяць (49000) – прадпрыемства-вытворцу, яшчэ пяць (00099) – назву тавару, яго спажывецкія якасьці, памеры, масу, колер. Апошняя лічба (6) – кантрольная, выкарыстоўваецца для праверкі слушнасьці прачытаньня штрыхоў сканэрам.

Магчымы таксама варыянт, калі для коду краіны-вытворцы адводзіцца тры знакі, а для коду прадпрыемства – чатыры. Невялікія памерам тавары могуць мець кароткі код, які складаецца з васьмі лічбаў – EAN-8. Звычайна код краіны надаецца Міжнароднай асацыяцыяй EAN. Вось некаторыя зь іх:

ЗША і Канада – 00, 01, 03, 04, 06
Францыя – 30-37
Нямеччына – 40-43
Японія – 49
Вялікабрытанія – 50
Паўночная Ірляндыя – 50
Грэцыя – 52(0)
Кіпар – 52(9)
Бэльгія і Люксэмбург – 54
Партугалія – 56(0)
Ісьляндыя – 56(9)
Данія – 57
Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка – 60(0), 60(1)
Фінляндыя – 64
Нарвэгія – 70
Ізраіль – 72(9)
Швэцыя – 73
Швэйцарыя – 76
Італія – 80-83
Гішпанія – 84
Чэхія і Славаччына – 85(9)
Югаславія – 86(9)
Турэччына – 86(9)
Нідэрлянды – 87
Аўстрыя – 90-91
Аўстралія – 93.

Што да былога СССР, дык у 1987 г. Асацыяцыя EAN замацавала за тагачасным Саюзам дзесяць трохзнакавых кодаў (прэфіксаў) – ад 460 да 469. Значыцца, калі Вам сустрэнецца, напрыклад, тавар, які мае код 460 0364 051722, то перад Вамі пляшка беларускага піва ёмістасьцю 0,5 л менскай "Крыніцы" Менавіта якаснае піва, а не фальшыўка. Менавіта "Крыніцы", а не Лідзкага піўзаводу.

Зразумела, шараговы пакупнік, ня ўзброены спэцыяльным даведнікам, ня ў стане паводле адаго коду вызначыць вытворцу тавару. Урэшце, у гэтым няма аніякае неабходнасьці. Галоўнае – ведаць краіну паходжаньня, ведаць, што тавар не фальсыфікаваны.

Для чаго патрэбна кадаваньне?

Звычайна спэцыялісты называюць некалькі прычынаў ягонага зьяўленьня, мы ж пакажам адну, асноўную – з дапамогаю кодаў кантралюецца якасьць (!) прадукцыі, ейная адпаведнасьць пачатковаму зададзенаму ўзору.

Вядома, што ўрады шмат якіх дзяржаваў усяляк заахвочваюць выпуск сваімі фірмамі канкурэнцыйных тавараў, бо ад іхнае якасьці ў пэўнай ступені залежыць прэстыж краіны на міжнароднай арэне. Звычайна заахвочваньне выяўляецца ў прысуджэньні "найлепшай з найлепшых" фірмаў спэцыяльнай узнагароды. Яе ўвасабленьнем служаць асабовыя знакі адрозьненьня.

Так, у Вялікабрытаніі гэта Каралеўская ўзнагарода за экспартныя дасягненьні (сярод ляўрэатаў – кампанія "Crosslee", якая выпускае пральныя машыны, у Даніі – Прэмія караля Фрэдэрыка IX за выдатныя заслугі ў экспарце (ёю, у прыватнасьці, узнагароджана фірма "Vestfrost", якая вырабляе лядоўні і маразільні, у ЗША – Прэзыдэнцкія "E" і "E-Star" узнагароды за выдатныя посьпехі ў экспарце.

KING FREDERIK IX's AWARD FOR EXCELLENCE IN EXPORT

The Queens Award For Export Achievement 1990

Да таго ж наяўнасьць лацінскае літары "E" (пачатковая літара ў слове "export") у адзнаках ужо сьведчыць аб прыналежнасьці маркаванага тавару да "кляну выбраных".

Recipient of the President's "E" Award for Excellence in Export Service

Бясьпека тавараў

У апошнія гады пераважная большасьць жыхароў краінаў-сяброў Эўрапейскай Эканамічнай Супольнасьці (ЭЭС), расьпешчаная асартымэнтам прадукцыі, больш за ўсё стала цікавіцца бясьпекаю спажывецкіх тавараў. Ідучы насустрач пажаданьням спажыўцоў, Супольнасьць прыняла знак "CE", які сымбалізуе адпаведнасьць эўрапейскіх вырабаў нормам ЭЭС, у тым ліку патрабаваньням бясьпекі, якія ўсталяваныя для краінаў-сяброў Эўрапейскай Супольнасьці.

Яшчэ далей пайшла Нямеччына, якая ўвяла знакі "Праверана на бясьпеку" і "Даследаваны на прыдатнасьць для вырабу харчовых прадуктаў".

TÜV PRODUCT SERVICE GS

Бадай, менавіта ў Нямеччыне найболей надаюць значэньне якасьці тавараў. Прынамсі, пра гэта сьведчаць розныя "знакі якасьці", што ставяцца на прадукцыю або самім вытворцам або спэцыялізаванымі арганізацыямі. Зразумела, пасьля ўсебаковых грунтоўных досьледаў. Прыкладам можа служыць наклейка "CMA", якая сьцьвярджае "якасьць фірмовага тавару зь нямецкіх земляў", якую можна ўбачыць на шматлікіх прадуктах.

Праўда пра цыгарэты

У ЗША дзейнічае закон, адпаведна зь якім забаронены продаж на тэрыторыі штатаў тавараў, якія могуць уяўляць сабой небясьпеку для здароўя нацыі, але ў адпаведнасьці з тым жа законам гэтыя тавары не забараняецца вывозіць па-за межы ЗША. Інакш кажучы, на адзін і той жа выраб часам дзейнічае два стандарты: адзін – для сябе, другі – для суседа.

Да прыкладу, на пакунку папулярных у Беларусі амэрыканскіх цыгарэтаў "CAMEL", "KENT", "MARLBORO", "WINSTON" зьмешчаны сьціплы надпіс: "For use outside U.S.", што значыць "Павінна прадавацца па-за межамі ЗША". Рэч у тым, што выробляюцца гэтыя цыгарэты з тытуню нізкай якасьці (хай сабе і вірджынскага), які ўтрымлівае значную колькасьць смолаў і нікатыну. Падобнае заканадаўства існуе і ў іншых краінах, напрыклад у Аўстрыі. Ва ўсім цывілізаваным сьвеце забаронены продаж цыгарэтаў, якія ўтрымліваюць смолы – асноўную прычыну раку лёгкіх – больш чым за 20 мг на цыгарэту. А таму як цыгарэты зь вялікім утрыманьнем смолаў там усё ж такі выпускаюць, то каштуюць яны ў 3-4 разы таньней за "чыстыя" цыгарэты. І менавіта таму такі тавар ахвотна скупляецца і перапрадаецца нашымі камэрсантамі. А бальшыня народу, даведаўшыся пра тое, што, напрыклад, тое ж "MARLBORO" каштуе у Нямеччыне пад 4 DM, наіўна думае, што там гэта вынік жорсткае падатковае палітыкі.

А цяпер інфармацыя для тых, хто аддае перавагу айчынным гатункам цыгарэтаў. Дагэтуль на тэрыторыі Беларусі дзейнічаюць максымальна дапушчальныя ўзроўні (МДУ) утрыманьня ў тытунёвых вырабах шкодных рэчываў, якія былі зацьверджаныя яшчэ Міністэрствам аховы здароўя СССР: смолы – да 25 мг, нікатын – да 1,3 мг у адной цыгарэце.

Лічбы гэтыя, на жаль, нідзе не афішуюцца. А між тым "Минздрав предупреждает..." наўрад ці кагосьці спыніць. У гэтым сэнсе больш шчыра робяць нашыя суседзі палякі. Так, на польскіх цыгарэтах "Cowboy" пазначаная іх "карыснасьць" для арганізму чалавека: утрыманьне смолаў – 18 мг, нікатыну – 1,5 мг. Так, прынамсі, бачна, што спажывае палёнца разам з дымам. Лягчэй яму ад таго, вядома, ня стане, але дазаваньне прымушае думаць...

Паводле зьвестак Сусьветнай Арганізацыі Аховы здароўя, за апошнія два-тры гады лічба палёнцаў мужчынаў у ЗША скарацілася недзе на 40%, жанчынаў – на 30%. Мабыць, таму амэрыканскія тытунёвыя кампаніі з такой настойлівасьцю прарываюцца на рынак краінаў СНД, арганізаваўшы за апошнія 2-3 гады, у прыватнасьці на тэлебачаньні, рэклямную нікатынавую кампанію, якая ня мела аналягаў. Тады як у саміх ЗША рэкляма тытуню ў нацыянальнай тэлевізіі забаронена.

Адзінае, што суцяшае ў гэтай сытуацыі, дык гэта тое, што, па-першае, стаў больш жорсткім кантроль за якасьцю імпартовых тавараў (разам зь іншай прадукцыяй патрабуецца падцьверджаньне бясьпекі тытунёвых вырабаў), па-другое, зноў-такі ў жорсткі бок пераглядаюцца сёньня максымальна дапушчальныя ўзроўні ўтрыманьня шкодных рэчываў у айчынных цыгарэтах. Пытаньне, праўда, у тым, калі новыя нормы дойдуць да гандляроў цыгарэтамі.

А пакуль мы прэзэнтуем Вам інфармацыю, пра прадаваныя ў нашых шапіках цыгарэты з клясыфікацыяй на ўтрыманьне ў іх смолаў і нікатыну (у мг на цыгарэту):

		Смала/нікатын
Ангельшчына		
	BURUS & SONS	21,5/1,2
	ROTHMANS	20,2/1,1
	SOVEREING	14,2/1,0
	STATE LINE	19,5/1,1
Баўгарыя		
	АПАЛ	19,4/1,2
	РАДОПІ	20,4/1,0
	СТУАРДЭСА	19,8/1,3
	ТУ-134	23,5/1,0
Беларусь		
	АСТРА	26,5/1,4
	КОСМАС	24,5/1,0
	ПРЫМА	25,4/1,1
Бразылія		
	APOLLO SOUYZ	17,8/1,2
Нямеччына		
	DAVIDOFF	15,1/1,1
	WEST	20,1/1,2
Кітай		
	ХРЫЗАНТЭМА	26,8/1,4
	GRAPE	28,2/1,2
Расея		
	ДЫМОК	21,5/1,0
	ВЕЧАРОВЫЯ	19,5/1,4
	ПЭГАС	25,2/1,3
	ЯВА	19,0/0,7
ЗША		
	AMERICAN FULL FLAVOR 100's	21,7/1,8
	ASTOR	17,0/0,9
	B.O.Y.	26,2/1,4
	CAMEL	19,2/1,0
	KENT	20,2/1,0
	L&M	16,8/1,0
	MAGNA	22,9/1,4
	MARLBORO	19,5/1,4
	MONTANA	17,0/1,1
	MONTE CARLO	17,1/1,0
	MORE	17,8/1,0
	SALEM	17,8/1,0
	WEST	17,8/1,2
	WINSTON	19,0/1,2
Украіна		
	ВАТРА	25,7/1,0
	КОСМАС (RJR-Кіеў)	17,6/0,9
	GOLD DOLLAR (BAT-Прылукі)	18,5/1,2

А цяпер параўнаем: паводле экспэртызы Міжнароднага агенцтва вывучэньня раку (Ліён, Францыя) варта лічыць утрыманьне смолаў у цыгарэце:

- менш за 4,9 мг/цыг. як вельмі нізкае;
- ад 5 да 9,9 мг/цыг. як нізкае;
- ад 10 да 14,9 мг/цыг. як сярэдняе;
- ад 15 да 19,9 мг/цыг. як высокае;
- 20 і вышэй мг/цыг. як вельмі высокае.

Маючы на ўвазе, што ўтрыманьне ў тытунёвым дыме смолаў зьвязана са сьмяротнасьцю ад раку лёгкіх, у некаторых краінах цыгарэты з выхадам смалы больш за 20 мг/цыг. прадаваць забаронена. У прыватнасьці, у Ангельшчыне і ЗША гэты паказьнік не павінен перавышаць 12 мг/цыг. Нарматыў на смолы ў былым СССР складаў 25 мг/цыг. Карацей, рабіце высновы.

ТЭАТРЫ 29 КРАСАВІКА - 5 ТРАЎНЯ

ТЭАТРЫ, КАНЦЭРТЫ

Травень

ОПЭРНЫ ТЭАТАР

тэл. 34-11-56 (галоўны адміністратар), 34-10-41 (каса)

Вясельле Фігара

2 чацьвер В.А.Моцарт. Опэра ў 4-х дзеях

Лебядзінае возера

4 субота П.Чайкоўскі. Балет у 4-х дзеях

Пітэр Пэн

5 нядзеля, раніца А.Будзько. Мюзыкал у 2-х дзеях

Царская нявеста

5 нядзеля, вечар М.Рымскі-Корсакаў. Опэра ў 4-х дзеях

БАЛЕТ

тэл. 34-06-66 (каса), 34-11-42, 34-80-74

Кругаверць

29 серада А.Залётнеў (прэм'ера) (народны трылер). Балет у адной дзеі, 11 сюжэтах

Балеро

М.Равэль. Балет у адной дзеі

Сэрэнада

П.Чайкоўскі. Балет у адной дзеі

Кармэн

30 чацьвер Ж.Бізэ. Опэра ў 4-х дзеях

Страсьці (Рагнеда)

3 пятніца, 31 пятніца А.Мдзівані. Балет у 2-х дзеях

ТЭАТАР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Ідылія

29 серада В.Дунін-Марцінкевіч. Пастараль у 2-х дзеях

Тапалевая завея

30 чацьвер М.Задорнаў. Камэдыя ў 2-х частках

Азірніся ў гневе

2 чацьвер Дж.Озбарн. Драма ў 2-х дзеях

Нежанаты мнагажэнец, або залёты пана дэ Пурсаньяка

3 пятніца Ж.-Б.Мальер. Камэдыя ў 2-х дзеях

Памінальная малітва

4 субота Р.Горын. Камэдыя ў 2-х частках на матывы твораў Шолам-Алейхема

Ажаніцца - не журыцца

5 нядзеля Далецкія, М.Чарот. Беларускі вадэвіль ў 2-х частках

Ранішнія спэктаклі:

Ажаніцца - не журыцца

5 нядзеля Далецкія, М.Чарот. Беларускі вадэвіль ў 2-х частках

ДЗЯРЖАЎНЫ РАСЕЙСКІ ТЭАТАР

Букееў і кампанія

3 пятніца М.Горкі. Драма каханьня ў 2-х частках

Вольны шлюб

4 субота Д.Фо, Ф.Рамо.

Адзіны спадкаемца

5 нядзеля Ж.-Ф.Рэньяр. Камэдыя ў 2-х частках

ТЭАТАР-СТУДЫЯ КІНААКТОРА

Любы ты мой

30 чацьвер М.Варфаламееў.

Карнавал у Вэнэцыі

3 пятніца, 4 субота А.Галін.

"ВОЛЬНАЯ СЦЭНА"

тэл. 34-60-08

Брат мой Сымон

2 чацьвер У.Рудаў. Драматычныя сны

Рычард

3 пятніца У.Шэкспір. Трагедыя

Паваліўся неба

4 субота У.Галубок, Л.Родзевіч. Фольк-жарт

КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛЯ ФІЛЯРМОНІІ

пр. Ф.Скарыны, 50

30 — "Minsk orchestra". Мастацкі кіраўнік — В.Кайтэль (Нямеччына). Дырыжор — А.Шумскі (Нямеччына). Саліст — К.Рандалу (фартэпіяна). У праграме: Л. ван Бэтховэн — Канцэрты для фартэпіяна з аркестрам № 1, 3, 5.

1-2 — 19.00 — прэм'ера — У.Мулявін, ансамбаль "Песьняры" ў новай праграме "Вольнасьць".

3 — Музыка расейскай душы. Вечарына старадаўняга рамансу. Л.Сьляпнёва (сапрана), У.Дзіц (бас). У канцэрце бярэ ўдзел К.Мяржэнікаў (альт). Партыя фартэпіяна — А.Бісераў.

4 — Дзяржаўны камэрны аркестар Рэспублікі Беларусі. Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — Ё.Э.Райль (Нямеччына). Дырыжор — П.Вандзілоўскі. Выканаўцы — навучэнцы Рэспубліканскага ліцэю пры Беларускай акадэміі музыкі. Музыказнаўца — А.Парэцкі. У праграме: Ё.С.Бах, Ё.Гайдн. Фундатар аркестру — кампанія "Тусон".

5 — Дзяржаўны акадэмічны сымфанічны аркестар Рэспублікі Беларусі. Дырыжор — В.Собалеў. Выканаўцы — студэнты і асыстэнты-стажоры Беларускай акадэміі музыкі. Музыказнаўца — А.Парэцкі. У праграме: Я.Сыбэліюс, арыі з опэраў П.Чайкоўскага, Ш.Гуно, Дж.Вэрдзі, К.Сэн-Санса, Дж.Пучыні, Ж.Маснэ, Ф.Чылеа, П.Масканы, Ж.Бізэ, А.Рубінштэйна.

ЗАЛЯ КАМЭРНАЙ МУЗЫКІ

29 — дабрачынны канцэрт "Чарнобыльскі шлях". Творчы вечар І.Лучанка і І.Краснадубскага. У канцэрце бяруць удзел Ж.Габа (фартэпіяна), Т.Шумакова (цымбалы), С.Лучанок (фартэпіяна), К.Шараў (арган), А.Краснадубскі (барытон), З.Бандарэнка. Музыказнаўца — І.Зубрыч.

30 — Канцэрт вакальнае музыкі. І.Бабій (тэнар). Партыя фартэпіяна — М.Сярдобаў. У канцэрце бярэ ўдзел А.Ганевіч (сапрана). У праграме: Чайкоўскі, Рахманінаў, Пергалезі, Шубэрт, Гендэль, Вэрдзі, Лучанок, Сакалоўскі.

2 — струнны квартэт у складзе І.Алікаева (скрыпка), І.Глібка (скрыпка), І.Панчанка (альт), А.Яркові (віялянчэля). У канцэрце бярэ ўдзел Л.Балыка (флейта). У праграме: Ё.Гайдн, В.А.Моцарт, Ф.Мэндэльсон.

3 — Канцэрт камэрнай музыкі. Я.Гелер (флейта). У канцэрце бярэ ўдзел Д.Талмачоў (флейта). Партыя фартэпіяна — А.Іваноў. У праграме: Бэтховэн, Моцарт, Мэндэльсон, Шапэн, Дэбюсі, Доплер.

МУЗЭІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МУЗЭЙ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

К.Маркса, 12, тэл. 27-43-22. Час наведваньня з 11.00 да 19.00. Выхадны – серада.

Экспазыцыя **"Старажытная Беларусь"**, тэматычная выстава **"Побыт гараджанаў"** (канец XIX — пач. XX ст.), **"Сьвятло таямнічай сымболікі"**, **"З гісторыі зброі"**. Кошты: уваходны вучнёўскі 2000 руб., на экскурсію 10.000; уваходны дарослы 5000 руб., на экскурсію 15.000.

ДЗЯРЖАЎНЫ МАСТАЦКІ МУЗЭЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Леніна, 20, тэл. 27-71-63. Час наведваньня з 11.00 да 19.00. Выхадны – аўторак.

Экспазыцыя **"Беларускае й расейскае мастацтва на працягу стагодзьдзяў"**.

Часовыя выставы:

2.05 **Жывапіс, графіка, кераміка Наталі, Георгія і Кацярыны Паплаўскіх** — 17.00.

8.05 **Кітайскае мастацтва Тхэйхуа (творы з жалеза)** — 16.00.

Да 6.05 **Жывапіс Натана Воранава**.

"И образ милый, незабвенный..." Расейскае мастацтва першай паловы XIX ст. са збораў музэю.

Кошты: вучнёўскі ўваходны — 2000 руб., экскурсія — 20.000 руб.; студэнцкі ўваходны — 3000 руб., экскурсія — 40.000 руб.; дарослы ўваходны — 5000 руб., экскурсія 75.000 руб.; экскурсія для замежнікаў зь перакладам на ангельскую мову — 150.000 руб.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЭЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

пр. Ф.Скарыны, 25, тэл. 27-56-11. Час для наведваньня з 10.00 да 17.00. Выхадны – панядзелак.

Выставы: **"Трафэі вайны"** з сэрыі **"Невядомыя музэйныя калекцыі"**. Кошт уваходу — вучнёўскі 1000 руб., дарослы 5000 руб.

"Нацысцкія злачынцы перад судом беларускага народу" (уваход вольны).

Да 100-х угодкаў К.Крапівы адчынілася выстава **"Слова пра Крапіву"**.

МУЗЭЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

М.Багдановіча, 15, тэл. 34-99-32. Час наведваньня з 10.00 да 17.00. Выхадны – панядзелак.

Стацыянарная выстава **"Покліч"** — літаратурнае разьвіцьцё ў 20-30-я гады.

Выстава **"Любоў мая... Мая Беларусь"**, прысьвечаная жанчыне.

Выстава **"К.Крапіва — вядомы й невядомы"**.

Літаратурны музэй мае філіі: в. Кушляны — "Літаратурны музэй Ф.Багушэвіча", в. Цімкавічы — "Літаратурны музэй К.Чорнага", в. М.Багацькаўка — "Літаратурны музэй М.Гарэцкага", Гарадок — "Гісторыка-літаратурны музэй".

Выстава **"Глыбокія плыні жыцьця"** да 75-годзьдзя з дня нараджэньня Івана Шамякіна.

19 сакавіка адчынілася выстава жывапісу і графікі Натальлі і Сяргея Квачоў (Малыя Горкі).

ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЭЙ М.БАГДАНОВІЧА

М.Багдановіча, 7а, тэл. 34-42-69. Час наведваньня з 10.00 да 17.00. Выхадны – панядзелак.

Экспазыцыя **"Жыцьцёвы й творчы шлях М.Багдановіча"**. Кошт уваходу: вучнёўскі — 500 руб. (экскурсія — 3000 руб.); студэнцкі — 1000 руб. (экскурсія — 5000 руб.); дарослы — 2000 руб. (экскурсія — 10.000 руб.).

Дзейнасьць клюбу беларускай інтэлігенцыі ў 1916-17 гадах XX ст.

Філія "Беларуская хатка" (Рабкораўская, 12, тэл. 20-62-13). Тэатар лялек "Батлейка" працуе на папярэднюю замову.

Філія ў вёсцы Ракуцёўшчына.

ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЭЙ Я.КУПАЛЫ

вул. Я.Купалы, 4, тэл. 27-78-66. Час наведваньня з 10.00 да 17.00. Выхадны – пятніца.

Экспазыцыя **"Жыцьцё й дзейнасьць народнага песьняра Беларусі"**.

Выставы: **Да 50-х угодкаў творчае дзейнасьці Ніла Гілевіча**;

Да 75-годзьдзя народнага пісьменьніка І.Мележа **"Ажываюць успаміны"**;

Выстава **"Нязгасныя зоркі"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЭЙ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ

Вёска Азярцы, недалёка ад Менску (тэл. 34-02-31). Час наведваньня з 9.00 да 17.00. Выхадны – панядзелак.

Прэзэнтаваныя наступныя рэгіёны: Цэнтральная Беларусь (дзейнічае царква) — Падняпроўе — Паазер'е. Кошты ўваходу: вучнёўскі 2000 руб., на экскурсію 4000 руб.; дарослы 6000 руб., экскурсія 6000 руб.

МУЗЭЙ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

тэл. 68-64-03. Час наведваньня з 10.00 да 16.00. Выхадны – субота, нядзеля.

Экспазыцыя **"Музычныя інструмэнты беларускіх майстроў"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЭЙ ВАЕННАЙ ГІСТОРЫІ

тэл. 69-57-01. Час наведваньня з 9.00 да 17.30. Выхадны – субота, нядзеля.

Выставы: Да 100-годзьдзя з дня нараджэньня маршала Жукава. Да 50-годзьдзя Перамогі. Уваход вольны.

МУЗЭЙ БЕЛАРУСКАЙ МІЛІЦЫІ

тэл. 27-82-66. Час наведваньня з 9.00 да 18.00. Выхадны – субота, нядзеля. Экскурсіі групам – на папярэднюю замову.

МУЗЭЙ ГІСТОРЫІ МЭДЫЦЫНЫ БЕЛАРУСІ

Час наведваньня з 10.00 да 17.45, пятніца да 16.45. Выхадны – субота, нядзеля.

МУЗЭЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛЕГІІ БЕЛАРУСІ

К.Маркса, 12, тэл. 27-56-12. Час для наведваньня з 11.00 да 19.00. Выхадны - серада.

ДОМ-МУЗЭЙ 1 ЗЬЕЗДУ РСДРП

пр. Ф.Скарыны, 31а, тэл. 36-68-47. Час наведваньня з 10.00 да 18.00. Выхадны – серада.

Экспазыцыя + выстава **"З гісторыі палітычнай агітацыі"**. Уваход вольны. Экскурсіі праз папярэднюю замову.

МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЦЫРК

праграма сэзону 1995-1996

Вялікае цыркавое шоў МЯДЗЬВЕДЖЫ ЦЫРК

Аўтасэрвіс у цырку. Кіраўнік — Уладзімер Дзярабін.

Штодзённа, пачатак а 19.00. У суботу двойчы — 15.00, 19.00. У нядзелю — тры разы — 11.30, 15.00, 19.00.

ГОМЕЛЬСКАЯ АФІША

ДЫСКАКЛЮБ "ЛАЙТ"

прапануе адпачыць ад 22-й вечара да 4-й гадзіны раніцы. Працуе штодня ў фае к/т імя Калініна (акрамя панядзелка).

Кошт: 50.000 БРБ, у суботу 70.000 БРБ, для пань і студэнтаў скідка 50%.

ЧЫРВОНАЯ ЗАЛЯ РЭСТАРАЦЫІ "ТУРЫСТ"

Савецкая, 87

прэзэнтуе вар'етэ "СЮРПРЫЗ".

Штовечар (акрамя панядзелка й серады) ад 20-й да 21-й гадзіны Вас чакае відовішча яркае, даведзенае да... Адно зь нешматлікіх месцаў у горадзе, дзе сапраўды можна прыгожа пажыць некалькі гадзінаў, праглядзеўшы калейдаскоп танцаў ад наскага Крыжачка да іхняга Кан-кану ў яскравай, з добрым густам пастаўленай шоў-праграме. Кошт: 50.000 БРБ

КІНО. МЕНСК

АЎРОРА

Прытыцкага, 23, тэл. 533-360, 533-361

Сьмяротны захоп 29-30, 2-5 — 17.40, 21.00; 1 — 12.50 (ільготны), 17.40, 21.00

Гнеў 29-3 — 16.00, 19.20; 4-5 — 16.00 (ільготны), 19.20

Жыкіна дынастыя 4-5 — 13.00

Для дзяцей:

Белыя ваўкі 29-30 —

КІНО, ВІДЭА 29 КРАСАВІКА - 5 ТРАЎНЯ

14.30
Новыя прыгоды капітана Ўрунгеля 1-5 — 14.30

БЕРАСЬЦЕ
пр. газэты "Праўда", 25, тэл. 728-660, 716-888

Непрыстойная прапанова 29-1 — 14.40, 19.40; 2 — 17.10, 20.30; 3-4 — 17.10; 5 — 17.20
Апошні, хто застаўся жывы 29-30 — 13.00, 16.40; 1 — 16.40; 2-4 — 15.30; 5 — 15.40
Дзікая цяга 29-1 — 18.20, 21.40; 2-4 — 19.20; 5 — 19.10
Інфармацыйна-забаўляльная праграма 3-5 — 20.30
Для дзяцей:
Вялікі 1 — 13.00
Кэці 4 — 14.00
Дыскатэка для дзяцей 5 — 13.30

ВІЛЬНЯ
Калінoўскага, 55, тэл. 655-262

Чалавек-бомба (баявік з элемэнтамі фантастыкі) 29-4 — 15.00, 19.50; 5 — 15.00 (ільготны), 19.50
Дэльта Вэнэры (эротыка) 29-5 — 16.30, 18.10, 21.20
Праз час 1 — 13.30 (ільготны)
Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Ўсьмешка" 30-1, 3-5 — 20.30
Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Славянскі кірмаш" 2 — 20.30
Кіна-дыска-шоў для падлеткаў 1, 5 — 14.30

ДРУЖБА
Ташкенцкая, 9, тэл. 409-013, 408-254

На каго Бог пашле 29-2, 4-5 — 15.30 (ільготны), 17.00, 20.20
Тастамант "блакітнага дзядзечкі" 29-2, 4-5 — 18.40
Інфармацыйна-забаўляльная праграма для моладзі 1-5 — з 20.00 да 23.00; 30, 1. 4 — з 23.00 да 5.00
Працуюць кавярня й більярд 29-2, 4-5 — з 9.00 да 21.00

КАМСАМОЛЕЦ
Жылуновіча, 39, тэл. 454-194

Два прыдуркі з парсючком 29, 30 — 12.00, 17.00, 19.00, 20.30; 1-5 — 12.00, 17.20, 19.00, 20.30
Жорсткае правасудзьдзе 29, 30 — 16.00, 20.20; 1-5 — 14.00, 16.00, 20.20
Заля індыйскага фільму:
Кішан і Канхоя (2 сэрыі) 29, 30 — 18.00; 1-5 — 15.00, 18.00
Відэапаказ:
Ваяры цені (фантастычны баявік) 29, 30, 1-3 — 17.00; 4, 5 — 14.00
Гэта магло здарыцца з вамі 29-30, 1-3 — 19.00; 4-5 — 16.20
Для дзяцей:
Вяртаньне Залатой Рыбкі і іншыя мультфільмы 29, 30 — 11.00, 14.00
Шэры Воўк & Чырвоная Шапачка 1 — 11.00
Мультфільмы 2, 3 — 10.20, 10.30; 4, 5 — 11.00

КАСТРЫЧНІК
пр. Ф.Скарыны, 73, тэл. 329-325, 329-429

Залатое вока 29-5 — 15.50, 21.00
Крэола — выспа каханьня 29-5 — 14.20, 18.00, 19.30
Макс-шоў 29-5 — 22.00

КІЕЎ
бульвар Шаўчэнкі, тэл. 373-270

На ўзаемную згоду (псыхалягічны дэтэктыў) 31-3, 5 — 15.00; 4 — 15.00 (ільготны)
Дэльта Вэнэры (эротыка) 30-5 — 16.45, 18.30, 20.10
Відэапаказ 29 — 18.00, 20.00
Дыскатэка 1, 3, 4 — 20.00
Для дзяцей:
Выкраданьне ў Цюцюрлістане 30 — 13.30
Вялікі 5 — 13.30

МАСКВА
пр. Машэрава, 13, тэл. 231-448, 231-533

Сьмяротная бітва 29-5 — 15.00, 19.00
Высокая мода 29-5 — 16.50, 21.00
Шоў **"Парадыз"** 29-5 — 21.30
Для дзяцей:
Дыскатэка **"Лімпапо"** 5 — 12.00

МІР
Казлова, 4а, тэл. 333-771

На залатым ганку сядзелі... 29-5 — 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00
Сканэр-паліцыянт 29-5 — 13.00, 19.00
Парушаючы правілы 29-5 — 15.00, 21.00
Рэтраспэктыўны паказ улюбёных фільмаў у рубрыцы "Партрэт рэжысэра": **"Пётар Тадароўскі"**:
Якая дзіўная гульня 29-5 — 17.00

ПАРТЫЗАН
Талбухіна, 18, тэл. 663-526

Крыжак 29-1, 3-5 — 16.00, 17.50, 19.40, 21.30; 2 — 16.00 (ільготны), 17.50, 19.40, 21.30

ПЕРАМОГА
Інтэрнацыянальная, 20, тэл. 237-245

Мужчынскі талісман 29-30, 2-5 — 13.00, 16.40, 18.30; 1 — 13.30 (ільготны), 16.40, 18.30; 4-5 — 16.40, 18.30
Кінаклюб **"Акторы й ролі"** 29 — 18.30
Пераправа 4 — 13.00
Аты-баты, йшлі салдаты 5 — 13.00
Французская жанчына 29-2 — 14.50, 20.30; 3-5 — 14.50
Інфармацыйна-забаўляльная праграма 1, 3-5 — 21.00
Інфармацыйна-забаўляльная праграма для дзяцей і падлеткаў 5 — 16.00-18.00
Дэнс-шоў 3-4 — 24.00-6.00

ПІЯНЭР
Энгельса, 20, тэл. 278-945

Мак-мільёньнік 29, 2-3 — 11.30, 15.00, 17.00; 30 — 13.00, 17.00; 1 — 13.00, 15.00, 17.00; 4-5 — 13.10, 15.00, 17.00
Маладая вядзьмарка 29, 1-3, 5 — 19.00; 30 — 15.00, 19.00

Для дзяцей:
Каралеўства перакошаных люстраў 29, 2 — 10.00, 13.10; 1 — 11.30
Дзед Хатабыч 3 — 10.00, 13.10; 4-5 — 11.30
Прышлы Ванюша і іншыя мультфільмы 4-5 — 10.00

РАКЕТА
Рабочы зав., 3, тэл. 260-620

Зухаватая парачка 29-3 — 17.00, 20.00; 4-5 — 15.00, 18.00
Эмануэль-2 29-3 — 18.30; 4-5 — 16.30, 19.30
Відэапаказ: 1-3 — 16.50, 19.00; 4-5 — 15.30, 17.40

СУЧАСЬНІК
Харкаўская, 70а, тэл. 515-563

Дзевяць грамаў абаяльнасьці 29, 1-5 — 14.30
Сэкстае пачуцьцё (эротыка) 29-5 — 16.30, 18.30, 20.30
Інфармацыйна-забаўляльная праграма 1-5 — з 19.00 да 23.00
Для дзяцей:
Мультзборнік 30 — 14.30; 5 — 13.00
Прынцэса Паўлін 1-2 — 13.00

УДАРНІК
Жукоўскага, 156, тэл. 259-630

Сын Ружовай пантэры 29-5 — 15.30
Зона будучыні 29-5 — 17.10
Танчы, танчы (2 сэрыі) 29-5 — 18.50
Для дзяцей:
Дыназаўрык і іншыя мультфільмы 1 — 14.00
Найлепшы з найлепшых 4-5 — 14.00

ЦЭНТРАЛЬНЫ
пр. Ф.Скарыны, 13, тэл. 208-297

Вяроўка 29-5 — 12.40, 16.00, 19.20
Унутраная моц 29-5 — 11.00, 14.20, 17.40, 21.00
Інфармацыйна-забаўляльная праграма 29-5 — з 21.00 да 23.00
Бар працуе з 12.00 да 21.00

ЭЛЕКТРОН
Казінца, 117, тэл. 789-563

Жах на вуліцы Вязаў-3 29-30, 2-3 — 13.30, 16.30, 21.00; 1, 4-5 — 16.30, 21.00
Выкраданьне па-амэрыканску 29-5 — 15.00, 19.30
Жыкіны мэмуары 29-5 — 18.00
Камандас (2 сэрыі) 1, 4-5 — 12.30
Для дзяцей:
Палётны карабель 1 — 11.00
Верная Рука — сябар індзейцаў 4-5 — 11.00

АДРАСЫ ВІДЭАЗАЛЯЎ

"ГАЛЯКТЫКА" пр. газэты "Известия", 18, тэл. 714-512;
"ПАЛЯНЭЗ" вул. Бачылы, 16, тэл. 441-342;
"ПОЎНАЧ" вул. Герасіменкі, 26, тэл. 433-813.

НАЙНОЎШЫЯ НАБЫТКІ МЕНСКАГА ВІДЭАРЫНКУ НА 16.04 - 23.04

Камэдыя:

"ГОНАР "БОСТАН СЭЛТЫК" (CELTIC PRIDE) ЗША 1996

86 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5/4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Ды Сэркіё, у р. Дэн Эйкрайд, Дэйман Вайнс ("Маёр Пэйн"), Дэніел Штэрн ("Стомлены пераходам"). Адданыя заўзятары баскетбольнага клюбу для таго, каб іхная ўлюбёная каманда перамагла ў фінальнай гульні NBA, скрадае найлепшага гульца каманды суперніка. Абавязкова паглядзіце!

"ЗАБОЙСТВА, ЗА ЯКОЕ НІЧОГА НЕ БЫЛО" (GETTING AWAY WITH MURDER) ЗША 1996

91 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Харам Мюлер, у р. Дэн Эйкрайд, Джэк Лёман, Лілі Томплін. Зборы $5 млн.! Звычайны амэрыканец — школьны настаўнік — зьдзяйсьняе ідэальнае забойства, але затым ён пачынае пакутаваць ад згрызотаў сумленьня...

"ТЭАДОР РЭКС" (THEODORE REX) ЗША 1996

90 хв. Маст/кам ацэнка: 3.0/4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Джанатан Бэтўэл, у р. Ўупі Голдбэрг, Рычард Раўндтры. Ляззрная якасьць. Паліцыянт і дыназаўр дасьледуюць таямнічае злачынства.

"ДРАКУЛА: МЁРТВЫ ДЫ ЗАДАВОЛЕНЫ " (DEAD AND LOVING IT) ЗША 1995

85 хв. Маст/кам ацэнка: 4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Мэл Брукс, у р. Лэсьлі Нільсэн, Мэл Брукс. Зборы болш за $11 млн. Ляззрная якасьць.

"ГОНКА ЗА СОНЦАМ" (RACE THE SUN) ЗША 1996

96 хв. Маст/кам ацэнка: 3.0/4.0. Узр. абм.: можна ўсім. Рэж. Чарльз Канганіз, у р. Джэймс Бэлюшы, Хэйл Бэры. Зборы $2 млн. Ляззрная якасьць.

"ГРЭЙС КЎІГЛІ " (GRACE QUIGLEY) ЗША 1995

74 хв. Маст/кам ацэнка: 3.0/3.5. Узр. абм.: ад 16 гадоў. У гал. р. Нік Нолт. Ляззрная якасьць.

Баявік:

"ЧАСОВЫ НАСТАЎНІК/ НОВЫ НАСТАЎНІК" (THE SUBSTITUTE) ЗША 1996

111 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5/4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Робэрт Мэндэл, у р. Том Бэрынджэр, Глен Плямэр. Былы вайсковец аддзелу адмысловага прызначэньня вымушаны замяніць у школе сваю прыяцельку-настаўніцу, якая была зьбіта бандаю вучняў з арганізацыі "Каралі разбурэньня"...

"НЕДАЛЬНАБАЧНАСЬЦЬ" (TUNNEL VISION) АЎСТРАЛІЯ 1995

91 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5/4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. У р. Робэрт Рэйнальдс, Рэбэка Рып. Ляззрная якасьць.

"ВОКА ЗА ВОКА" (AN EYE FOR AN EYE) ЗША 1995

97 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5/4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Джон Шлезынгер. У р. Салі Філд, Кіфэр Сазэрленд, Эд Харыс. Зборы больш за $27 млн. Ляззрная якасьць.

"ДВУБОЙ БЯЗ ПРАВІЛАЎ" (MARTIAL OUTLOW) ЗША, НЯМЕЧЧЫНА 1993

89 хв. У р. Джэф Ўінкат. Ляззрная якасьць.

Прыгоды:

"ДЖЭЙМС І ГІГАНЦКІ ПЭРСІК" (JAMES AND THE GIANT PEACH) ЗША 1996

75 хв. Маст/кам ацэнка: 4.0. Узр. абм.: можна ўсім. Рэж. Генры Сэлік, у р. Джаана Ламі, Пітэр Постлейтэр. Казка + мультфільм + супэрновая камрутарная графіка, зборы $8 млн.! Хлопчык Джэймс застаўся без бацькоў і стаў жыць са злоснымі цёткамі, але аднойчы ён зьеў чароўны пэрсік і стаў маленькім (памерамі з жамярыну). Пагаварыўшы з жучкамі і павучкамі, Джэймс выпраўляецца ў далёкае падарожжа...

"БРАТЫ МЯЖЫ" (BROTHERS OF FRONTIER) ЗША 1996

96 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5. Рэж. Марк Сабэл, у р. Джоўі і Мэт'ю Доранс. Ляззрная якасьць.

Трылер:

"ЖАНЧЫНА, ЯКАЯ САГРАШЫЛА" (THE WOMAN WHO SINNED) ЗША 1995

93 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5/4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. У р. Майкал Дудыкаф, Сюзан Лучы. Ляззрная якасьць.

Залатая відэатэка:

"НІКА: ПА-НАД ЗАКОНАМ" (ABOVE THE LOW) ЗША 1988

97 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5/4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Эндру Дэвіс, у р. Стывэн Сыгал, Шэран Стоўн.

"НІКА-2: НАСУПЕРАК СЬМЕРЦІ" (HARD TO KILL) ЗША 1990

95 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5/4.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Брус Мэлмат, у р. Стывэн Сыгал, К. Ле Брок.

"НІКА-7: ЗАХОП-2/ЦЁМНАЯ ТЭРЫТОРЫЯ" (UNDER SLEGE 2: DARK TERRYTORY) ЗША 1995

100 хв. Маст/кам ацэнка: 4.0/5.0. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Джэф Мэлмэт, у р. Стывэн Сыгал.

"НІКА-3: ПАЗНАЧАНЫ СЬМЕРЦЮ" (MARKED FOR DEATH) ЗША 1990

93 хв. Маст/кам ацэнка: 3.0/4.5. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Дўайт Х. Літал, у р. Стывэн Сыгал, Кіт Дэвід.

"НІКА-4: У ІМЯ СПРАВЯДЛІВАСЬЦІ" (OUT FOR JUSTICE) ЗША 1991

90 хв. Маст/кам ацэнка: 3.5/4.5. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Джон Флін, у р. Стывэн Сыгал, Ўільям Фарсайт.

"НІКА-6: У СЬМЯРОТНАЙ ЗОНЕ" (ON DEADLY GROUND) ЗША 1994

102 хв. Маст/кам ацэнка: 2.5/4.5. Узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Стывэн Сыгал, у р. Стывэн Сыгал, Джоэн Чэн.

29.04 — 5.05

Панядзелак 29 красавіка

Беларускае тэлебачаньне 7.30 Ранішні кактэйль. 7.50 Эканамікст. 8.00 "У стылі джаз-рэтра". Ф/да. 8.20 "Ціхія троечнікі". М/ф. 10.30 Фэстываль тэлеправаграмаў і фільмаў "Гомель-96". 11.30 Фінансавы час. 11.50 "Выклікаем агонь на сябе". М/ф. с. 1. 15.00 Навіны. 15.15 Мультфільм. 15.35 ТБ – школе. 16.05 Параграф. 16.30 Бар'еры. 16.55 23 гр. 40 мін. на ўсход ад Грынвічу. 17.25 Крок. Правінцыя. 17.50 Музычны антракт. 18.00 Фінансавы час. 18.25 Эканамікст. 18.35 MTV. 18.50 Навіны. 19.00 Крок. 19.35 Гэта мы не праходзілі... 19.50 Канцэртны сэзон. 20.15 Люстра. 20.40 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.45 Спартовы тэлекур'ер. 22.10 "Аты-баты, ішлі салдаты..." М/ф. 23.35 Музыка безь межаў. 0.15 Навіны. 0.30 Дзёньнік Міжнароднага шахматнага фестывалю "Менск-96".

ОРТ 14.00 Навіны. 14.20 "Чароўныя гісторыі". 14.45 Марафон-15. 15.00 Зорны час. 15.40 "Элен і хлопцы". 16.05 Джэм. 16.30 Сем дзён спорту. 17.00 Навіны. 17.20 "Сакрэт трапіканкі". 18.10 Час пік. 18.35 Адгадай мэлёдыю. 19.05 Мы. 19.45 Дабранач, дзеці! 20.00 Час. 20.40 "Віртуальная рэальнасьць". 21.35 Да й пасьля... 22.25 Навіны. 22.35 Фільм Т.Тота "Дзеці чыгунных багоў".

Канал "Расея" 6.30 "Мядзьведжыя гісторыі". 7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00, 23.15 Весткі. 7.20 У гэты дзень... 7.30 Спраўная Расея. 8.00 Мультфільм. 8.10 Свая гульня. 8.40 Сялянскі пытаньне. 9.05 "Санта-Барбара". 10.20 "Гардэмарыны, наперад!" М/ф. з. 1. 14.50 Кола гісторыі. 15.45 Там-там навіны. 16.20 Мультфільм. 16.40 Выратаваньне 911. 17.30 Тэлечасопіс "О.Т." 17.40 L-клюб. 18.25 Лідар-прагноз. 19.35 "Санта-Барбара". 20.30 Даміно М.Баярскага. 21.05 Міжнародны шахматны турнір "Крамлёўскія зоркі". 21.20 "Прыцемкі багоў". М/ф. 23.30 Міліцэйская хроніка. 23.40 Лепшыя гульні НБА.

СПБ 17.05 Толькі бяз панікі. 17.35 Дзіцячае ТБ. 17.55, 18.55, 19.55, 20.55, 21.55 Інфарм ТБ "Цяпер". 18.05 Казка за казкай. 18.35 Вялікі фестываль. 19.05 "Першае каханьне". 20.05 "З Ленінграду ў Пецярбург у агульным вагоне". Д/ф. 20.35 Тэлеслужба бяспекі. 20.45 Што наша жыцьцё... 21.00 Спорт. 21.05 "Крысьці". 22.05 На ноч глядзячы. 22.20 "Званар і праўда". М/ф.

IV канал, НТВ 8.00 Мір вашаму дому. 8.10 Пэнсіён. 8.30 "Джокер". М/ф. 9.55 Пэргалезе. "Стадат матер". 9.40 АБВГДэйка. 10.00 Італьянская мова. 10.30, 13.30, 16.45 СІП. 10.40 У пошуках літаратуры. 11.20 "Партрэт у творчасьці Рэпіна". Д/ф. 11.30 АНК прэзэнтуе... 12.00 Міжнародны шахматны турнір "Крамлёўскія зоркі". 12.15 Ці памятаеш ты... 12.30 Чалавек у рынкавай эканоміцы. 13.00 Новая пачатковая школа. 13.35 "Сабака на сене". М/ф. с. 1. 14.40 Міжнародны шахматны турнір "Крамлёўскія зоркі". 15.00 Майстра. 15.30 Лекцыі Фэміды. 16.00 Музычныя навіны. 16.10 Міжнародны шахматны турнір "Крамлёўскія зоркі". 16.15 Муззон. 17.00 "Сямейка Флінстоўн". 17.30 Футбольны клюб. 18.00, 21.00, 23.00 Сёньня. 18.35 Герой дня. 19.00 М/ф "Бухта сьмерці". 21.35 "Доктар Кўін, жанчына-лекар". 22.30 Часінка. 23.20 Тэніс апоўначы.

Аўторак 30 красавіка

Беларускае тэлебачаньне 7.30 Ранішні кактэйль. 7.50 Эканамікст. 8.00 Навіны. 8.15 Аўта-парк. 8.30 Абібок. 9.00 ТБ – школе. 9.30 "Гомель-96". 10.50 Гэта мы не праходзілі... 11.05 Зорная ростань. 11.45 Безьліч. 12.45 "Выклікаем агонь на сябе". с. 2. 15.00 Навіны. 15.15 Мультфільмы. 15.45 Усе пра ўсе. 16.30 Майстэрня. 17.00 Сугучча. 17.20 Заняткі Н.Наважылавай. 17.50 Музычны антракт. 18.00 "Аншляг у тэатры абсурду". Д/ф. 18.15 Бывайце здаровыя. 18.25 Эканамікст. 18.35 MTV. 18.50 Навіны. 19.00 "Чакаю й спадзяюся". М/ф. с. 1. 20.05 Вэртыкаль. 20.40 Калыханка. 21.00 Панарама. 21.55 Музычны антракт. 22.05 М/ф "Матылькі". 23.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. "Лідс Юнайтед" – "Ньюкасл Юнайтед".

Нядзеля 05.00 Кантынэнт Эўропа 06.00 Круглы стол. Мэдыцына 07.00 Выбары 95-96 08.00 Па-над бар'ерамі 09.00 Дзёньнік джазу 10.00 Кантакты 11.00 Спэцыяльная праграма 12.00 Спэцыяльная праграма 13.00 Твар да твару 14.00 Эксьлібрыс 15.00 Выбары 95-96 16.00 Круглы стол. Мэдыцына 17.00 Кантынэнт Эўропа 18.00 Сац.-эканамічная гадзіна 19.00 Твар да твару 20.00 Эксьлібрыс 21.00 Спорт 22.00 Расея ўчора, сёньня, заўтра — Загалоўкі газэтаў 23.00 Спорт 00.00 Дзёньнік джазу 01.00 Твар да твару 02.00 Круглы стол. Мэдыцына 03.00 Кантынэнт Эўропа 04.00 Спэцыяльная праграма

VOA Расклад праграмаў "Голас Амэрыкі".

Менск	Мэтровыя дыяпазоны	Кілягерцы				Праграмы
11.00	16 19 25 31	17865	15445 15410 15370 15290 5250	11930 11885 11725	9625 9520	НА ЎСХОД Агляд наступнага часу
12.00	16 19 25 31	17865	15445 15410 15370 15290 15250	11930 11885 11725	9625 9520	НА ЎСХОД Усходні мэрыдыян
16.00	16 19 25 31 41	17805	15290	11885 11725	9520 7220	Радыёаб'ектыў
20.00	25 31 41 49	11770	9670 9660 9520	7220	6105	Мазаіка Навіны каротка
21.00	31 41 49		9660 9520	7270 7220	6105 6060	Падзеі і думкі
04.00	31 41 49		9520	7245 7220 7155	6105 5995	Ранішняя праграма

Панядзелак 11.00 Вашынгтонская кроніка. Амэрыканская сям'я. Дзёньнік мастацтваў. Прыхільнікам джазу. 12.00 Усходні мэрыдыян. 16.00 Радыёаб'ектыў. 19.00 Паўтор з 12.00. 20.00 Жыцьцё ў ЗША. Музыка кантры. У сьвеце бізнэсу. Улада закону. Ствараючы нацыю. 21.00 Падзеі і роздум. 22.00 Жыцьцё ў ЗША. Музыка кантры. У сьвеце бізнэсу. Улада закону. Ствараючы нацыю. 23.00 Паўтор з 12.00. 04.00 Ранішняя праграма. 06.00-06.30 Паўтор з 05.00.

Аўторак 11.00 Жыцьцё ў ЗША. Музыка кантры. У сьвеце бізнэсу. Улада закону. Ствараючы нацыю. 12.00 Усходні мэрыдыян. 16.00 Радыёаб'ектыў. 19.00 Паўтор з 12.00. 20.00 Круглы стол. Форум. Спартовая праграма. Нью-Ёрк. Амэрыканскія фэрмэры. 21.00 Падзеі і роздум. 22.00 Круглы стол. Форум. Спартовая праграма. Нью-Ёрк. Амэрыканскія фэрмэры. 23.00 Паўтор з 12.00. 04.00 Ранішняя праграма. 06.00-06.30 Паўтор з 05.00.

Серада 11.00 Круглы стол. Форум. Спартовая праграма. Нью-Ёрк. Амэрыканскія фэрмэры. 12.00 Усходні мэрыдыян. 16.00 Радыёаб'ектыў. 19.00 Паўтор з 12.00. 20.00 Так кажуць у Амэрыцы. Маладзёжная праграма. Для жанчын. Мэдыцына. 21.00 Падзеі і роздум 22.00 Так кажуць у Амэрыцы. Маладзёжная праграма. Для жанчын. Мэдыцына. 23.00 Паўтор з 12.00. 04.00 Ранішняя праграма. 06.00-06.30 Паўтор з 05.00.

Чацьвер 11.00 Так кажуць у Амэрыцы. Маладзёжная праграма. Для жанчын. Мэдыцына. 12.00 Усходні мэрыдыян. 16.00 Радыёаб'ектыў. 19.00 Паўтор з 12.00. 20.00 Размаўляючы з Амэрыкай. У фокусе Амэрыка. Асновы кіраваньня. Навука. Агляд лістоў. 21.00 Падзеі і роздум. 22.00 Размаўляючы з Амэрыкай. У фокусе Амэрыка. Асновы кіраваньня. Навука. Агляд лістоў. 23.00 Паўтор з 12.00. 04.00 Ранішняя праграма. 06.00-06.30 Паўтор з 05.00.

Пятніца 11.00 Размаўляючы з Амэрыкай. У фокусе Амэрыка. Асновы кіраваньня. Навука. Агляд лістоў. 12.00 Усходні мэрыдыян. 16.00 Радыёаб'ектыў. 19.00 Паўтор з 12.00. 20.00 Канцэрт пап-музыкі. Кніжны агляд. Кіно. 21.00 Падзеі і роздум. 22.00 Канцэрт пап-музыкі. Кніжны агляд. Кіно. 23.00 Паўтор з 12.00. 04.00 Ранішняя праграма. 06.00-06.30 Паўтор з 05.00.

Субота 11.00 Агляд габрайскага жыцьця. Кніжны агляд. Кіно. 12.00 Канцэрт пап-музыкі. 16.00 Радыёаб'ектыў. 19.00 Канцэрт пап-музыкі. 20.00 Агляд габрайскага жыцьця. У падарожжы па Амэрыцы. Пра словы і людзей. 21.00 Падзеі і роздум. 22.00 Агляд сямейнага жыцьця. У падарожжы па Амэрыцы. Пра словы і людзей. 23.00 Паўтор з 13.00. 04.00 Размаўляючы з Амэрыкай. Прафсаюзы. Вашынгтонская кроніка. Агляд лістоў. 06.00-06.30 Паўтор з 05.00.

Нядзеля 11.00 Рэлігія ў нашым жыцьці. У падарожжы па Амэрыцы. Пра словы і людзей. 12.00 Вынікі тыдня. Закон і этыка. Далёкаўсходні кур'ер. 16.00 Радыёаб'ектыў. 19.00 Паўтор з 13.00 20.00 Рэлігія ў нашым жыцьці. Дзёньнік мастацтваў. Прыхільнікам джазу. 21.00 Падзеі і роздум. 22.00 Рэлігія ў нашым жыцьці. Дзёньнік мастацтваў. Прыхільнікам джазу. 23.00 Паўтор з 13.00. 04.00 Ранішняя праграма. 06.00-06.30 Паўтор з 05.00.

Радыё 101,2

Інфармацыйныя перадачы:

08.05 Навіны 08.30 Дайджэст прэсы 09.30 Бізнэс-агляд 10.00 Замежныя навіны 11.00 Навіны Беларусі 12.00 Сусьветныя навіны Бі-Бі-Сі 13.00 Выпуск навінаў БелаПАН 13.30 Гарадзкі экспрэс 14.00 Навіны 15.00 Навіны 16.00 Навіны (БелТА, БелаПАН) 16.15 Бі-Бі-Сі (музычныя праграмы) 17.00 Праграма Беларускае службы Польскага радыё 18.00 Навіны

Аўтарскія праграмы:

11.15 "Бізнэс-актуаліі" (серада, пятніца) 11.15 "NRG", перадача пра французкую музыку (нядзеля) 11.30 "Квадракола", гумарыстычная перадача (субота) 11.30 "Два колеры", праграма пра ўкраінскую музыку (чацьвер) 12.15 "Музыка тоўстых", джазавая праграма (аўторак) 12.30 "ПраРок", музычная перадача (пятніца) 12.30 "Паехалі!", аўтаперадача (чацьвер, субота) 14.15 "Т.Б. Дэнс", танцавальная праграма (нядзеля) 15.15 "Вака-Джавака", музычная праграма (чацьвер) 16.45 "Бабілёнская бібліятэка", лтаратурная перадача (панядзелак)

DW Радыё "Нямецкая хваля"

Панядзелак 23.00 Навіны. Агляд сусьветнага друку. Культура сёньня. Занятак нямецкае, курс 3. 23.50 Афіша тыдня. 02.00 Навіны. Занятак нямецкае, курс 1. Парад зорак. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Рэлігія і царква. Трыбуна. Музыка: джаз. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Рэлігія і царква. Трыбуна. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Аўторак 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Рэлігія і царква. Трыбуна. Музыка: джаз. 06.50 Інфармацыя пра парадачы. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. Трыбуна. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Эўропа і эўрапейцы. Культура сёньня. Музыка: клясыка. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. Трыбуна. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Эўропа і эўрапейцы. Культура сёньня. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Серада 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Эўропа і эўрапейцы. Культура сёньня. Музыка: клясыка. 06.50 Інфармацыя пра перадачы. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. Эўропа і эўрапейцы. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Рынак і чалавек. Чытальная заля. Музыка: фанатэка. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. Эўропа і эўрапейцы. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Рынак і чалавек. Чытальная заля. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Чацьвер 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Рынак і чалавек. Чытальная заля. Музыка: фанатэка. 06.50 Інфармацыя пра перадачы. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. Рынак і чалавек. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Нямеччына зь першых рук. Масты. Паштовая скрыня. Народныя мэлёдыі. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. Рынак і чалавек. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Нямеччына зь першых рук. Масты. Паштовая скрыня. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Пятніца 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Нямеччына зь першых рук. Масты. Паштовая скрыня. Народныя мэлёдыі. 06.50 Інфармацыя пра перадачы. 18.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. Нямеччына зь першых рук. 19.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Дыскусійны клюб. Музыка: топ-хітс. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Радыёхроніка. Нямеччына зь першых рук. 21.00 Навіны. Агляд расейскага друку. Занятак нямецкае, курс 1. Народныя мэлёдыі. Афіша тыдня. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Субота 23.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Дыскусійны клюб. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Дыскусійны клюб. Музыка: топ-хітс. 06.50 Інфармацыя пра перадачы. 18.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Дыскусійны клюб. Масты. Паштовая скрыня. 19.00 Навіны. Агляд сусьветнага друку. Ліст з Парыжу/ Бэрліну. Парад зорак. 20.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Дыскусійны клюб. Масты. 21.00 Навіны. Агляд сусьветнага друку. Ліст з Парыжу/Бэрліну. Афіша тыдня. Занятак нямецкае, курс 1. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Нядзеля 23.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Кроніка тыдня. 23.50 Інфармацыя пра перадачы. 02.00 Навіны. Кроніка тыдня. Ліст з Парыжу/Бэрліну. Афіша тыдня. 18.00 Навіны. Агляд сусьветнага друку. Занятак нямецкае, курс 3. Парад зорак. 19.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Кроніка тыдня. Музыка: топ-хітс. 20.00 Навіны. Агляд нямецкага друку. Ліст з Парыжу/Бэрліну. Афіша тыдня. Культура сёньня. Чытальная заля. 21.00 Навіны. Агляд тыднёвага друку. Рэлігія і царква. Занятак нямецкае, курс 3. 21.50 Інфармацыя пра перадачы.

Схема перадаваньня НХ

Менскі час	Частоты ў кілягерцах (КХ)			
23.00-23.505925	5980	6000	7130	7235
02.00-02.505925	6035	7285	9815	9865
06.00-06.506055	7120	7285	9690	
18.00-19.555945	5980	6010	7145	9715
20.00-21.305945	5980	6010	7145	9715
20.00-21.505980	6010	7145	9715	



Радыё Ватыкан

Менскі час	Праграма	Дыяпазон
05.30	Расейская	5880-BC/49м, 6185-BC/49м, 7365-CD/41м
06.00	Украінская	5880-BC/49м, 6185-BC/49м
06.20	Беларуская	4015-B/75м, 6185-B/49м
06.40	Літоўская	4015-B/75м, 6185-B/49м
07.00	Латыская	4015-B/75м, 6185-B/49м
09.15	Украінская	9660-C/31м, 11740-C/25м
15.00	Расейская	11740-BC/25м, 15570-BC/19м
19.10	Расейская	5880-BC/49м, 6185-BC/49м, 7365-CD/41м
19.40	Украінская	5880-BC/49м, 6185-BC/49м
20.00	Беларуская	4015-B/75м, 6185-B/49м
20.20	Літоўская	4015-B/75м, 6185-B/49м
20.40	Латыская	4015-B/75м, 6185-B/49м
23.00	Расейская	6065-BC/49м, 7310-BC/41м.

RFI ICI PARIS ГАВОРЫЦЬ ПАРЫЖ

Штодзённа: Навіны, Факты і думкі, Агляд французскіх газэтаў.

Панядзелак: Навука і тэхніка (апошнія дасягненьні й тэхнічныя дасьледаваньні), (з паўсядзённага жыцьця сярэдняга француза).

Аўторак: Эканамічны кур'ер (бізнэс, фінансы, эканоміка ў Францыі), Жыцьцё ідэяў (філязофія, сацыялёгія, рэлігія ў найноўшых публікацыях).

Серада: Паштовая скрыня (адказы на лісты слухачоў), Мэдыцына (апошнія адкрыцьці й дасьледаваньні на Захадзе), аповеды пра расейскую эміграцыю.

Чацьвер: Літаратурнае скрыжаваньне (французскія пісьменьнікі "ўчора" і "сёньня", Францыя як месца сустрэчы розных літаратураў), Знакамітыя людзі Францыі (гісторыя Францыі ў біяграфіях).

Пятніца: Шпацыр па Францыі (забаўляльнае радыёпадарожжа ў найцікавейшыя куткі краіны), Курс французскае мовы.

Субота: Праграма на замовы (адказы на допісы слухачоў), Кінапанарама (агляд навінаў экрану), Курс французскае мовы (паўтор праграмы).

Нядзеля: Агляд французскіх тыднёвікаў, Культурная панарама (жыцьцё французскіх музэяў і тэатраў), Нядзельны канцэрт.

Праграмы Міжнароднага Французскага радыё можна слухаць у Парыжы і ягоных прадмесьцях: з 20 да 21 гадзіны паводле мясцовага часу на частаце 738 кГц. Па ўсім сьвеце: з 16 да 17 гадзіны паводле менскага часу на частотах 11 670 кГц, 15 605 кГц і 15 155 кГц (19 м), з 21 да 22 гадзіны паводле менскага часу на частотах 5 900 кГц (49 м) і 7 350 кГц.

Беларуская Рэдакцыя Польскага Радыё

14.30 (панядзелак), 18.30 (нядзеля) Беларускі літаратурны рух у Польшчы — гутарка Алеся Барскага. **16.30 (панядзелак), 14.30 (аўторак)** Агляд тыднёвіка "НІВА". **18.30 (панядзелак), 16.30 (нядзеля)** Разважаньні пра мову — што думаюць слухачы наконт месца беларускае мовы ў сьвеце і ейнае будучыні. **19.00 (панядзелак), 17.00 (нядзеля)** Канцэрт віншаваньняў, дзе кожны слухач зможа перадаць пажаданьні сваім блізкім і знаёмым, каханай і каханаму — усім. **18.30 (аўторак), 14.30 (серада)** Эканамічны блёк — бізнэс, банкі, Варшаўская Акцыянэрная Біржа, курсы валютаў, эканамічнае супрацоўніцтва Польшчы і Беларусі. **16.30 (аўторак), 18.30 (пятніца)** Хроніка спорту, усякая ўсячына. **16.30 (серада), 14.30 (чацьвер)** Культурныя актуальнасьці — тэатральныя прэм'еры, выставы, сустрэчы з польскімі і беларускімі мастакамі, кіно, кнігі. **18.30 (серада)** "Пад знакамі Арла і Пагоні" — гістарычная гутарка. **18.30 (чацьвер)** Гісторыя беларускае мовы. **18.30 (чацьвер), 14.30 (пятніца)** Навукова-тэхнічная перадача — досьледы знакамітых навукоўцаў, тэхнічныя "разыначкі", недаступнае. **16.30 (пятніца), 14.30 (субота)** Госьць тыдня. **18.30 (субота), 14.30 (нядзеля)** Гутаркі Сакрата Яновіча "Ад Біблii да беларускае літаратуры". **16.30, 19.00 (субота)** Рэдакцыйная пошта — адказы на лісты нашых слухачоў. **14.30 (нядзеля)** Рэлігійныя гутаркі айца Уладзімера Месюка. Усё гэта пераплецена цікавою музыкай: як клясычнаю, гэтак і лёгкаю.

19.00 (серада) Агляд Czasopisu i Przegl□du Prawos□awnego (кожны трэці тыдзень месяца)

Трансьлююцца:

а 14.30 на кароткіх хвалях 41,18 м і 50,04 м (адпаведныя частоты 7285 і 5995 кГц), а 16.30 на кароткіх хвалях 41,27 м і 49,22 м (а.ч. 7270, 6095 кГц), а 18.30 на кароткіх хвалях 49,22 м (а.ч. 6095 кГц).

Старонка вершаванага радка

Ігар Сідарук
Зь нізкі вершаў "МОЎКНАСЬЦЬ"

***
Паглядзі,
як заходзіць сонца.
Яно мёртвае,
тваё сонца.
За захадам – захад. Зыход...
9.05.95 г.

***
Спраўце надпісы на надмагільлях,
перпішыце,
замяніце магілы,
нябожчыкаў закапайце,
а інакш
ня будзе вяртаньня,
ня будзе
ніколі.
Ці трэба?
Час...
9.05.95 г.

***
Пачакай
будзеш
ісці па сьлядох сваіх,
азіраццa
наперад,
будзеш бачыць
сябе,
што йшоў тут,
пачакай,
іншы шлях
не шукай сам.
12.05.95 г.

***
Адляцелі ластаўкі,
не вярнуліся,
думаеш: "Ну й!..",
а яны так ня думаюць,
ім трэба,
а ў цябе няма,
як хораша думаюць ластаўкі,
не вярнуліся.
12.05.95 г.

***
Слухай, як кроплі,
слухай,
дождж
прынясе: "Ave",
мы пабачым заўтра,
што, ну што?
Таму слухай, слухай,
як кроплі, кроплі,
кроплі, слухай, кроплі,
заўтра (ужо прайшло).
12.05.95 г.

***
Ня будзь такім
ніякім
дурным,
ёсьць дурні дурнейшыя,
а ты ня зможаш,
сапсуеш нэрвы,
хлеб адбірацьмеш
ад дурняў,
а яны ж галодныя,
а яны ж халодныя,
пашкадуй дурня,
ён за гэта цябе – малатком!
12.05.95 г.

***
Калі ў цябе ёсьць вецер,
калі ў цябе ёсьць,
калі...
11.05.95 г.
м. Кобрынь.

Людка Сільнова
УЗДОЎЖ ІНДЗЕЙСКАЙ РАКІ

Кінем плакаць аб тым, што
здалося,
Пойдзем уверх цячэньнем
індзейскай ракі!
"Гэтага – з намі яшчэ не
адбылося...
Гэтыя – нам незнаёмыя яшчэ
рачукі..."
Ты ня Сьмерць, Час!
Рака твая – Будучыню
прыносіць да нас!
Пойдзем са мною, сябра мой
дарагі,
Уверх цячэньнем гэтай
індзейскай ракі!
З сабою вазьмі толькі лук і
стрэлы,
Нож нявостры, хлеб
зачарсьцьвелы.
Ты ня Сьмерць, Час!
Рака твая – Будучыню
прыносіць да нас!
Зарослым травою берагам,
ціха, удоўж
Гэтай вады даверлівай, уверх,
басанож –
Пойдзем жа, пойдзем у іншага
ладу краі,
Скуль гэта вецер вясёлы і ўсе
на зямлі!

ІНДЗЕЕЦ

А мне ўсё верыцца,
Што я была калісь індзейцам,

Мужным і сьмелым,
З поўным калчанам стрэлаў;

З доўгімі чорнымі коскамі
Да каленак гойстрых.

Помню я – з тае пары!.. –
Рукі-крылы (ці махры?);

Як у сьвятлаісных зданяў
Вучылася маляваньню;

І сядзела ля агню,
Слухаючы цішыню...

ХМУРЫНКА-ЎСПАМІН

Мне ўсё здаецца:
На Беларусі жылі індзейцы.

Іх перамаглі сябры –
Бізоны, альбо зубры.

Перамаглі. Засталіся...
І ў вечным смутку іх пысы.

В.Лоўкіс
ДУДОВЫ СЬПЕЎ

І са сьцюжы ды ў вагонь,
І са сьцюжы ды ў вагонь,
Адшукай мяне сярод цьмы
дрэваў,
Сярод іх халодных чэраваў.
Ткні-грэй цёплае мяккае лона,
І хай плача між намі гіблае
паветра...
Я панясу табе свой сьпеў,
Я дам табе моцы сваёй
жыватворнай,
І зьнішчу ўсе краскі зямлі і
сілу іх убяру ў цела –
Сілу жывую ды
вабу-прыгажосць...
І ўсё то будзе мой сьпеў,
будзе мой сьпеў.
А ты будзеш ня мой жаніх,
А будзеш мой муж,
Ды будзеш ласьціць ды ласьціць,
Дый не стрываеш –
Зубы твае гострыя – нажы
твае гострыя
Ды парэжуць лона маё сьпелае
сакавітае...
Пырсьне сок – і вішняй сплыве
бытнасьць дзеля нябыту...
Ах і будзе, ах і будзе...
Будзеш ласьціць скуру мяккую,
Скуру мёртвую, ды жывую –
Лона маё.
Вось сьвята жорсткае
пяшчоты тваёй...
І будуць два выйсьці, што
знойдзе лух:
Як вуснамі, да вуснаў упадзеш –
Будзе сьмех мой празрысты,
Жывы і зямны, што салаўіны
пошчак,
А другі выйсьце – мой стогн
незямны,
І як пацісьнеш лона маё –
Будзе стогн, што рака,
Што зьнясе ў вечны мой край.
Вось я сьпяю табе, сьпяю,
Вось распавяду-павяду,
Таямніцу ды разгарну.
1992 год. Мядзел.

Сымон Вернік
РУСЬ МАЯ ТЫ БЕЛАЯ!

Русь мая ты белая!
Русь мая гаротная!
Рана набалелая,
Пачуцьцё самотнае!
Годнасьць заахвоціла –
Ганарліва княжыла.
Мо каму й няўгодзіла,
Мо каму й нязважыла!

Зноў гукаю й клікаю
Я душой шляхетнаю
Русь маю вялікую,
Русь маю адметную!

"Дзе-ж цяпер ты, Русь мая
З русічамі шчырымі?!"
Птушкаю зраблюся я,
Замахаю крыламі.
З вышыні ёй гляну я
Ў вочы-глыб азёрную.
Русь мая каханая!
Зорка непаўторная!

Палячу над пожняю,
Дзе рачулка промніцца,
Мілатой заможнаю
Сэрца зноў напоўніцца.
Паплыву над вёскаю,
Дзе бацькі клапоцяцца,
Міласьцінай Боскаю
Дух з душою ўзгодніцца.

Сяду ў травы росныя,
Адпачну ля дуба я.
Русь мая бялёсая!
Крывічанка любая!
Травы як пуховачка,
Ды дуброва ладная.
Русь мая сяброўчачка!
Палачанка здатная!
Ці ж каму нязважыла?!
Ці ж каму няўгодзіла?!
Ганарліва княжыла, –
Годнасьць заахвоціла!
Вербачкі ды ясені,
Ды бярозкі тонкія,
Клёны ўкупе зь вязамі,
Ды ялінкі гонкія.
Хвоі ды асіначкі,
Ды лугі мурожныя.
Русь мая ліцьвіначка!
Крывія прыгожая!
Кожная лагчыначка
Бы калыска й люлечка.
Русь мая крывічачка!
Русь мая матулечка!
Чым каму няўгодзіла?!
Як каму нязважыла?!
Годнасьць заахвоціла –
Ганарліва княжыла!

Русь мая славянская!
Русь мая літоўская!
Пушчы нарачанскія,
Берагі дняпроўскія,
Хмызьнякі палескія,
Ды імшары гразкія,
Ды затокі менскія
Й нетры нараўлянскія.
Поймы рагачоўскія,
Гушчары смаленскія,
Гмахі магілёўскія,
Муры берасьцейскія.
Віцебская ветлівасьць,
Дбаласьць гарадзянская,
Полацкая кемлівасьць,
Слава амсьціслаўская!

Зноў гукаю й клікаю
Я душой змарнелаю
Русь маю вялікую –
Бел-чырвона-белую!
Хай каму й нязважыла!
Хай каму й няўгодзіла!
Ганарліва княжыла, –
Годнасьць заахвоціла!!!
12.10.1995

Шкудун З. нарадзіўся ў в. Букча Лельчыцкага р-ну Гамельскай вобл. 6.06.1976 году. Там жа ў 1993 годзе скончыў СШ і пасьля гэтага накіраваўся на вучобу ў ГДУ імя Ф.Скарыны, дзе цяпер і вучыцца. Творчы псэўданім – З.К. (Зьміцер К.)

З.К.
МАНІЯ ПАТРЭБНАСЬЦІ

Жадае...
Мяккі дым мрояў, на вечар
Адкладзена справа, важная зброя
–
Збой у сыстэме, вобразы Гоя
Кладуць адказы налётам вечным.
У шэрасьць роздум прыветна
мяккі
Прыкрасьць сябра – холад ночы
Страчнюць дзесьці і вяжуць раны
Іх справаў сардэчных.
Разьметка лёсаў раўняе твары
Саплівых песень гнілая похаць
Зьмярае мэтры, няроўнасьць краю
Дарогі, дзе патрэбна ехаць,
Дзе трэба сунуць рукамі неба,
Гразёю – сінь забытае лужы
Дажджом учора і кветкі ружы
Іржаць разам з калосьсем хлеба.
На твар наносіць кавалкі сонца
Ў эфіры шоргат галін бярозы
Умовы ціха дыктуе мера
Праз дождж – прэсны сьлёзы
Й на пальцах вочы, ці цені ночы
Малююць позірк ў гнілой пылоце
Скажае сэнс і крычыць у ахвоце
На знак з экрана.
Прыцягласьць думкі,
хвіліна злосьці
Прылад карысных
дабро і жаласьць
Маўчаньне мёртвых
і толькі слабасьць
Абвесьціць кошт чыйгосьць
"кармана"
Размазаць вочы, ня бачыць меры
Размах шырокі вачэй шчасьлівых
Раўняе проста і любіць верна
Кавалкам ў поўнач сьлятога неба.

Язэп Вісарыёнаў
ПРАВАДЫРУ Й НАСТАЎНІКУ

"Добры дзень, таварыш
прэзыдэнт!
Гэта я, – грамадзянін дзяржавы
Мафіяй зьнявечанае ўшчэнт,
Свае думкі выкажу яскрава.
Ведаю, што вам не да мяне,
Бо ж у вас такіх як я, – мільёны,
Кожны зь іх, браток, не абміне
Пры сустрэчы вас вітаць
натхнёна.
Я ж вітаю зь перамогай вас,
З вызначаным вамі ўрэшце
шляхам!
Сьцяг, які хаваў я ўсё
ў прыпас, –
З гонарам цяпер узьняў
над дахам!
Зноў узрушыўся стары саўгас
Пад былым палотнішчам
чырвоным,
Бо саўбу мы скончылі якраз, –
Частаваў дырэктар самагонам.
Вылучылі зараз мужыкі
Зноў яго народным
дэпутатам.
Розуму, – як нас (бо ж гаваркі!)
Хай вучыць тых там
дэмакратаў!
Пагулялі ў вёсцы небяды.
Лаялі, як мае быць,
"нацыстых".
Запрасілі нават (як тады!)
Да сябе мясцовых
камуністых!
Кажуць, – нібы будзе
прэзыдэнт
Разглядаць усіх нас –
партакратаў!?
Я ж спаліў калісьці
партбілет, –
Эт, паслухаў, дурань,
дэмакратаў!
Як цяпер?! Мо зноўку
на бюро,
Ці да тых мне, –
хто па "вэрты-калі"?!
Сэрца так і тузае рабро,
Мы з кабетай сяньня ноч
ня спалі.
Не карай, шаноўны правадыр,
Бо зь білетам я ня страціў веры.
Калі трэба – апрану
мундзір,
Стану поплеч з вамі –
афіцэрам!
Кажуць, што ля нашае мяжы
Армію сканцэнтравала
"НАТА"?!
Калі так, дык што тут
не кажы, –
Не стрымаем мы яе бяз брата!
Мы з братом абдымемся дужэй,
Расіянцаў мову
толькі й ведай!
Я ж (між намі гэтае, – цішэй!)
Не валодаю ня той, дый і
ня гэтай.
Блытаніна, бляха, на слыху
Розных словаў, як пачну
гаворку.
Вось і кажуць: "Ані ў зуб нагу!",
За Айчыну ж
страчаную горка!
Толькі ж не ўразуміць аніяк,
Як яднацца будзьма мы з
суседам?!
Дэмакратыю ён робіць! Ці ж
ня так!
Дык і можа мы за ім жа
сьледам?!
Калі так, – дык Бог абарані!
Уладараць мафіёзныя там
кляны!!!
А ўцячы як ад вайны ў
Чачні?!
Можа зноў падацца ў
партызаны?!
Вы б да сьценкі ўсіх іх,
як раней, –
Дык адразу ж клопату ня будзя!
Толькі трэба гэта ўсё хутчэй, –
Покуль вераць вам, таварыш,
людзі!
Наудумлялі ж, трасцы, –
дэмакрат,
Чэк, правытызацыя, свабода!
Трэба ўласнасьць нам забраць
назад!
Гэта ж залаты прыпас
народу!
Дзякую, шаноўны прэзыдэнт,
За спагаду, клопаты і ўвагу.
Хопіць ім рабіць ексьпырымэнт
І краіну марнаваць
да краху!
Нам патрэбна ў момант
пэўны
ўзяць
І цяжком скруціць карупцанераў,
Хопіць гмахі з цэглы
будаваць!
Калі б волю меў, –
усё б абмерыў!
За мяжу кілбасы так і пруць.
Кормім сьвет замежны ўвесь
харчамі.
Пільным, любым мне
таварыш, будзь,
Варушы, як мае быць,
вусамі!
Што вам гэты абібок Пазьняк!
Ён спазьніўся! Вы цяпер –
улада!
Скінулі назойлівы той сьцяг, –
Дык саветы будуць,
а ня рада!
Здымем мы й "уласаўскі"
сьцяжок,
Вось хутчэй каб толькі
аб'яднацца.
І ўкраінцам
нададзім "урок", –
Як зь Пятлюрам за народ
змагацца!
Любы нам, таварыш прэзыдэнт!
Мой сардэчны правадыр -
прамоўца!
Дзе набыць вялізны
ваш партрэт,
Каб сьвяціў заўжды мне ён,
як сонца!
Да душы мне, не дзеля красы.
Прэзыдэнт жа, – ёсьць душа
дзяржавы!
Распушы, як мае быць, вусы
Грабянцамі
сталінскае славы!"

21 траўня 1995 году.

Браніслаў Пяткевіч
САКАВІК

Адляцеў неўпрыкмет сакавік,
Трохі сьнегу зямельцы прыбавіў,
А няспынны жыцьця рухавік
Даў рахунак зьдзяйсьненьням
у справе.
Паказаў, што нядатны урад,
Паказаў, што прачнуўся народ,
Выдаў сьмелым адвечны мандат
Рухаць воз змагароў упярод.
Паказаў, як нягеглы паэт,
Свой прадаўшы талент за рубель,
Азадачыў зьбянтэжаны сьвет
І Пэгаса ня зьвёў з аглабель.
Паказаў, што й наш патрыёт
Не прымае няволі ярма;
што даволі нястрымны ўзьлёт
Не стрымае нязгоды зіма.
Сакавік абвяшчае вясну,
Адраджацца прыроду заве.
Каб любілі мы праўду адну, –
Прасьвятленьне нясе галаве.
31.03.96 Полачына

Зьміцер Вішнёў
З цыклю "ЗЯЛЁНЫЯ ЛЁЗУНГІ"

***
Я гуляю сыфілітыкам
зялёны жах
і шпурляю паралітыкам
і ганяю параноікаў
я чорны хам

***
родным склонам
я крычаў
родным склонам
я пытаў
а пасьля
я мармытаў
ролабом
ролабон
бон рол
ралі бам
дан дан
бум бум
бу-бу-рун
дук-дук
родным-родным
дасылаў
і сяброў
я паважаў
але штосьці
не крычаў
але штосьці
я хаваў
і таму
цяпер
у турме
я малюю
на сьцяне
чорную
чорную
чорную
лыжку

Я НЯ ДУК

ахвярую настаўнікам

Я ня бук
Я ня брук
Я ня дук
Я адчуваю
подых
Я адчуваю
словы
вакол мяне
коўзаюцца
роўзаюцца
недарэчна-
парнаграфічна-
стылістычная
артаграфічная
сынтаксічная
мая душа

***
Сагрэй мяне сваім дыханьнем
хутчэй
сагрэй
хутчэй
я пакрываюся лакам

ЗНОЎ Я

ахвярую Мішкаваму і Бабінаму Шэдару і Выбухному Карбіду

...чакаю зграі афрыканскіх...
...не чапляйце аўтрофнага...
...качаю адзін недарэчны...
...не хапайце аўтарытэтнага...
...не прымаю варожых...
...не ганьбіце
аўтарыфнага
мяне –
ВІШНЁВА

29 студзеня

Багдан Баркулаб Шых

***
Шолах лісьця па асфальце,
крык дзіцяці ў цёмнай хаце.
Расьцісьнуўшы, не расьціўшы,
мураша на сваім стале,
я паклаў яму
замест каменю магільнага
крышачку белага хлеба –
няхай будзе адзіная Памяць,
пакуль хто анучаю
не зьмяне.
Крык дзіцяці на асфальце –
шолах лісьця ў старай хаце.

КАЛЫХАНКА ДЛЯ АРЫНКІ

А чаму ж ты, мая зорачка,
ня сьпіш?
Мы жывем у цёплай хаце
бабулі маёй,
у якой ва ўласны двор
ёсьць чацьвёра вакон,
два – на вуліцу
ды адное – ў гарод
і ва ўсе ў іх сьвеціць поўня.
Мо тое сьвятло замінае табе?
Дабранач.

Натальля Капа
МАНАСТЫР

За вёскаю, у аддаленьні,
Дзе цягнецца нудны пустыр,
Стаіць, паўразбураны, ценем
Забыты стары манастыр.

Сырэюць халодныя сьцены,
Падмурак ахуталі мхі,
А побач расьце ў запусьценьні
Сад дзікі, самотны, глухі.

Тут столькі нуды ў лістападзе,
Ураньні няўтульна бывае,
Паветра цяжкое, бы ў кадзе,
А ў прыцемках сад ажывае.

Як сьнег ад вясновых павеваў,
Тае застылая копаць
І зданьню ад кожнага дрэва
Ў цішы адлучаецца постаць:

Законьнікі ў чорным адзеньні
Пакорліва, без сьвятара,
Сыходзяцца зноў на маленьне
Да бедага манастыра.

Навокал усё замірае
Ў чаканьні прасьведнае мовы,
І глыб цішыні парушаюць
Нягучныя пацераў словы.

І чыстай, жывою валою
Малітва зямлю наталяе –
Узьнесенае і сьвятое
Прырода не ведае – ды адчувае.

І дыхаюць ветру павевы.
Нібыта з часоў даўніны,
І чуюцца боскія сьпевы,
І стогнуць званіцы званы.

Адчужана, самазабыўна.
Манахі ля кляштарных сьценаў
За існых, памерлых і прышлых,
І край гэты шэпчуць маленьні.

А потым, у подступах ночы,
Калі ажыўляюцца цені,
Усе разыходзяцца моўчкі –
Да новых Дзядоў, да вячэрні.

І ціха тут, ціха і млосна –
Ні рухаў, ні згукаў, ні сьпеваў,
Часамі пракоціцца лоскат,
Ды ціха гайдаюцца дрэвы.

Сьвятлана Лавейкіна
СЫН

О, ён крычаў зусім па-руску,
Народжаны ад ворага мой сын,
Як спавівала у старую хустку
І бегла ў схованку на дзедаў млын.
Дзед моўчкі захінаў нас
ад нягоды,
Аберуч ласкава нёс у сховішча
дзіця,
А я плялася вінавата воддаль
І праклінала кожны час жыцьця,
Сваю спакуслівую маладосьць і
вабнасьць,
Безабароннасьць бабская
засьценка,
Варожую бязьлітасную
прагнасьць
І кожны выбух родавага енка.
...Мінула зьлыбяда. Мужы
прыйшлі дахаты,
Уратаваўшы ад навалы сьвет.
Мой сын, міжвольны грэх,
мой гарлапан заціаты
Зь пялёнак вырас нежк
неўпрыкмет.
І я пачула з баязьлівым
трапятаньнем,
Як слова "бацька" ён сказаў
упершыню
Салдату рускаму, а той з
замілаваньнем
Шчасьліва ўзьняў майго
сыночка ўвышыню;
Зусім як дзед, аберуч і пяшчотна
Панёс каханы сына у жыцьцё.
І я ўжо больш ня плакала гаротна
І не вярталася ў думках
ў небыцьцё.

ЗЯМЛЯ

Узьдыбілася перад чорнаю
навалай,
Замерла, нібы зьвер перад
скачком.
Перамагчы – было тады
галоўнай справай,
А як з ваўкамі, калі не ваўком?!
А потым, калі прамінула ліха,
Зьнявечаная гордая Зямля,
З палёгкай уздыхнуўшы, ціха-ціха
Заплакала, нібыта немаўля.

СКАЖЫ МНЕ, ЯК ТЫ СТАІШ І СЯДЗІШ...

Ці ведаеце Вы, што становішча Вашых ног, незалежна ад таго, сядзіце Вы ці стаіце, дазваляе меркаваць пра некаторыя ўласьцівасьці Вашага характару, тэмпэрамэнту і асабовасьці? Каб даведацца пра гэта, уважліва вывучыце малюнак 1 і прачытайце наступныя сьцьверджаньні.



1. Вы ўраўнаважаная, практычная, цярплівая. Усе прызнаюць, што Вы адданая й шчырая ў сяброўстве. Некаторая халоднасьць у вонкавым абліччы часам перашкаджае Вам нападзіць стасункі з навакольнымі (мал. 1а).

2. Вы любіце быць у цэнтры ўвагі. У Вас актыўны тэмпэрамэнт, Вы ведаеце, чаго хочаце, і дамагаецеся гэтага. Вашая інтэлігентнасьць і моцны характар выяўляюцца ў тым, што Вы праяўляеце гнуткасьць і неабходную цьвярозасьць у меркаваньнях. Упэўненая, Вы ня схільная да пакорлівасьці й жадаеце ўладарыць (мал. 1б).

3. Вам цяжка адмовіцца ад ажыцьцяўленьня якога-небудзь намеру ці ідэі. Аднак будзьце асьцярожнай, бо цьвёрдасьць характару можа пашкодзіць Вам, калі Вы ня зможаце быць гнуткай у стасунках з навакольнымі (мал. 1в).

4. Вы славалюбная й часта нецярплівая ў ажыцьцяўленьні сваіх задумаў і плянаў. Азартны, лёгка ўзбуджальны тэмпэрамэнт пабуджае Вас да прадпрымальнасьці. Энэргічнасьць і дынамізм — вось Вашыя казыры, але трэба час ад часу стрымліваць свой тэмпэрамэнт (мал. 1г).

5. Такое становішча ног асабліва часта сустракаецца ў жанчынаў вельмі стрыманых, недастаткова ўпэўненых у сабе і нават нерашучых. Такія рысы могуць выклікаць павышаную цікавасьць да жанчыны. Можа быць, Вас лічаць занадта складанай натурай. Дзякуючы сваёй прывабнасьці й такту вам удасца дамагчыся, каб Вас правільна ацанілі (мал. 1д).

6. Незалежна ад таго, якую нагу вы кладзеце зьверху, Вы ўпэўнены ў сабе. Жанчына, якая ўмее жыць і выкарыстоўвае гэтае ўменьне — вось што Вы сабой уяўляеце (мал. 1е).

7. Вы шчырая, сумленная, і таму Вашая непасрэднасьць не раздражнее навакольных. Вам уласьцівыя такія якасьці як дакладнасьць, мэтадычнасьць, пэдантызм, прыроджанае імкненьне да парадку, што мяжуе часам з маніяй. Вонкава Вы выглядаеце крыху халаднаватай, але гэта зманлівае ўражаньне. У Вас запатое сэрца (мал. 1ж).

8. Вы стрыманая й замкнёная, займаеце чакальную пазыцыю і найчасьцей абараняецеся. Вы няздольная вытрываць нават найменшага папроку, настолькі ў Вас звышадчувальная натура. Навакольныя баяцца Вашых рэакцыяў і пазьбягаюць размоваў з Вамі. Гэты брак кантактаў спараджае ў Вас пачуцьцё ізаляванасьці (мал. 1з).

9. Вы вельмі нерашучая, празьмерна патрабавальная, што засмучае Вас, але Вы нічога ня можаце з сабою зрабіць. Пазьбягаеце людзей і часта бавіце час у самоце. Тым ня менш Вы гэтак тонка разьбіраецеся ў сабе і ў людзях, што можаце даць вельмі дакладны аналіз. Схільная пераацэньваць свае здольнасьці (мал. 1і).

10. У Вас уладарная раўнівая натура. Вы любіце заўжды і ва ўсім быць першай, дамінаваць над навакольнымі, з Вамі нялёгка. Што датычыцца магчымых зьменаў, асабліва ў Вашым асабістым жыцьці, тут Вы праяўляеце нерашучасьць (мал. 1к).



А вось яшчэ меркаваньне псыхолягаў пра характар жанчыны ў залежнасьці ад таго, як яна сядзіць. Паглядзіце ўважліва на мал. 2.

1. "Душа кампаніі". Калі жанчына аддае перавагу такой энэргічнай позе, яна заўжды ўпэўненая ў сабе. Нават у цяжкія хвіліны пачуцьцё гумару не пакідае яе. Яна жыцьцярадасная, лёгка ўступае ў размову з кожным. З такімі жанчынамі ніколі ня сумна (мал. 2а).

2. "Зануда". Выцягнутыя наперад ногі, адна крыху перад другой, сьведчаць пра несаступлівы, няўжыўны характар. Гэтыя жанчыны лічаць, што яны ведаюць усё, і толькі ў выключных выпадках прызнаюць свае памылкі. Іхная ўпартасьць пераканаць суразмоўцу ў сваёй праўдзівасьці хутка надакучвае. Насуперак гэтаму іхныя аргумэнты нярэдка пераканаўчыя і шмат у якіх пытаньнях пёгка на іхным баку (мал. 2б).

3. "Гаспадыня дому". Сьцісънутыя калені й скрыжаваныя шчыкалаткі выразна паказваюць імкненьне да дасканаласьці. У гэтага кштапту жанчынаў усе рэчы знаходзяцца на сваім месцы, яны ведаюць сабе вартасьць. Кожны пачын у іх даводзіцца да канца, прадуманы ён дасканала, каб пазьбегнуць нечаканасьцяў, якія яны ненавідзяць (мал. 2в).

4. "Эгаістка". Становішча крыжнакрыж у каленях, ногі, высунутыя наперад, і рукі на каленях — тып эгаістычных, самазадаволеных, самазакаханых жанчынаў. Яны імкнуцца прыцягнуць да сябе ўвагу й паказаць сябе разумнейшымі за іншых ва ўсіх пытаньнях. Калі ім гэта не ўдаецца, яны становяцца агрэсіўнымі ці адасабляюцца. Празьмерна цікаўныя (мал. 2г).

5. "Непаседа". Жанчыны гэтага кштапту любяць сядзець на краёчку крэсла, сьцісънуўшы калені. Яны вельмі актыўныя й жыцьцярадасныя. Увесь час хапаюцца за ўсё, не даводзячы пачатае да канца. Занадта нецярплівыя, але затое ўцягваюць ва ўсялякае пачынаньне нават тых, каму тая ці іншая праца не да душы. Увесь дзень у іх мінае ў клопатах, але канца ім не відаць і ў наступныя дні... (мал. 2д).

Так сьцьвярджаюць псыхолягі. І калі нехта зь імі не пагодзіцца, то найперш, вядома, самі жанчыны. Ня варта крыўдаваць на гэты тэст. Праналізуйце самі, ці так гэта.

ПРЭФЭРАНС

ЗАНЯТАК 6

(Працяг. Пачатак у N 5)

Разгледзім прыклады разгульваньня. Дапусьцім, казыр – віны. Першым ходзіць гулец У.

У Пд З
10 вінаў К вінаў Т вінаў

Бітку бярэ гулец З, бо ягонага карта старэйшая. Цяпер ён ходзіць першым:

З У Пд
Т чырваў 8 чырваў 7 вінаў

Гэтая бітка належыць гульцу Пд, бо ягоная карта – віновая сямёрка – старэйшая за туза чырваў (нагадаем, што віны казыр). З ходу зразумела, што ў гульца Пд няма чырваў. Інакш ён бы ня меў права класьці карту іншае масьці пры ходзе ў чырву. Цяпер ходзіць гулец Пд:

Пд З У
Н жалудоў 8 жалудоў К чырваў

Бітку ўзяў ізноў гулец Пд, бо ягоны ніжнік старэйшы. Мяркуючы з ходу, у гульца У няма ні жалудоў, ні казыра (вінаў). Калі ён памыліўся і ў яго ёсьць адна з гэтых масьцяў, ён будзе аштрафаваны. Так адбываецца разгульваньне.

4.Парадак ажыцьцяўленьня разгульваньня

4а.Выпадкі, калі разгульваньне не адбываецца

Разгульваньне ажыцьцяўляецца не заўсёды, таму сьпярша разгледзім тыя моманты, калі яно не ажыцьцяўляецца. Разгульваньне не ажыцьцяўляецца, калі на шасьцёрнай ці сямёрнай гульні віст "сыходзіць за свае" біткі й ніхто віставаць ня згодны. Тады карты скідваюцца і прызнаецца без разгульваньня, што той, хто прызначаў гульню, узяў абвешчаныя, а віставальнік узяў свае (дзьве на шасьцёрнай ці адну на сямёрнай).

Напрыклад:

У Пд З
6 званкоў віст пас
— за дзьве не пярэчу

Разгульваньне не ажыцьцяўляецца. Лічыцца, што гулец У ўзяў шэсьць, а гулец Пд дзьве біткі. Альбо:

У Пд З
7 чырваў пас за адну - не пярэчу

Разгульваньне не ажыцьцяўляецца. Лічыцца, што гулец Пд узяў сем, а гулец У адну бітку. Разгульваньне не ажыцьцяўляецца на васьмёрнай і дзевяцёрнай гульні, калі віставаць ніхто ня хоча, напрыклад:

У Пд З
8 чырваў пас пас

Карты скідваюцца. Лічыцца, што гулец У ўзяў восем бітак.

4б. Разгульваньне пры двух віставальніках

Выпадкі, у якіх разгульваньне не ажыцьцяўляецца, апісаныя вышэй. Ва ўсіх астатніх выпадках ажыцьцяўляецца разгульваньне. Калі вістуюць двое, то разгульваньне пачынаецца адразу пасьля абвяшчэньня другога вісту. Напрыклад:

У Пд З
7 чырваў віст віст

Альбо:

У Пд З
9 жалудоў віст віст

У абодвух выпадках гульцы адразу пачынаюць разгульваньне. Нагадаем таксама, што прызначэньне "шэсьць вінаў" лічыцца аўтаматычна завіставаным. У гэтым разе вістуюць абодва гульцы без абвяшчэньня пра гэта:

У
Пд З 6 вінаў
- -

Разгульваецца шэсьць вінаў. Гульцы У і З вістуюць. Разгульваньне пры двух віставальніках заўсёды адбываецца "насьляпую". Гэта значыць, што ўсе тры гульцы трымаюць карты, каб не пака-заць іх адзін аднаму.

Працяг у наступным нумары

ШАХМАТЫ



1п. Белыя перамагаюць.



4п. Белыя перамагаюць.

2п. Белыя перамагаюць.

6п. Ход чорных. Ці можна ім гуляць Гf4+?

3п. Белыя перамагаюць

6п. Белыя перамагаюць.

Адказы ў наступным нумары

АДКАЗЫ НА ПАПЯРЭДНІЯ ЗАДАНЬНІ

Шахматы

Тлумачэньні:
Кароль — **Кр**;
Гетман (Фэрзь) — **Г**;
Вежа (Тура) — **Вж**;
Вышнік (Слон) — **В**;
Конь — **К**.

1п. 1. Вжg5+! Кр:g5 2. h7 Вжe1+ 3. Кре7 і чорныя здаліся.

2п. 1... Вжh1+! Белыя здаліся з-за 2. Кр:h1 Крg3 і мат непазбежны.

3п. 1. a3! h5 2. Крg3!! h4+ 3. Крh3 Кр:a3 4. c5 a4 5. c6 Крb2 6. c7 a3 7. c8Г a2 8. Гb7+ Крc1 9. Гc6+ Крb2 10 Гb5+ Крc2 11. Гc4+ Крb2 12. Гb4+ Крc2 13. Гa3 Крb1 14. Гb3+ Крa1 15. Крg4! h3 16. Гc2 h2 17. Гc1!.

4п. 1. c7 Вжd6+ 2. Крb5 Вжd5+ 3. Крb4 Вжd4+ 4. Крb3 Вжd3+ 5. Крc2 Вжd4! 6. c8 Вж!! Вжa4 7. Крb3! і зь перамогаю.

5п. 1. f6!! Вжf2+ 2. Крd3 Вжf3+ 3. Крd4 Вжe4+ 4. Кр: d5 Вжe8 5. Вж: h6 Вжf5+ 6. Крd4 Вжf4+ 7. Крc5! Вжe5+ 8. Крb6 Вжe6+ 9. Вжc6. Чорныя здаліся.

6п. 1... Кр:a4! 2. Крb1 Крa3 3. Крa1 b4 4. Крb1 b3! Белыя здаліся.

Забаўкі

1. 1 **2.** 1. **3.** 56.

ЗАБАЎКІ

Задача 1

Падстаўце лічбу, якой не стае

16	**(27)**	**43**
29	**( )**	**56**

Задача 2





Устаўце фігуру, якой не стае

Задача 3

Калі **REPUBLIKAN=108**, тады **DEMOCRAT=?**

Адказы ў наступным нумары

У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 – 5):

Кошты на менскіх рынках: Камароўка (ІНФАРМАТАР №1), рэчавы рынак "Дынама" (ІНФАРМАТАР №2), аўтарынак (ІНФАРМАТАР №3), кошты на кампакт-дыскі (ІНФАРМАТАР №4), кошты на кватэры ў Менску (ІНФАРМАТАР №5).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФАРМАТАР №1), расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФАРМАТАР №2), расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФАРМАТАР №3), расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФАРМАТАР №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФАРМАТАР №1), платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФАРМАТАР №2), дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФАРМАТАР №3). Платнае навучаньне (заканчэньне, ІНФАРМАТАР №4)

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФАРМАТАР №1-5).

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФАРМАТАР № 1-5), тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФАРМАТАР №1-5).

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў блізкага і далёкага замежжа (ІНФАРМАТАР №2); Твае правы, пасажыр (ІНФАРМАТАР №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае спэцыяльнае маркаваньне (ІНФАРМАТАР №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФАРМАТАР №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФАРМАТАР №5)

Здароўе: Перш чым зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць. (ІНФАРМАТАР №4).

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлік на вопратцы. (ІНФАРМАТАР №5)

ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:

Рынак: Рынак у Ждановічах.

Адукацыя: Пасьлядыплёмнае навучаньне ў ЗША.

Спажывец: Пазначэньні на электрапрыборах. Якую гарбату мы п'ем. Часнык панацэя?

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш.



Якое файнае жыцьцё, а я, дурань, хацеў скончыць жыцьцё самагубствам.

Працяг са старонкі 6

вах, — пастанавіў брытанскі суд. 85-гадовы Серафіновіч абвінавачваецца ў забойстве трох габраяў у часе гітлераўскай акупацыі савецкае Беларусі. Ухвалены ў 1991 г. пад націскам габрайскіх асяродкаў закон дазваляе судзіць за ваенныя злачынствы, учыненыя па-за тэрыторыяй Вялікабрытаніі асобамі, якія на час злачынства ня мелі брытанскага грамадзянства.

(gw)

Мода

НАЦІСК З УСХОДУ

У Вільні скончыўся традыцыйны, ужо пяты, фэстываль моды "In Vogue", які ладзіць тут сусьветна вядомы часопіс. На "In Vogue, Vilnius-96", прыехалі кіраўнікі кампаніі, рэдактары часопіса, а таксама дэлегацыі зь Вялікабрытаніі, Італіі, Францыі. Традыцыйна былі прадстаўленыя калекцыі ня толькі з Балтыі, але і з "краінаў СНГ". Сэнсацыяй сталі калекцыі з Украіны. Першае месца занялі А.Петрушэнка і Ю.Зімяцін з Кіева, трэцяе — Р.Мацкевіч з Данецку. Другое месца — А.Бірукоў з Іванава (Расея). Падобна, Усход ўсё ж мае шанцы сысьціся з Захадам. На "In Vogue".

Фэстываль атрымаў надзвычай люксусовую аблямоўку. Не абышлося без банкіраў і палітыкаў. Чэслаў Юршэнас, старшыня Сэйму і адзін з самых прыкметных госьцяў шоў, заўважыў: "Хоць у Сэйму вельмі вялікія правы, але ня ён дыктуе моду ў Літве..."

ГІМН ВЭНЭЦЫЯНСКАГА КАРНАВАЛУ

Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Інжынэр-фартыфікатар Леанарда да Вінчы быў і мастаком, і байкапісцам, кампазытар Агінскі — партызанскім камандзірам, Каліноўскі пісаў вершы. У свае 72 гады геніяльны кутур'е П'ер Кардэн зьдзейсьніў сваю даўнюю мару, напісаўшы гімн вэнэцыянскага карнавалу. "Мне хацелася даць слова старасьвецкім палацам ды каналам Вэнэцыі", — распавядаў маэстра на прэзэнтацыі кампакт-дыску. Ён сам аплаціў усе выдаткі і спадзяецца, што простыя словы і лёгкую мэлёдыю гімну будуць сьпяваць паўсюль — ад Парыжу да Вільні.

Сяргей Харэўскі, Вільня

Сьвет

ВАЕНШЧЫНА. У прэсу прасачылася сакрэтная інфармацыя пра тое, што Расея будуе ны ваенны комплекс. Як паведамляе газэта "Нью-Ёрк Таймс", да яго будуць падведзеныя аўтамабільная шаша ды чыгунка. Амэрыканскія экспэрты лічаць, што гэты комплекс можа мець вельмі шырокае прызначэньне: штаб для кіраваньня ядзернымі сіламі, а можа й завод для вытворчасьці якіх сакрэтных відаў зброі.

Газэта цытуе словы некаторых расейскіх экспэртаў, якія сьцьвярджаюць, што будаўніцтва пачалося яшчэ за Брэжневым. Мяркуючы з маштабаў будаўніцтва, гэта сапраўды нешта важнае і надта дарагое. І адкуль толькі грошы бяруць? Можа гэта тыя нядаўна вылучаныя амэрыканцамі 10 мільярдаў даляраў фінансавай дапамогі?

ВАЛЭНСА. Тэлевізійныя навіны многіх краінаў паказалі, як былы прэзыдэнт Польшчы Лех Валэнса прыехаў на Гданьскую суднаверф, дзе ён калісьці працаваў і працягвае лічыцца электрыкам, каб атрымаць зарплату. Валэнса нават пагражаў вярнуцца на былое месца працы, бо яму "няма за што карміць сям'ю".

Але даведаўшыся, што польскі Сэйм прызначыў яму ды іншым былым і будучым прэзыдэнтам пэнсію, вырашыў больш электрыкам не працаваць. Цікава, што пэнсію для яго "выбілі" нялюбыя ПОРПаўцы. А яшчэ адзін былы прэзыдэнт генэрал Войцех Ярузэльскі наагул адмовіўся ад прэзыдэнцкае пэнсіі. Маўляў, яму хапае і генэральскай. Прэзыдэнцкія пэнсійныя грошы ён вырашыў накіраваць на ўтрыманьне архіву.

ПЭНСІЯ ДЛЯ ПРЭМ'ЕРА. Кітайскі лідар Дэн Сяапін хоць сёньня можа зьвярнуцца да францускіх чыноўнікаў, каб атрымаць францускую пэнсію. Паколькі з 1921 да 1923 году ён працаваў у розных францускіх кампаніях, то, паводле францускага заканадаўства аб працы, яму налічваюць адпаведную пэнсію.

ЗАРОБАК ПРЭЗЫДЭНТА. Прэзыдэнт ЗША Клінтан паведаміў пра памеры сваіх даходаў за 1995 г. Заробак склаў 316.074 даляры. У якасьці падатку Клінтан заплаціў у фэдэральную скарбонку 75.437 даляраў. Паводле сваіх даходаў амэрыканскі прэзыдэнт належыць да так званай вышэйшае сярэдняе клясы. Таго ж палёту і віцэ-прэзыдэнт ЗША Эль Гор. Ягоны даход разам з ганарарам за кнігу "Зямля ў раўнавазе. Экалёгія і чалавечы дух" склаў за мінулы год 235.975 даляраў.

СЭКТА. У Расеі сумнавядомую сэкту "Аум Сінрыкё" зьмяніла яшчэ больш небясьпечная "Брахма Кумарэс". Гэтая сэкта марыць зьнішчыць усе іншыя рэлігіі ды ўзьняць свой сьцяг над маскоўскім Крамлём, амэрыканскім Белым Домам і будынкам ААН.

Цэнтар арганізацыі знаходзіцца ў Індыі, а філіі раскіданыя ва ўсім сьвеце. У сваіх лекцыях прапаведнікі "Брахмы Кумарэс" старанна ганьбяць Ісуса Хрыста, будызм ды іслам. Асноўны патас лекцыяў — пагарджаць і перасьледаваць усіх, хто ня зь імі. Вучням абяцаюць, што ў канцы вялікага шляху яны будуць жыць у раі, сярод золата ды слугаў. Астатняе ж насельніцтва зямлі будзе зьнішчанае. Адзін былы ўдзельнік сэкты сомольской Правды" і распавёў пра тое, што робіцца ў гэтай рэлігійнай арганізацыі. Але свайго імя не назваў, бо яму пагражалі, што за адступніцтва яго знойдуць ды сурова пакараюць.

МАХЛЯРЫ. Фінансавыя фірмы-махляры ёсьць і ў Нямеччыне. У Гановэры арыштаваныя кіраўнікі фірмы "Плюс канцэпт". Яны абяцалі высокія працэнты на ўкладаньні ды выгадныя зьдзелкі. Ім паверылі й даверылі свае грошы (болей за 300 млн. марак) блізу 25 тыс. укладальнікаў. Гэтак жа падманвала немцаў і мюнхенская фірма "Нафтавае таварыства", якое выпампавала з кліентаў 126 млн. марак. А фірма "Амброз" з Дуйсбургу намахлярыла 230 млн. марак. Дурылі ўкладальнікаў гэтаксама, як і ў нас, працуючы паводле прынцыпу піраміды. Але ў ФРГ, у адрозьненьне ад нас, за такія злачынствы можна атрымаць да 10 гадоў турмы.

БАНДЫ. У Расеі існуе блізу 5,7 тыс. злачынных груповак з агульнаю колькасьцю хаўрусьнікаў болей за 100 тыс. чалавек. Болей за 300 расейскіх крымінальных арганізацыяў маюць трывалыя міжнародныя сувязі. Аб'ём звароту "ценевай" эканомікі Расеі параўнальна складае недзе 40-50% валавага нацыянальнага прадукту краіны. За апошнія некалькі гадоў за мяжу было перапраўлена каля 40-50 мільярдаў даляраў. Аб'ём перапампоўваньня валюты за межы Расеі ацэньваецца ў 12 мільярдаў даляраў штогод.

Гэткія зьвесткі падаў прэсе Фэдэральны дэпартамэнт юстыцыі і паліцыі Швэйцарыі. Тут была ўтвораная адмысловая сьледчая група, куды ўвайшлі прадстаўнікі пракуратуры ды паліцыі. Праўда, за свае ўклады ў швэйцарскія банкі расейская мафія можа не турбавацца, бо таямніца ўкладаньняў застаецца па-старому надзейная.

АСАХАРА. У сераду распачаўся судовы працэс над заснавальнікам і кіраўніком японскае сэкты "Аум сінрыкё" Сёка Асахара. Суд пацьвердзіў удзел сэкты ў шэрагу сплянаваных забойстваў, вырабе зброі, наркотыкаў ды атрутных рэчываў. Даказаны таксама ўдзел хаўрусьнікаў сэкты ў тэрарыстычных актаў з выкарастаньнем баявога атрутнага газу зарыну ў такійскім мэтро. Суд над Асахарам нагадвае хутчэй спэктакаль, чымся акт правасудзьдзя. Бо патрапіць на слуханьні можна толькі пры наяўнасьці адмысловага квітка. На 48 наяўных "глядацкіх" месцаў у залі суда прэтэндавала ажно 12 тыс. чалавек. Дзеля гэтага давялося правесьці адмысловую лятарэю, дзе разгуляліся гэтыя 48 квіткоў.

МІНЫ. У Жэнэве распачаўся чарговы раўнд канфэрэнцыі ААН аб забароне вытворчасьці ды выкарыстаньні супрацьпяхотных мінаў. Прапануецца абвесьціць іх антыгуманным відам зброі. Бо асноўнымі ахвярамі іх штогод становяцца 26 тыс. чалавек, пераважна мірнага насельніцтва. 30% ад гэтае колькасьці — дзеці. Іх канструкцыя разьлічана не на тое, каб забіваць, а каб калечыць і псыхічна дэмаралізоўваць супраціўніка. Кожныя 30 хвілінаў у сьвеце на такіх мінах падрываецца адзін чалавек. На сёньняшні дзень гэтыя міны расьсяваюцца на вялікіх плошчах проста з самалётаў, і нэўтралізацыя іх можа расьцягвацца на многія гады. Штогод закладаецца блізу 2-5 млн. такіх мінаў. Дзеля поўнага зьнішчэньня іх спатрэбіцца болей за 1000 гадоў. Гэта пры ўмове, што ўсе краіны падпішуць дамову аб іх поўнай забароне. Асноўнымі супраціўнікамі такой дамовы застаюцца Расея й Кітай.

Музыка

НЯСПЫННЫ КРОК

Новае Неба. Go Home. — Менск: "Ковчег", 1995.



Бывае дастаткова вымавіць тры словы, каб чалавек зрабіўся пэрсонай нон грата для ўласнай дзяржавы. Можа хапіць трох словаў, каб чалавека сталі асьцерагацца нядаўнія прыхільныя знаёмцы. Для Касі Камоцкай такімі словамі сталіся "Прэзыдэнт, ідзі дамоў", — назва й рэфрэн першай песьні альбому "Go Home". Пасьля "Дзяцей чорнага гораду", "НН" і "Сна ў трамваі", гэты альбом "Новага Неба" наймենш цэльны паводле сваёй структуры. Эстэцкая патасная песьня "Прэзыдэнт, ідзі дамоў" і падлеткавая пранікнёная "Выгнаны сын" відавочна кантрастуюць з астатнімі шасьцю кампазыцыямі праз сваю музычную немудрагелістасьць. Да таго ж альбом мае "дабіўку" з старых кампазыцыяў, выкананых на канцэрце ўвесну 1995 году.

Часам патас мае права на першае месца. Мы пасьпелі забыцца на патас, але ён зрабіўся вымушана-неабходны. Песьня "Прэзыдэнт, ідзі дамоў" здолела двойчы прагучаць на другім канале дзяржрадыё ў першай палове 1995. Яна выклікала воплескі шмат на якіх канцэртах. Яе словы цытавалі некаторыя беларускія й замежныя газэты. Яе падпявалі 24 сакавіка каля Опэрнага тэатру. Чаму, нягледзячы на прастату мэлёдыі, яна зрабілася хітом? Магчыма, таму, што тэкст зроблены паводле матываў сучаснага менскага гарадзкога фальклёру. Аўтар большасьці астатніх тэкстаў "Go Home" — Міхал Анемпадзістаў. Цяпер яго можна назваць уласным тэкставікам "Новага Неба". Гурт рыхтуе да запісу новы "Народны" альбом, які будзе зроблены цалкам на вершы Міхала. Адну песьню з гэтага альбому — "Дарагія маі масквічы" — можна было паслухаць на мітынгу ў Дзень Волі. Тады шмат людзей адчула, што ад патасу да сьцёбу — адзін крок. Яго ня трэба спыняць, "каб ня ўмерці".

Севярын Квяткоўскі

"НАЙЛЕПШЫЯ" Й "РАЗУМНЫЯ" РЭЧЫ "НЭЙРАДЗЮБЭЛЯ"

Нейродюбель. Умные вещи. The Best. — Менск: Magic, 1995.

Шчырасьць, прастата й працавітасьць — вось тры характарыстыкі, якія азначаюць творчы шлях менскага рок-гурта "Нэйрадзюбэль". "Будь проще, и к тебе потянутся люди", — у дадзеным выпадку гэтая небясспрэчная мудрасьць працуе "на ўсе сто". Прэзэнтацыю гэтага альбому, што адбывалася ў Альтэрнатыўным тэатры, "дзюбэлі" прымеркавалі да сьветлага сьвята савецкае касманаўтыкі. Гэта цалкам лягічна, паколькі гурт зьяўляецца прадстаўніком той плыні ў рок-культуры, якая вызнае эстэтыку сьцёбу з "саўка". Наўрад ці чатырнаццацігадовы прадстаўнік "новага пакаленьня" можа да канца "ўрубіцца" ў "прыкол" сьвята 12 красавіка, але за апошнія два гады яму далі магчымасьць адчуць што такое сапраўдны "савок". Пэўна, ня толькі для маладзёнаў сьвежа прагучалі такія хіты, як "Буду б... тоска", "Петрова, подай воды", "Беларусь убер алес", "Боже, покарай Англию", "О.К.(О.В.)"...

Паводле падлікаў аўтараў, "у альбоме было выкарастана трыццаць адно нецэнзурнае слова, невымерная леньне беларускай зямлі". Нардычна-агрэсіўная музыка "Нэйрадзюбэля" дае цудоўную магчымасьць для выплеску адмоўнай энэргіі. Эфэкт асабліва поўна дасягаецца падчас канцэртаў, якія лідар гурта Саша Кулінковіч ім-кнецца пераўтварыць у змрачнаватыя хэпэнінгі.

Дзейнасьць "Нэйрадзюбэля" ў менскім рок'н'ролс унікальная. Асабіста мне дзіка чуць матывы расейскіх народных песень "у найлепшых творах" гурта. На што на што, а "на ўсход" нашыя сталыя рокеры ніколі не хварэюць. Нягледзячы на гэта, трэба аддаць належнае панкавым шчыраваньням "дзюбэляў". Працуюць яны пісьменна й на ўсю катушку. Як кажа мая знаёмая супрацоўніца радыё, галоўнае, каб слухачам было цікава.

Севярын Квяткоўскі

НА ШЭРЫМ ВІНІЛЕ

Дзякуючы незалежнай кампаніі Tian An Men 89 Records, першы беларускі андэграўндны калектыў выпусьціў кружэлку на Захадзе. Кружэлка гомельскага гурта "Мандраж" зьявілася ў Страсбургу і ўвабрала ў сябе шэсьць бадзёрых кампазыцыяў леташняй панк-эўфарыі. Уражваюць ужо назвы песень: "Мясакамбінат", "Контррэвалюцыя-1", "Як я Вас ненавіджу". Зрэшты, гэты гомельскі гурт, які цяпер выразна прагрэсуе, ужо вядомы сваімі жывымі панк-шоў і скрайнімі нігілістычнымі поглядамі.

Дакумэнтальны фільм "Шабаш сатаны", зьняты пецярбурскай тэлевізіяй пры ўдзеле "Мандража" каля году таму назад, стаў пачаткам скандальнай вядомасьці нашых землякоў. Сёньня выступы гурта ўвесь час здымаюць на відэа. Апошняе дасягненьне гурта — зьяўленьне на дзяржаўнай тэлевізіі ў перадачы "Крок". На радыё іх не пускае цэнзура.

"Мандраж" паводле прыроды сваёй апалітычны, але на кожным выступе нязьменна бянтэжыць прадстаўнікоў бамонду і ўладаў нецэнзурнай лаянкай на адрас Чаўшэскі і кампаніі. На апошнім канцэрце вакаліст Diamond прадставіў увесь букет непрыстойнасьцяў аж да публічнай мастурбацыі і спаленьня бібліі для дзяцей. Міліцыя так і не адважылася падняцца на сцэну. Басіст Кузя разламаў сваю гітару, а сола-гітарыст Ястраб даў пагаліць сябе на сцэне нагала пад шумныя воклічы натоўпу.

Гурт вядзе актыўную канцэртную дзейнасьць. 21 красавіка ў менскім панк-клюбе "Касмапалітэн" прадстаўлены новы альбом пад рабочай назвай "Скрадзена, задушана, сьпешна закапана", а да гадавіны чарнобыльскай аварыі падрыхтаваны яшчэ адзін альбом — "10 гадоў аргазму".

Алена Паўлава, Гомель

P.S. Калі Вас цікавіць творчасьць гомельскіх панкаў, Вы можаце затэлефанаваць ім у Гомель: (0232) 45-39-65, 52-69-65.

Валянцін Калнін

MAESTRI COMACINI

ІТАЛЬЯНСКІЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ



Шлях да Італіі

Напачатку быў Пэпэ, герой зь нізкі "Казак пра Італію" М.Горкага — гарэзьлівы італьянскі хлопчык, парушальнік мяшчанскае добрапрыстойнасьці. На яго прыкладзе нам, дзецям апошніх сталінскіх гадоў, даводзілі, якое цяжкае жыцьцё выпадае аднагодкам у капіталістычным сьвеце.

З Італіяй мне пашэнціла ў тым жа дзяцінстве яшчэ раз. I ўсё праз тое, што я затрымаўся перад дзьвярыма свае кватэры, ня маючы ключа. Суседка зьлітавалася й запрасіла да сябе. Здаецца, была яна спартоўка, удзельнічала ў адным зь першых за хрушчоўскія часы нашых спаборніцтваў за мяжой, але пра спорт тады размовы не было. Былі здымкі, была Вэнэцыя: пляц Сьв. Марка, галубы, што карміліся з рук (для нас яшчэ дзіва!), палац Дожаў, нейкі кляштар з падлогаю, выкладзенай чалавечымі чарапамі... Быў яшчэ чарнявы італьянскі хлапчук, які стала ўвіхаўся каля нашае дэлегацыі, каб сфатаграфавацца разам: "Мой адбітак паедзе ў Савецкі Саюз? Значыцца, я сам буду ў Савецкім Саюзе?"...

Сёньня я лічу за лепшае бадаваць сваю Італію ва ўласным доме. Матэрыялу хапае — варта толькі зварушыць.

Пячора

Італьянскіх зьяўленьняў у Беларусі нямала. На XVII ст. прыпадае блізу сарака выяўленых прозьвішчаў майстроў мураваньня, разца ды пэндзля, што працавалі ў адной толькі Вільні. Многія зь іх пакінулі след і на сёньняшняй нашай тэрыторыі. Праўда, ня раз з боку прыбышоў гучалі крытычныя заўвагі наконт нашага краю й ягоных звычаяў. Так, у 1582 г. езуіцкія пасланцы з Рыму, што прыехалі ў Нясьвіж з мэтаю закладаньня тут калегіі, назвалі гэтае месца "спэлюнкам" (ад лацінскага "spelunca" — пячора). Толькі дзякуючы намаганьням Радзівіла Сіроткі Нясьвіж быў пераўтвораны ў горад эўрапейскага кшталту і езуіцкі калегіюм з касьцёлам нарэшце паўстаў. Іншым разам, ужо ў 1704 г., пры будаўніцтве езуіцкага касьцёлу ў Горадні мясцовы майстар муляраў Тамаш Пярсіцкі скардзіўся вышэйшай уладзе: "Валох, што прыехаў пры мураўцы касьцёла, пачаў ганіць..."

Яшчэ адзін прыклад з канца XVIII ст. Тады вельмі плённа працаваў у Беларусі архітэктар Карла Спампані. Ён прыехаў сюды ў 1774 г. з Рыму яшчэ зусім маладым, 24-гадовы; за дзевяць гадоў запраектаваў і ажыцьцявіў шмат пабудоваў, пераважна палацавых, з багатым клясыцыстычным аздабленьнем. Яму дапісваюць палацы ў Заслаўі ды Сёмкаве пад Менскам, у Радзівілімонтах пад Клецкам, у Шчорсах пад Навагарадкам. Ён меркаваў назаўсёды застацца ў нашым краі, прыглядзеў сабе маёнтак і прапанаваў маці перабірацца з Рыму на новае месца. Маці адмовілася. Праз тры гады Карла Спампані раптоўна памёр, дасягнуўшы ўсяго толькі ўзросту Хрыста. Магчыма, менавіта адмова маці паскорыла ягоную сьмерць. Здаецца таксама, што ня стан здароўя быў галоўнаю прычынай матчынай адмовы, але перадчуваньні. Бо хутка, пасьля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, усё зьмянілася. Паводле ўспамінаў Евы Фялінскай, якая часта наведвалася ў тыя гады ў радзівілімонтаўскі палац, збудаваны тым жа Спампані, тут замест ранейшых пышных баляў цяпер спраўлялі імшы па памерлых: "Зьбіраліся як на могілкі... Адчувала, што гэта былі апошнія промні вечаровага сонца".

Першыя плыні

Калі я толькі падступаўся да напісаньня пра мастацкія італьянізмы ў Беларусі, то ня надта спадзяваўся знайсьці штосьці больш вартае за тое, што ўжо знойдзена й вядома. Мала засталося пабудоваў, бальшыня зь іх перароблена ці загінула. Звычайна зь дзьвюх бажніцаў, што традыцыйна сустракаюцца на старых рынкавых пляцах гарадоў ды мястэчак Беларусі, ахоўны статус мелі найперш праваслаўныя, хоць будаваліся альбо грунтоўна перарабляліся са старых касьцёлаў сотню-паўтары гадоў таму і мелі ўнутры толькі пару літаграфічных абразоў. Тым самым часам каталіцкія бажніцы, што на працягу стагодзьдзяў аздабляліся скульптурамі, творамі долата й пэндзляў эўрапейскіх ці мясцовых майстроў, у большасьці не атрымоўвалі ад камуністычных уладаў ахоўных лістоў. Нават у 70-я гады — найбольш плённыя для рэстаўрацыі нашае спадчыны — у "родным" міністэрстве культуры мне даводзілася чуць разважаньні ягоных кіраўнікоў наконт таго, што "занадта многа захавалася гэтых касьцёлаў". I ня мела сэнсу даводзіць, што ўзводзілі тыя будынкі мясцовыя майстры, што аўтарамі праектаў ці кіраўнікамі былі таксама нашыя супляменьнікі альбо знакамітыя дойліды з Італіі, Францыі ці Нямеччыны. Пра ўсё гэта нашыя кіраўнікі ведалі, ведалі нават і пра тое, што культавыя пабудовы Беларусі, асабліва XVIII ст. — гэта цудоўныя, больш таго, унікальныя помнікі архітэктуры барока. Толькі простаму народу пра гэта ведаць не дазвалялася.

Аднак вернемся да тэмы.

Першае зьяўленьне мастакоў-італьянцаў зьвязана з мэцэнацтвам Жыгімонта Старога пры вялікакняскім двары ў Вільні. Гэта — другая чвэрць XVI ст. Праз Кракаў сюды прыяжджаюць архітэктары ды мастакі: пластык Джавані Джакоба Каральё з Вэроны, архітэктары ды скульптары Джавані Марыя Падавана з Падуі, Бэрнардына Занобі да Джаноці з Рыму й Джавані Чыні з Сьены, садоўнік Гартуліяна. У рэнэсансавым стылі выконваліся надмагільлі, рэканструяваліся фасады касьцёлаў ды паркі каля вялікакняскага палацу. Джаноці й Чыні засталіся жыць у Вільні. На тэрыторыі сучаснае Беларусі водгукі ад гэтага мэцэната пакуль невядомыя, можна казаць толькі пра першы італьянскі павеў. Аднак ужо напрыканцы таго ж XVI ст. назіраецца ня толькі зьяўленьне, але цэлы вадаспад італьянізму на нашу зямлю.

Дасланы з Рыму архітэктар-езуіт Ян Марыя Бэрнардоні правёў у Нясьвіжы трынаццаць гадоў. Акрамя касьцёла ды калегіі яму прыпісваецца, можа, не зусім слушна, яшчэ некалькі пабудоваў па-за Нясьвіжам, аднак сутнасьць ня ў гэтым. Галоўнае тое, што Нясьвіж стаўся пачаткам ня столькі вадаспаду, колькі цэлага італьянскага каскаду. Бэрнардоні не абмяжоўваўся выключна будаваньнем, але навучыў архітэктуры менскага пекара Яна Франкевіча. Навучыў гэтак выдатна, што апошні самастойна кіраваў узьвядзеньнем касьцёла Казімера ў Вільні ды ў сваю чаргу выхаваў двух здатных вучняў, таксама пекараў — Марціна Выборскага з Полацку і Яна Шымковіча з Кейданаў. Першы кіраваў будоўлямі езуіцкіх касьцёлаў у Ломжы ды Варшаве, другі — узьвядзеньнем калегіі Сьв. Яна ў Вільні.

Напэўна, было яшчэ некалькі італьянскіх прозьвішчаў канца XVI ст., нам пакуль невядомых, зьвязаных зь Нясьвіжам. Варта згадаць хоць бы надмагільлі ды алтары мясцовага касьцёла. Беларускія дасьледнікі імі не займаюцца — няма ні часу, ні сродкаў. Усё, што знойдзена і тут выкладзена, паходзіць найперш з польскай, часткова літоўскай, спэцыяльнай літаратуры.

Першы італьянскі штуршок ня стаўся ў Нясьвіжы трывалым. Пазьней Радзівілы ўважалі за лепшае абыходзіцца другаснымі, таньнейшымі замежнікамі ды саматужнымі майстрамі мясцовага паходжаньня. Адсюль своеасаблівы правінцыялізм радзівілаўскага мастацтва ў Беларусі, цяжкі для вызначэньня стылёвых катэгорыяў, аўтарства, датаваньня.

Зусім інакш атрымалася зь вялікаможным мэцэнацтвам іншага знакамітага роду — Сапегаў. Пасьлядоўныя заходнікі, яны заўжды імкнуліся да самастойнасьці тагачаснай Літвы. Аб сапежынскім мэцэнацтве дастаткова меркаваць з Ружанаў — ёсьць там рэшткі іхнай галоўнай сядзібы ў Беларусі. Нават у зруйнаваным выглядзе яны выклікаюць самавітае ўражаньне — беларускі Вэрсаль! Кожнага разу палацавы ансамбаль радыкальна перарабляўся ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі новага эўрапейскага стылю. Ёсьць шмат падставаў сьцьвярджаць, што ў пераўтварэньнях рэй вялі выключна замежнікі, пры гэтым даволі высокага кшталту. Напрыканцы XVI ст., падчас заснаваньня ружанскага ансамблю, відавочны ўплыў вядомага архітэктара і скульптара флярэнтыйца Санці Гучы, які працаваў у стылі маньерызму. Ня выключаная яго асабістая прысутнасьць у Ружанах, бо вядома, што Гучы ўдзельнічаў у перабудове Старога Замку ў Горадні падчас знаходжаньня там караля Стэфана Батуры. Дарэчы, праект рэканструкцыі Старога Замку выканаў таксама італьянец, мала яшчэ вядомы Скота з Пармы.

Да сярэдзіны XVII ст. ружанскі палац набывае рысы сталага барока. Згодна з пазьнейшым падрабязным апісаньнем, унутранае аздабленьне вызначалася асаблівым багацьцем: у кабінэце "дзьверы з мармуровым парталам, з гербамі з алябастру, мармуровы камінак, мармур на падлозе і пад вокнамі... У тым самым пакоі на стол ўгары — выявы розных каралёў у пазалачоных гіпсовых рамах, выявы розных гарадоў у пазалачоных рамах".

Захаваліся разьлікі 1649 году за працы ў ружанскім палацы. Сярод іх "Даніэлю мастаку за выкананьне трох партрэтаў і заканчэньне структуры ў пакоі Ягамосьці — 200 злотых". Ягамосьцем быў Казімер Лявон Сапега, падканцлер літоўскі, наглядзорца каралеўскіх мастакоў у Вільні. Згаданым Даніэлем, напэўна, быў знакаміты мастак Шульц з Гданьску. Тым самым часам Сапега закладае кляштар картузаў у блізкай Бярозе. У вядомых зьвестках прозьвішча творцы няма, адно толькі гаворыцца, што быў ім дасланы з Варшавы "ingeniosus Italus" — "майстэрскі італьянец". Такім на той час быў выхадзец з Рыму Джавані Батыста Джысьлені. Фасад кляшторнага касьцёла (разабраны ў мінулым стагодзьдзі) цалкам стасуецца да фасадаў іншых пабудоваў майстра. Ягонае дачыненьне да Ружанаў ды Бярозы тым больш верагоднае, што праз тры гады той самы Джысьлені, у дадатак выдатны скульптар, выконвае надмагільле для памерлае жонкі Сапегі Тэадоры Крыстыны ў віленскім касьцёле Сьв. Міхала.

У часе "Патопу" Джысьлені зьяжджае назаўсёды з Рэчы Паспалітай у родны Рым. Але на гэтым ягоны ўплыў на нашу культуру не сканчаецца. Магчыма, што менавіта ён параіў свайму вучню Аўгустыну Вічэнца Лёчы не заставацца ў Рыме ды вяртацца па практыку ў Варшаву, дзе той нарадзіўся. На доўгія гады Лёчы быў зьвязаны з будоўляй каралеўскага палацу ў Вілянаве, але меў магчымасьць зьвяцца і ў Нясьвіжы. Тут у замустве за Радзівілам была родная сястра караля Яна Сабескага Кацярына. Для нясьвіскага палацу Лёчы ў 1682 годзе праектуе галерэю. Мабыць, ён жа займаўся аднаўленьнем Мірскага замку, разбуранага ў часе маскоўска-



казацкай навалы.

Варта затрымацца яшчэ на прафэсійным навучаньні тых часоў. Ніякай сыстэмы ў гэтым

тады не йснавала. Адзначаны вышэй прыклад Яна Франкевіча й яго вучняў — не выключэньне для таленавітых асобаў, але звычайная практыка. Але здараліся выпадкі больш сур'ёзнае падрыхтоўкі. Напрыклад, вядома пра высланьне ў Італію па малярскую навуку Вікенція Харлінскага (альбо Карлінскага) зь Бярозы за кошт тутэйшага кляштара картузаў. Аднак панаваў пакуль рамесьніцкі спосаб навучаньня. Праўда, ужо з другой паловы XVI ст. у кнігазборах беларускіх магнатаў меліся трактаты Вітрувіё, Сэрліё, Паладыё. Часам карысталі зь іх архітэктары, будаўнікі, але галоўнае значэньне гэтай літаратуры было ў выхаваньні густу замоўцы, у засваеньні ім высокага італьянскага стылю. Толькі напрыканцы XVII ст. езуіты пачынаюць выкладаць архітэктуру ў сваіх калегіях.



Maestro мой родны

Яшчэ адна праява італьянізму: стукавае скульптурнае аздабленьне інтэр'ераў. Ужо згадваўся кабінэт у Ружанах, такіх прыкладаў у бажніцах ды палацах было шмат. Сёньня засталося толькі два — у касьцёле аўгустынаў у Міхалішках і ў гарадзенскім касьцёле бэрнардынаў. Першы зьвязаны зь імем Джавані Пэтра Пэрці, выканаўцам сусьветнавядомага стукавага ўбраньня касьцёла Пятра й Паўла на Антокалі ў Вільні. У беларускіх даведніках Пэрці чамусьці значыцца флярэнтыйцам. Між тым вядомы польскі навуковец Мар'ян Карповіч даводзіць, што згаданы майстра быў толькі зяцем мастака-флярэнтыйца Міклянджэла Палёні, а сам паходзіў з ваколіцаў Мэндрысіё ў швэйцарскім кантоне Тычына (Ticino). Гэты кантон, населены італьянцамі, датыкаецца да італьянскай правінцыі Кома. Менавіта адсюль паходзіць большасьць муляраў і дэкаратараў, якія распаўсюджвалі дасягненьні архітэктурнага рэнэсансу й барока ў Эўропе. З-пад Кома паходзіў таксама Я.М.Бэрнардоні.

Зь вялікімі цяжкасьцямі ў Кіеве пашэнціла знайсьці мне падрабязную мапу Італіі з роднай мясцовасьцю нясьвіскага майстра на ёй — Каньё (Cagno). З даведнікаў дазнаюся, што тут і ў ваколіцах цяпер — каля паўтары тысячы жыхароў, асноўны занятак — вырошчваньне збожжа. Напачатку, уявіўшы магчымае наведваньне мясціны, перадчуваў завочнае расчараваньне ад сустрэчы з банальнаю рэчаіснасьцю. Але, дзякуй Богу, мяне апярэдзіў прафэсар М.Карповіч. Ён быў уражаны тым, што тут "кожны касьцёльчык, кожная каплічка і кожны стары дом дагэтуль захоўваюць мноства аздобаў, якія майстры пасьля цяжкіх вандровак выконвалі часьцей задарма як ахвяраваньне для касьцёла, сяброўскі падарунак для суседа, альбо аздобу роднага дому".

Пра майстроў з-пад Кома і іхныя працы ў Эўропе існуе шматлікая літаратура, вызначаны асобны кірунак у мастацтве, ініцыяваны іхнаю творчасьцю. Яны вядомыя яшчэ ад раньняга сярэднявечча як выдатныя муляры ды каменячосы, якія здавён карысталіся складанымі мэханізмамі. Гэта пра іх гаворыцца ў італьянскай прымаўцы: "maestri con macchini — maestri comacini" (майстры з машынамі — майстры з-пад Кома). Польскія дасьледнікі мянуюць іх "komeski". У нас падобнага вызначэньня няма. Таксама, як няма ў бібліятэках літаратуры пра мастацтва паўночнай Лямбардыі, дзе знаходзіцца правінцыя Кома. Ёсьць безьліч кніг ды альбомаў пра выдатных майстроў Рэнэсансу, а пра блізкіх да нас творцаў, амаль што крэўных (Пэрці, як і ягоныя дзеці, назаўжды застаўся ў Вільні) — нуль. Таму натуральная адсутнасьць асобнае назвы для згаданае зьявы. Каб запоўніць прарэху, спрабую нешта прыдумаць. Камэскі... камайчыкі... камаі...

Як жа я не згадаў адразу? Мы ж разам вучыліся ў адной клясе менскае школы! Камоска! Рыгор Камоска. Ужо тады, у юнацтве, неардынарная асоба: каржакаватая постаць, дужыя рукі, цьвёрды твар з моцнымі сківіцамі, неўтаймаваная шчотка віхроў. Ён выглядаў малатабойцам як у рухах, так і ў характары —непахісны барацьбіт за справядлівасьць, нават калі ў гэтым не было патрэбы. Пасьля школы працаваў і вучыўся ва ўнівэрсытэце. Незадаволены сыстэмай навучаньня, кінуў навуку і рушыў на паўночную будоўлю бэтоньнікам. Відаць, спадабалася, бо пасьля вяртаньня выступаў з ураженьнямі перад дзецьмі ў школах. На ўзьвядзеньні менскага мэтро згубіў былую моц і адышоў на пэнсію. Уключыўся ў барацьбу за дэмакратыю, але на індывідуальнай аснове. Здаецца, ні да воднага руху не далучыўся.

Цяпер я ўпэўнены, што мой Рыгор — непасрэдны нашчадак выхадцаў з-пад Кома. Усё супадае: постаць ды прафэсія ("maestri con macchini"), неўтаймаванасьць характару ("бунт" Я.М.Бэрнардоні ў Любліне (гл. мой допіс "Вучнёўскі сшытак" у "НН" N18 за 1993 г.)), цяга на поўнач у нязьведаныя краі, нарэшце, прозьвішча Камоска — італьянскі "comasco". Паўночная Італія — наш родны край!

Наступствы

XVII ст. было ў нашым мастацтве скрозь італьянскае. Далей, у XVIII-м, больш зьяўляецца нямецкіх ды францускіх майстроў з асаблівасьцямі сваіх школаў. Чыстага італьянізму трымаюцца, бадай, толькі езуіты, але трымаюцца яго моцна, зацята. На ім грунтуюцца выклады архітэктуры ў калегіях, віленскай акадэміі. Гэтыя вучэльні камплектаваліся звычайна зь мясцовых слухачоў, таму сьпіс творцаў прыгожага значна дапаўняецца яшчэ й беларускімі імёнамі.

Здольныя вучні дасылаюцца ў Італію. Сьцяпан Лускіна, матэматык і астраном, родам з-пад Віцебску, на пачатку 1750-х навучаўся ў Рыме, наведаў Францыю, потым выкладаў матэматыку й архітэктуру ў Варшаве. Беларус Габрыель Лянкевіч, вучань Т.Жаброўскага, напачатку 1760-х быў скіраваны ў Рым, выкладаў архітэктуру ў Полацку, меў шмат здольных выхаванцаў.

Тут можнаназьбіраць цэлую нізку імёнаў дзейных майстроў ды прафэсараў, што выкладалі архітэктуру ў розных кутках Беларусі: Тамаш Жаброўскі з-пад Наваградку, Марцін Пачобут з-пад Горадні, Ян Тадэвуш Кляўс са швэдзкай сям'і з-пад Полацку, Аляксандар Панкрацы Ростан, з французаў, Францішак Кару, нарадзіўся пад Воршай у ангельскай сям'і, Джузэпэ Сака з Вэроны, Мацей Кісялеўскі зь Літвы, Габрыэль Грубэр, славенец зь Вены, Базыль Шляхта з-пад Віцебску, Жаброўскі Андрэй з Паляшша, Каятан Анджаліні з П'ячэнцы, Манцьвет Скакоўскі зь Беларусі, Войцах Абрампальскі з Польшчы.

Наш прадмет выкладалі ў другой палове XVIII ст. амаль ува ўсёй Беларусі: Вільня, Полацак, Горадня, Пінск, Магілёў, Віцебск, Мсьціслаў. Пасьля Вільні асабліва вылучаецца Полацак, дзе архітэктуры навучалі ў 1766-99 гадох.

Становіцца зразумелым і не такім ужо нечаканым нараджэньне так званага віленскага барока, імпульсантам якога лічыцца прыбылы з Сылезіі Ёган Крыштаф Гляўбіц. Дагэтуль спэцыялісты ня могуць прыйсьці да згоды, што да вытокаў ды запазычанасьцяў віленскага архітэктурнага фэномэну. Адны спасылаюцца на прыклады з Чэхіі, Аўстрыі ды Вугоршчыны, некаторыя цягнуць ланцужок аж но з Гішпаніі, трэція зьвяртаюць пошук на італьянскі П'емонт. Мне ж здаецца, што пошукі непасрэдных уплываў ня маюць сэнсу — настолькі сваісты той стыль. Ён распаўсюдзіўся на тэрыторыі, што пераўзыходзіць паасобку палову эўрапейскіх краінаў. Так, вытокі стылю былі, але не канкрэтныя, перанесеныя з вызначаных месцаў. У досьледным памкненьні расшчапіць архітэктуру на асобныя атамы, мы часам забываемся пра творчы настрой тых часоў і людзей, якія гэты настрой стваралі. Там складаўся ўнутраны імпульс, насычаны прафэсійнаю падрыхтоўкай, веданьнем навочна знакамітых, асабліва італьянскіх, прыкладаў, наяўнасьцю свойскіх значных пабудоваў, атрыманым ад прыроды й традыцыі пачуцьцём пластыкі. Гляўбіц трапіў у Вільню акурат у момант, калі ўся маса мясцовага мастацкага патэнцыялу чакала толькі вонкавага штуршку. Гляўбіцу прыпісваецца аўтарства больш сарака пабудоваў, выкананых па розных кутках Вялікага княства Літоўскага на працягу з 1737 па 1767 год. Вызначэньне аўтарства часам фармальнае й наіўнае. Ці не таму, што існавала выдатная архітэктурная школа, імёны прадстаўнікоў якой цяпер цяжка вызначыць?

Выхаваўчы плён той пары на стагодзьдзе, а то й на два ўперад забясьпечыў для нашых гарадоў ды мястэчкаў выкшталцонае й непаўторнае аблічча. Калі параўноўваць адносна, а не напрасткі, то нават паводле колькасьці кваліфікаваных творцаў мы дагэтуль ня вельмі далёка пасунуліся ўперад: яшчэ ў сярэдзіне 1960-х нас, выпускнікоў вышэйшай архітэктуры было па дваццаць на год для ўсяе Беларусі. Італію тады ведалі два ці тры выкладчыкі з двухдзённага бытаваньня ў часе круізнай выправы вакол Эўропы.

Пераступіўшы ў роздуме мяжу часу, з жахам пагля̀даю на сёньняшняе наша жыцьцё. Быццам нічога не было і ад былой культуры нічога не засталося. Цяпер, як тады, за Радзівілам Сіроткам: наш край становіцца нібы "spelunca" — пячора. Спадзявацца на тое, што прыедуць італьянцы і будуць нас ганіць — немагчыма дый сорамна, дачакацца новага Сіроткі —малаверагодна...

А так выпадае толькі трываць і рабіць тое, што можаш. Як трываюць і робяць мае маладыя сябры-рэстаўратары, якім пашэнціла прайсьці практыку ўдасканаленьня ў Італіі. Яны здолелі процістаяць спакусе разьбегчыся па Эўропе на зманлівыя запрашэньні толькі дзеля таго, каб амаль задарма ратаваць старажытныя росьпіс у сябе на Радзіме, каб выцягваць са "спэлюнкі" чарговую ахвяру цемрашальства ды забітасьці, каб зьвязаць мацней увесь час абрываную ў нас нітку агульначалавечай культуры.

Італьянізмы ў мастацтве Беларусі — калі ня белая, то даволі размытая тэма. Цяпер ніхто асабліва ёй не займаецца. Помнікі гінуць, а разам зь імі гіне памяць. Застаецца, бадай, толькі адно — на прыклад знакамітага італьянскага графіка Джанбатыста Піранэзі занатаваць руіны нашае культуры. Летась адзначаліся 275-я ўгодкі з дня нараджэньня майстра афорту і вэдуты. За яго прыкладам уся Эўропа XVIII ст. пачала ўглядацца ў свае помнікі й шанаваць іх. Піранэзі мы таксама ня ведаем. Можа гэта й добра, бо барані Божа, каб не даваліся нам паўтарыць на яве ягоны апошні фантастычны цыкл "carceri oscuri" — змрочныя турмы.

Ізноў зьвяртаюся да мала шанаванага цяпер М.Горкага. У адным лісьце з Італіі ён пісаў: "А тым, што бачу тут, нацешыцца не магу. Хораша, да пякучых сьлёзаў хораша". Ліст датаваны 1910 годам. Адказваючы на прапанову вярнуцца ў Расею, пісьменьнік М.Горкі там жа зазначае: "Не наракайце на мяне за адмову маю — хварэю пакутліваю жальбой да радзімы, але жальба гэтая перакіпае ў мяне ў злосьць".

Малюнкі Міколы Залатухі

ЗАНАТОЎКІ ЭГАІСТА

Адам Глёбус

БЕЛАРУСКАЕ



На максымальнай адлегласьці ад Радзімы ўзьнікае спакуса паразважаць пра роднае, беларускае. Каралеўства Тайлянд — якраз тое месца, дзе ня можна супрацьстаяць спакусам. У Бангкоку добра думаецца пра Рэспубліку Беларусь.

Беларускім можа быць паэт. А вось празаікі, драматургі, крытыкі калі й называюцца беларускімі, дык з пэўнымі азначэньнямі: беларускі савецкі празаік, беларускі крытык-сталініст, сучасны беларускі драматург. Але ўсе разам яны зьяўляюцца беларускімі пісьменьнікамі, бо ў душы кожны зь іх перш-наперш паэт.

Бульба сама па сабе гародніна беларуская. Доказам можа служыць мянушка беларуса — бульбаш. Бульбе, як БССР і Беларусі, у Акадэміі Навук прысьвяцілі цэлую энцыкляпудыю. Такую самую даведачную кнігу трэба згарбузаваць і пра беларускі лён. Ён варты залатых словаў.

Пашанцавала беларускаму балоту: пра яго пісалі кнігі, пра яго здымалі кінастужкі, яго ўвекавечвалі на карцінах і графічных аркушах. Можна толькі пачаць пералік: "Людзі на балоце" Івана Мележа, "Дрыгва" Якуба Коласа, "У Забалоцьці днее" Янкі Брыля; і рызыкуеш ня выбрацца з той пералікаўскай багны.

Беларускі зубар мог стаць ня толькі сымбалем Горадні і міліцыі, а і ўсёй беларускай дзяржавы. Ня стаў, саступіў спачатку вершніку з крыжом, а пазьней гербарыю з глёбусам. Мяркую, на чарговым эвалюцыйным вітку геральдычных баталіяў у зубра найбольшы шанец выйграць рэфэрэндум, бо ўсе беларусы больш будысты, чым ваяры і імпэрыялісты. А хто з будыстаў ня любіць карову?..

Хацелася б мне таго ці не, а з прыметнікам "беларускі" добра спалучаюцца "ўгнаеньні". Хай папракаюць у здрадзе эстэтычным каштоўнасьцям, затое застануся праўдзівы і верны нашым каштоўным выкапням.

Да ўмоўна кепскіх словазлучэньняў залічу: і татальнабеларускую млявасьць, і ўсебеларускую баязьлівасьць, і агульнабеларускую абыякавасьць.

Беларускі трактар, які меў найвялікшую пашану за часамі СССР, страціў свае пазыцыі на рынку, але ў маім сэрцы гэтая страта не знайшла спачуваньня.

Атрымаўшы беларускую дзяржаву, беларускую канстытуцыю, беларускі парлямэнт, беларускага прэзыдэнта, беларускае войска, беларускае грамадзянства і нарэшце 2.04.1996 беларускі пашпарт, шкадую пра страту ў пашпарце адзнакі нацыянальнай прыналежнасьці. Пры ўсім маім індывідуалізме, анархізме, эгаізме чамусьці захоўваецца жаданьне быць беларусам.

У тэкстах шмат словаў змацоўваецца з азначэньнем "беларускі", але ў прыродзе гэтых рэчаў і зьяваў нямашака, як няма жывых кентаўраў і мёртвых анёлаў. Няма, дарэчы, беларускага касманаўта. Сярод савецкіх і расейскіх касманаўтаў былі, ёсьць і будуць беларусы, а вось з уласна беларускім касманаўтам праблема. Дзе ўзяць грошы на вывад на арбіту беларускага касманаўта?

Беларусі патрэбны героі, якія не пашкадуюць жыцьця дзеля Беларусі, якія будуць змагацца за Беларусь, якія зь беларусам паразумеюцца па-беларуску, якія дбацьмуць пра незалежную, вольную, багатырскую Беларусь, нават у Каралеўстве Тайлянд.

Андранік Антанян

Concerto

Трэці год ужо жыву ў Вільні, ды ніяк не магу ўцяміць, чаму літоўцы па-сапраўднаму, з шырокім размахам, з п'янымі танцамі да ўпаду сьвяткуюць толькі два сьвяты — Каляды ды Казюк. А Казюк, Дзень сьвятога Казіміра, які прыпадае на каляндарны пачатак вясны, любяць больш за ахутаныя містыкай Каляды.

Кірмаш. Сьвіст, шум, гоман. Субота. Я іду па Замкавай. Сёлета супэрзіма. Сьнег не вывозіцца й не прыбіраецца ад самых Калядаў. Цяпер сакавік. Субота, на Замкавай народу болей чым людзей. Крычаць гандляры. Дзеці плачуць, ныюць, нэндзяць, сьмяюцца, падаюць і дзьмуць у самаробныя сьвісьцёлкі. Натоўп рушыць у два шэрагі. Зьнізу ўверх і зьверху ўніз. Гандляры расхвальваюць свой тавар. Гарачаевіногарачаевіно — равуць яны. Натоўп у сваёй бальшыні ўжо ачмурэлы — ад кульнутых чарак, гоману, ад сьвежага паветра і поглядаў нечакана папрыгажэлых віленскіх паненак. Сьнегу па шчыкалатку. Каля кавярні "Ledaine" я прыкладаю намаганьні высьлізнуць з гэтага мора разьліванага людзей. Не выходзіць. У гэтай кавярні мяне мусілі б чакаць сябры. Але гандляры са сваёй халтурнай, кічовай, зробленай пад народную-нацыянальную керамікай, так шчыльна заставілі ходнікі сваімі латкамі, што пралезьці немагчыма. Я штурхаю людзей лакцямі. У іх добры настрой, у мяне пакуль яго яшчэ няма. Уладальнікі керамікі, разьлічанай на турыстаў-дурыстаў, ды танных сувэніраў крычаць на мяне на ўсіх мовах, што маюць хаджэньне ў Віленскім краі, я ім адказваю нашмат больш адборнай лаянкай на ўсіх тых мовах. Па-літоўску, польску, расейску, ды папросту. Зрэшты, я дарэмна злуюся. Я спазьніўся на добрыя паўгадзіны, і ў кавярні даўно, мусіць, няма тых, хто чакаў мяне. Натоўп штурхае мяне наперад. Усё як мае быць. Спадзяюся высьлізнуць у якім-небудзь завулку. Мяне падштурхоўваюць рухацца хутчэй. Ва ўсіх сьвята. Адно спадзяваньне, што пашанцуе высьлізнуць з натоўпу ў які-небудзь завулак і кружным шляхам дабрацца да гэтай дэбільнай кавярні, дзе мяне, напэўна ніхто не чакае. Людзей настолькі шмат, што нават немагчыма выцягнуць з кішэні цыгарэту й прыкурыць. Такое ўражаньне, што трапіў на футбольны мач "Арарату" з тбіліскім "Дынама".

Вунь нейкі мужык набыў шклянку глінтвэйну, другі штурхнуў яго ў сьпіну, і дзьвесьце грамаў чырвонага, што кроў, віна пралілося на брудны сьнег. Недзе тут побач павінен весьці аналягічны алькагольны бізнэс мой прыяцель Дэвідас. Толькі каго тут сёньня ўгледзіш? Нікога. Ды й ня трэба.

Іду. Ад няма чаго рабіць разглядаю твары дзевак, што рушаць у адваротным накірунку, гэта значыць да Катэдры. Некаторыя нават не адводзяць вочы.

Ля Пятніцкай царквы месца становіцца болей. Ля царкоўнага плоту топчуцца мастакі. Вынікі іх патугаў у галіне жывапісу вартыя жалю. Але яны гэтага не бяруць пад увагу. Хлышчуць зь біклажак гарэлку, і жаляцца на адсутнасьць попыту на мастацтва. Насупраць галерэі "Акадэмія" нейкі патлаты рудымэнт цяжка сказаць чаго здымае на электрагітары з "Led Zeppelin". Зараз варта выйсьці на Бакшту й перакурыць у якой падваротні.

На Бакшце сьнегу ўжо да калена. Пад сьнегам лёд. Левая нага праслізвае. Падаю на калена. Боль. Перад носам шыльда — "13 крэслаў", калі па-нашаму. Армянская кухня. Калі там сапраўды армянская кухня, то мусіць быць і армянскі каньяк.

У кавярні пуста. Бармэнка выконвае маё просьценькае пажаданьне. 50 грамаў "Юбілейнага". Бары люблю толькі за тое, што калі там п'еш, неабавязкова мець сабутэльніка. Сабутэльнікі мае, якіх я меўся сустрэць у "Ledaine", відаць, ужо пайшлі на Зарэчча, у бар да понаса Ёнаса. Цыгарэта выпалена, чарка перакулена. Добрая рэч — армянскі каньяк. Лекі ад жыцьця, на якія ня трэба выпісваць рэцэпты. Колькі цяпер часу? Гадзіна, дзьве, тры. Няма разьліку. Варта йсьці на Зарэчча. Толькі там можна каго-небудзь знайсьці.

Паміж ходнікам і праезнай часткай мяжы няма. Тут і там брудны сьнег. Машыны ня езьдзяць. Спускаюся да Ганны, сьвятой. Мінаю помнік небараку Міцкевічу, які ў страшным сьне ня сьніў, што калі-небудзь стане Міцкявічусам. Ня сьніў, але стаў.

Масток празь Вялейку. Показка пра Вялейку. Старая. Яшчэ даваенная. Сядзіць мужык на беразе рачулкі Вялейкі-Вільняле й маша рукамі. Падыходзіць да яго другі і пытаецца, маўляў, што ты такое робіш. Ды вось, адказвае, кракадзілаў пужаю. "Дык тут жа няма кракадзілаў". "Таму й няма, бо пужаю". Ня сьмешна. Рэчка, як заўсёды, цурчыць.

Адчыняю дзьверы бара. Брамкае званочак. Народу поўна. Публіка свая. Усе ўжо добра датыя. Рамунас расьпявае "Хава Тэкіла". Крэслаў пакуль хапае. Дзе ты быў? Не сыходзь адсюль нікуды. Зараз прыйдзе Аўшра, у яе дзень нараджэньня, а пасьля прыйдзе Дэвідас са сваім глінтвэйнам.

Блін, ведалі б вы з чаго ён робіць свой глінтвэйн, то ня так заўзята б яго чакалі. Мая задача прасядзець тут дзьве гадзіны, паспрабаваць дагнаць лідараў з найменшаю шкодай для кішэні. Ёнас мне прапануе пліску. Нядорага й піць можна не закусваючы-запіваючы. Прапанова прынятая. За барам сядзіць вельмі прыгожая дзеўка. Чытае ў гэтым бэдламе нейкую кнігу й не зьвяртае ні на кога ўвагі. На яе таксама ніхто не зьвяртае ўвагі. Ты мяне паважаеш? Анягож. Размова ідзе па-літоўску. Таму мне прыходзіцца маўчаць. Разумець разумею, але пакуль фразу зьвяжу — забуду, пра што пачынаў казаць. Разглядаю дзеўку. Кандыдатка ў Бэатрычэ. Натуральна, можна падысьці ды пазнаёміцца. Але... Аднак...

Ёлка распавядае пра тое, як трэба трымацца ў судзе. Яна працуе ў судзе сакратаркай, мае шыкоўны, амаль армянскі нос, ды нязмушаныя манеры. Першая пліска выпітая. Дзяўчына, што сядзела за барнай стойкай, сыйшла. Мне нехта з кампаніі выращае невядома за што праставіць. Віскі. Лёду адзін кавалак. Так і зроблена. Ёнас-гаспадар не нарадуецца. Набываю ў яго цыгарэты й распытваю пра дзеўку, што сядзела толькі што. Кажа, што ўпершыню бачыць. А што, спадабалася? Пасьля пераводзіць гаворку на беларускія навіны. Задаволіць ягоны інтарэс вельмі складана. Бо газэты бачу зрэдку, радыё ня слухаю, тэлевізар не чытаю.

Прыходзіць Віргінія, ці проста Вірга. Займае маё крэсла. Для такога імя ў яе занадта пажадлівыя манеры. Ці можа проста выдае такую даступную. Ёнас ставіць Прэсьлі. Публіка кідаецца ў танцы. Нармальна.

Там, дзе я піў гэты віскі зь лёдам. Пакуль я хаваўся зь Ёнасам, віскі нехта дапіў за мяне. Гарсон намбэр два. Яшчэ пліскі. Тут нават можна ў доўг піць. Таму гэта добры бар. За стол вяртацца не хачу. Пакуль занадта цьвярозы. Заходзяць мастакі й пачынаюць хваліцца, што сёньня зарабілі мех літаў, крывёю палітых. Выпіваюць па сто грамаў гарэлкі й сыходзяць. Паміж Менскам і Вільняй ёсьць толькі адна розьніца. У Менску п'юць па сто грамаў. У Вільні агульнапрынятая доза — 50. Мастакі выключэньне. Прэсьлі надрываецца, публіка танчыць, праўда, ня вельмі актыўна. Ужо сьцямнела. Аўшра прыйшла. Яе віншуюць. Яна жаліцца, што ня мае грошай. Зь ёй уваходзіць нейкі тып. Ніхто яго ня ведае. Аказваецца —

"Nuori Voima" — фінскі

Ужо нейкі час у Фінляндыі выходзіць раз на два месяцы новы грунтоўны літаратурны часопіс "Nuori Voima" ("Маладая сіла"), што выдаецца таварыствам літаратараў Nuoren Voiman Liitto. Часопіс, гэтаксама як і таварыства, быў заснаваны яшчэ ў 1908 годзе, аднак напачатку выданьне прызначалася пераважна для аматараў, што дасылалі свае творы ў рэдакцыю й маглі разьлічваць на кваліфікаваную ацэнку з боку прызнаных пісьменьнікаў і крытыкаў, а то й на публікацыю. Менавіта ў такім выглядзе выданьне йснавала да нядаўняга часу. Але колькі гадоў таму часопіс "Nuori Voima" набыў новы характар: выданьне сталася "звычайным", гэта значыць прафэсійным. Такая зьмена пайшла часопісу на карысьць: ён пачаў адыгрываць вялікую ролю ў фінскім культурным жыцьці, утвараючы як бы супрацьвагу больш статычнаму ды элітарнаму месячніку "Parnasso".

Сучасны варыянт "Nuori Voima" ўяўляе сабою выданьне ня гэтак літаратурнае, як агульнакультурніцкае. Вершы, кароткія апавяданьні, урыўкі большых твораў займаюць часам меней за трэцюю частку кожнага нумару, і зазвычай гэтая частка стаіць апошняю, калі ня ўлічваць рэцэнзійнага аддзелу і рэдакцыйнае пошты. Здараюцца і выключныя выпадкі. Напрыклад, №6 за 1994 год, прысьвечаны шэрагу маладых фіна-швэдзкіх пісьменьнікаў, або "ўсходнеэўрапейскі" лютаўскі нумар за 1995 год, значную частку якога займае агляд (праўда, даволі павярхоўны) твораў чэскіх, польскіх і баўгарскіх літаратараў. Наагул жа ў "Nuori Voima" пераважаюць эсэ. І яны не датычаць самой літаратуры. Выдаўцы імкнуцца да таго, каб часопіс меў больш інтэлектуальны выгляд. Таму тэматыка эсэістычных развагаў — гэта разнастайныя зьявы на памежжы культуры, філязофіі і псыхалёгіі. Кожны нумар больш-менш адпавядае пэўнай тэме, як, напрыклад: "Сьмерць", "Уцёкі", "Мімэтызм", "Усходняя Эўропа" ці "Мяжа". У нумары пра сьмерць мы знойдзем з аднаго боку матэрыял Хэлены Сінэрва пра матывы сьмерці ў вершах нядаўна памерлай фінскай паэткі Эвы-Лісы Манэр, што яшчэ пры жыцьці сталася клясыкам, матэрыял Юкі Коскеляйнэна пад назовам "Скок у прорву" пра лёс Малькольма Ляўры ў Мэксыцы і кароткі агляд творчасьці пецярбурскага філязофска-артыстычнага гуртка "Танатас", зь іншага ж боку — эсэ пра будысцкае разуменьне сьмерці альбо развагі пра Ніцшэ.

Нумар, які мае назоў "Уцёкі", прысьвечаны перадусім эміграцыі як літаратурнай зьяве, адначасова ўтвараючы з назову штосьці накшталт катэгорыі, што зьмяшчае ў сабе разнастайныя праявы аўтаномнага культурнага функцыянаваньня. Ёсьць тут артыкул Анса Нэўвонэна "Die Kunst der Fuge. Гамбровічава філязофія эміграцыі", двойчы выступае Мілаш — найперш як герой матэрыялу "Дзіця іншай Эўропы", затым як аўтар "Пахвалы эміграцыі". Х.К.Рыіконэн піша пра архетыповага пісьменьніка эміграцыі — Авідыя, Пасі Саўканэн — пра Салмана Рушдзі. Два артыкулы распавядаюць пра Пэнці Саарыкоскі, "неўтаймаванага духа сучаснае фінскае паэзіі і аднаго з найгалоўных яе прадстаўнікоў". Пісьменьнік паўстае перад чытачом на тле сваіх працяглых выправаў і пераездаў паміж Фінляндыяй, Англіяй, Ірляндыяй ды Швэцыяй. Часопіс знаёміць таксама з Патрыкам Чамосі, пісьменьнікам з Маўрытаніі, што піша па-крэольску і па-француску, ляўрэатам Ганкураўскае прэміі за 1992 год. Бадай найважнейшая рыса ягонае творчасьці — бясконцая ба-

АПАВЯДАНЬНЕ

Grosso

саксафаніст. Дарыюс. Саксафон зь ім. У футарале. Прыладкоўваецца ля барнай стойкі. Даведаўшыся, што я зь Беларусі, гучна крычыць і кажа, што нават ведае адну добрую беларускую групу. Parduotuve. Так і ё. Крама. "Крама" была ўлетку ў Вільні праездам у Вісагінас-Сьнечкус на кантры-фэстываль. Дарыюс кажа, што ў "Краме" граюць файныя хлопцы, і ён падчас літоўскіх канцэртаў быў у іх гукаапэратарам. Веру на слова. Сёньня ён будзе граць на дні нараджэньня Аўшры.

Ёнас затыкае глотку саладжаваму Прэслі. Правільна, дарэчы, робіць. Мяне ён дастаў, як горкая рэдзька. Нехта падаў правільную ідэю валіць адсюль. Ёнас на разьвітаньне паціскае ўсім руку. Напэўна, сёньня ў яго рэкордны абарот. Усе задаволеныя.

Большасьць ідзе да Дэвідаса. Я ж люблю належаць да меншасьці. Таму разам з Рамунасам, Дарыюсам ды Далюсам ідзем у краму па гарэлку й сок. У краме мы доўга спрачаемся, якую гарэлку браць. Усе відавочна баяцца атруціцца. Цяпер такое здараецца вельмі часта. Бярэм Lituanic'у й ідзем піць у "Галерыю". Галерэя — гучна сказана. Пакой. Мэтраў пятнаццаць квадратных. Пабеленыя сьцены. Камін. Электраплітка. Крэслы расфарбаваныя Лаўмянісам, карціны на сьценах. Так сабе карціны, калі на тое пайшло. Мы размаўляем пра тэрарызм, пра зброю, пра пісталеты. Словам, мужчынская гамана. Я пачынаю распавядаць пра тое, што аднаго разу прыстрэліў бультэр'ера. Дыягназ. Я ўжо п'яны, як сьвінтус грандыёзус.

Бутэлька выпіта, даволі, Сяджу ў крэсьле і пяю.

Ідзем да Дэвідаса на танцы. Гарсон нумар два. Грэбень грабаны грае. Трыццаць тры караблі лавіравалі, ды ніяк не вылаві... У Дэвідаса сапраўды танцы. Шчыльнасьць заселеньня ня меншая, чым была сёньня на Замкавай. Вертак круціць кружэлку. Танчаць. Наступаюць адзін аднаму на ногі, як заўсёды. Неспадзяваны гукаапэратар "Крамы" паціху дзьме ў сакс, паволі пачынае паціху падыгрываць мэлёдыю, прапанаваную фірмай "Мелодия". Сеў, агледзеўся.

З рэштак сьвяточнага глінтвэйну, што, натуральна, не пасьпелі за сёньня прадаць, мне наліваюць шклянку віна. Да зубнога болю салодкае пойла. Іншых словаў няма. Але што зробіш. Каля мяне цэлая польская дэлегацыя, жаночага полу. Зь імі шмат хто зь літоўцаў спрабуе паразумецца, але дзеўкі разумеюць толькі па-расейску, гаварыць не гавораць. Зьвяртаюцца да мяне па дапамогу. У мяне з вуснаў вылятаюць розныя банальнасьці. Прыехалі зь Пецярбургу, он ест курвон, она курва etc. Ад бездапаможнасьці пераходжу на бел. мову. Першая рэакцыя гасьцей з замежжа — шок. Пасьля адна, на крывой беларускай тлумачыць мне, што яна амаль усё разумее па-нашаму, бо ейныя дзяды-бабці прыехалі ў Гданьск з Ашмянаў. Во як. Гэта ўжо нагода для больш блізкага знаёмства, ці не? Разважаць не выпадае. Бяру ініцыятыву. Дарыюс грае, але ўжо пад мэлёдыі, перадаваныя на хвалі "Вольнай Хвалі". Лепей бы ён гэтага не рабіў. Дзеўку, чые продкі былі суседзямі Смаргонскай Акадэміі, завуць Ізабэляй. Запомніць няцяжка. Віно ёсьць такое. Ізабэла. Ад яе сыходзіць нейкі шчымлівы дзіцячы пах, даўкі пах ёду ці дзіцячага мыла, дакладней вызначыць цяжка.

Сей-той ужо занудзіўся й вызваліў памяшканьне. Я таксама занудзіўся. Ящчэ ня так позна. Можна яшчэ раз зайсьці да Ёнаса ды выпіць у яго. Ізабэла чамусьці ідзе за мною. Што можа быць лепей за радага табе гаспадара. Ня ведаю. На нармальнай беларускай мове Ёнас-Ян зьвяртаецца да мяне з пытаньнем наконт таго, чаго б я хацеў зараз выпіць, ён ставіць мне. Ухмыляецца, маўляў, калі беларус беларусу не дапаможа, то што тады будзе? Нічога такога ня будзе.

А Ізабэла спытала, няўжо паўсюль, дзе я тусуюся знаходзяцца беларусы. А вы думалі, чым я займаюся ў Вільні?

Здымак Дэйвіса Нутаўтаса

літаратурны часопіс

рацьба з культурнай і асабістай раздвоенасьцю, да якой спрычынілася жыцьцё ў дзьвюх культурах і абавязковасьць выбару паміж "ніжэйшым" і "вышэйшым", "мясцовым" і "ўнівэрсальным".

Варта ўрэшце згадаць пра №4 за 1995 год, як пра пакуль што апошні нумар, названы "Lahja", альбо "Дар". Ён мае крыху іншае, чым дагэтуль, графічнае афармленьне, і ў ім дамінуе філязофія, дакладней, развагі пра філязофскае значэньне любові і дару. Шмат апавядаецца пра хрысьціянства, ёсьць артыкул пра Сьвятога Аўгустына і два пра Сымону Вэйль. Шмат месца адводзіцца абмеркаваньню праблемы дару з гледзішча псыхааналізу і больш сучасных філязофскіх кірункаў. У сярэдзіне нумару зьмешчаны на 14-ці старонках твор Жака Дэрыды "Le temps du roi" ў фінскім перакладзе Сузаны Ліндэнбэрг – "Kuninkaan aika" альбо "Час караля". А ў больш нэўтральнай ("літаратурнай") частцы можна знайсьці між іншага два апавяданьні Данііла Хармса.

Стваральнікі сучаснага "Nuori Voima" ў большасьці сваёй людзі, народжаныя пасьля 1960 году; гэта датычыць як рэдактараў (Тар'я Райніля, Сілі Хіідэнхэйма), так і большасьці супрацоўнікаў і аўтараў (паэткі Ляўры Атанкоскі, Рыіна Катаявуоры і Хэлены Сінэрвы; празаікаў: Маркуса Нумі і Йыркі Кііскінэн). Сярод аўтараў бываюць людзі вельмі маладыя, некаторыя зь іх яшчэ нават студэнты. Аднак усе яны здолелі знайсьці ўжо сваё месца ў фінскім літаратурным жыцьці, выдаць звычай некалькі кніжак – часама вельмі вядомых, як, напрыклад, леташняя аповесьць Маркуса Нумі "Kadonnut Pariisi" ("Зьніклы Парыж"). Час ад часу зьяўляюцца аўтары старэйшага веку, найчасьцей замежныя; гэта, напрыклад, прадстаўленыя адным альбо некалькімі вершамі Джон Ашбэры, Ёсіф Бродзкі, Актавіё Пас ці Томас Транстромэр. Зрэдку зьяўляецца тэкст якога-небудзь слыннага фінскага літаратара ці крытыка (літаратуразнавец Пэка Тарка альбо паэтка Мірка Рэколя), аднак ягонае прозьвішча выразна кантрастуе са звычайным аўтарскім колам.

"Nuori Voima" дасьледуе найважнейшыя культурныя зьявы нашых гадоў. Нягледзячы на, здавалася б, "шаблённасьць", каб не сказаць "школьнасьць" загалоўкаў, зьмест артыкулаў далёка ня сьведчыць пра школьнае мысьленьне аўтараў. Іхны малады ўзрост не нагадвае пра сябе тыповымі недахопамі пачаткоўцаў, разам з тым заўважаецца пэўная непрадказальнасьць і шчырасьць, уласьцівыя маладым. У нумары трэцім за 1995 год Юка Каскэляйнэн пачынае свой даўжэзны артыкул, прысьвечаны дацкаму празаіку Пэтэру Хаэгу, такімі словамі: "Калісь Talking Heads сьпявалі: "Рай – гэта месца, дзе нічога ніколі не здараецца". Быццам бы нічога надзвычайнага, але цытата гэтая характарызуе аўтараў выданьня: яны хоць і займаюцца культурай "высокаю", але не ўтвараюць альбо нават не адчуваюць дакладна мяжу паміж "тым, што прызнана" і "масаваю культураю" альбо "культурным падпольлем". Гэты недахоп пачуцьця мяжы – істотная адметнасьць "Nuori Voima", пра папулярнасьць якога сьведчыць наяўнасьць зачытаных асобнікаў часопіса ў хэльсынскіх пабах.

"Literatura na świecie"

ПОШТА

У ціхмянай, нават на сёньняшні час, вёсцы Мядзьведнае на Ельшчыне жывуць мае старэнькія бацькі. Трымаюць жывёлу, птушку, гаруюць (так кажа маці) на сотках. На выхадныя езьдзім з братам дапамагаць. Вывозім гной, колем дровы, косім. Кожны раз тамака аўра кіруе мае ўспаміны ў дзяцінства. Апошнімі адведзінамі прыгадаў жыдоўскую сям'ю Левіных.

Улетку пяцьдзесят чацьвертага году прызначыла начальства ў пачаткоўку загадчыкам Гірша Левіна. Аронавіча або Леўка, — як казалі вяскоўцы. Пасяліўся настаўнік у бакоўцы школьнага будынку. Жонка Фаня была вялікая, поўная, не працавала. Тры дзеўкі прывез з сабою Аронавіч: Нэлю, Розу, Аню. Спрадвечна беларускае Мядзьведнае (ніхто ня краў, ня піў гарэлку) па-добраму дзівавалася з габраяў. Найперш усе зьбягаліся пабачыць, як дарэктар палюе на курэй — адзіную жыўнасьць у гаспадарцы. Фаня насыпала чубаткам проса, Леўка з ганку з дробнакалібаркі іх страляў. Бывала, што зь першага стрэлу птушыны збой разьбягаўся, і жонка ўпікала мужа за няўдаласьць. Пра тое, што жыды любяць рыбу, Аронавіч спраўна даводзіў Медзьвяжанцам. Капаў у хлявох чырвоных чарвякоў, браў вуды ды йшоў зь бітончыкам на рэчку Славечну лавіць печкуроў. Гадамі пазьней, калі ў лаўку сталі прывозіць віно, якое хутка навучыліся смактаць старэйшыя бэйбусы, дык Левіну за пляшку выменьвалі шчупакі. О, тады Фаня рабіла "фогш". Вечарамі, бывала за поўнач, у настаўніцкай гарэла газьніца. Там мой бацька "рэзаўся" з такім жа заўзятарам Гіршам у шашкі. А вось вытрываць вясковую лазьню-парыльню, дзе бурачковы Аронавіч няшчадна секся венікам, мог хіба Іван Дзябёлы.

Мы, басаногая дзятва, звалі настаўніка Рыгорам Аронавічам. Па сабе ведаю, паважалі яго. Вадзіў нас у вясновы луг, восеньскі лес, упершыню паставіў навагоднюю ёлку, якая зьзяла маленькімі лямпачкамі й прыгожымі крамнымі цацкамі. Адна нага ў яго не згіналася, бо была прастрэленая ў вайну. Але ж Рыгор Аронавіч тэпаў у далёкія Студзеньні, дзе мы выкопвалі ліпкі, грабцы і несьлі на школьны панадворак. Цяпер гэта ўжо вялікія прывабныя дрэвы. У цяньку па нядзелях тутака сівыя дзяды гуляюць у дурня і ўспамінаюць нябожчыка Аронавіча.

Высокая пахмурная Нэля запомнілася тым, што да яе ліплі хлапцы. Зь пятае клясы трэ' было хадзіць вучыцца за пяць вёрстаў. Назад дахаты жэўжыкі прыходзілі надвячоркам, бо йшлі з Нэляю па лясным зімніку, кружным шляхам. Сярэдняя Роза хавала заўсёды рэпаныя рукі. Яна ня грэбавала сялянскае працы, бегала ў калгас палоць, жаць, капаць. Калі б не габрайскія рысы твару, дык Розу не адрозьніш ад беларускіх змучаных працаю жанок. Меншая Аня гуляла зь местачковымі падлеткамі чыста апранутая, на зайздрасьць дзяўчынкам — з гуглямі і паўкруглым у касах грабянцом...

Няма ўжо адзінае на вёсцы жыдоўскае сям'і. І штосьці вярэдзіць сэрца.

Мікола Засінец,
Мазыр

ФОТАЗАГАДКА

3

Вы мусіце назваць тое, што выяўлена на гэтым здымку. Той, хто слушна адкажа на пяць загадак запар і дашле свой адказ, атрымае каштоўны прэзэнт. У наступным нумары — чарговая фотазагадка!

Незаплянаваны маналёг актора Альтэрнатыўнага тэатра

Рашэньнем Менскага гаспадарчага суда Альтэрнатыўны тэатар павінен вызваліць займаныя плошчы на вул. В.Харужай, 31-а. Працэс выйграў "Прыёрбанк". Мінкульт і Саюз Тэатральных Дзеячоў удзелу ў працэсе не бралі. 29 красавіка адбудзецца апошні спэктакаль на гэтай пляцоўцы. "Камэдыя" К.Марашэўскага й Ф.Аляхновіча.

Кожная сталіца для мяне заўсёды пачынаецца з тэатру. Як тэатар — зь вешака. Упершыню патрапіўшы ў Менск гадоў дзесяць таму, я адчуў крыўду за свой сталічны горад, дзе ў тэатар ня трэба прарывацца. Набывай, як у кіно, квіток ды йдзі. Так было, пакуль не зьявіўся "Альтэрнатыўны". На ягоную прэм'еру я імкнуўся трапіць усяляк, чаго б гэта ні каштавала. На ягонай пляцоўцы ладзіліся самыя цікавыя мне (і ня толькі) імпрэзы. Клюб постэлітарнага кіно, рок-абанэмэнт у Альтэрнатыўным...

Хутка тэатар будзе вымушаны пакінуць будынак на рагу Крапоткіна й Харужай. Слова актору Ігару Забару.

Зьміцер Бартосік

Ігар Забара: Вось што адбываецца. Касьцючэнка, гэта старшыня праўленьня "Прыёрбанку", выставіў нам арэндную плату – два даляры за квадратны мэтар. У нас плошча 1500 м, атрымоўваецца 3000 даляраў толькі арэнды, без камунальных паслугаў. Адкуль такія грошы?

Тэатар у гэтых сьценах існуе сем гадоў (два апошнія пад "Прыёрам"). Пакуль гаспадаром будынку быў інстытут, ніякіх праблемаў не было. Яны з намі арэнду ня бралі. А цяпер гаспадары – банкіры. У іх усё накіравана да прыбытку. Чаму яны нам павінны дарыць?

Я веру ў жытло. Прыкладам, ты вось жыў у ім. Застаецца пэўная аўра. Вось на гэтай сцэне, на якой банк зьбіраецца ставіць касавыя апараты, выступалі Смактуноўскі, Акуджава, Лявонаў, Пятрэнка, Філіпенка. Імёны яшчэ доўга можна пералічваць. Вядома, аўра гэтых людзей там есьць ды й публіка адчувае, што падмосткі тут няпростыя. Думаю, у краіне ня знойдзецца такой пляцоўкі, якая б за колькі гадоў сканцэнтравала гэткую колькасьць такіх імёнаў. А цяпер, напрыклад, на тое месца, дзе выступаў Смактуноўскі, яны паставяць касавы апарат, які будзе лічыць грошы. Для мяне гэта дзіўна.

Таму маё стаўленьне канкрэтна да пана Касьцючэнкі вельмі нэгатыўнае. Бо гэта ішло ад яго. Ён як кіраўнік, прымае рашэньні. Ён не захацеў з намі сустрэцца, каб сказаць гэта ў вочы. Ён зваліў усё на гаспадарніка Траяна, які займаецца эксплюатацыяй гаспадарчых пабудоваў "Прыёрбанку" і мае багаты досьвед выкручваньня рук. Ён абыйшоўся з намі не сэнтымэнтальна, нібы ва ўмовах Траянскай вайны.

Нам было паабяцана, што нас ніхто чапаць не зьбіраецца, а размова йдзе толькі пра камэрцыйныя арганізацыі "West-club" і "Кляскпюб". І літаральна праз два тыдні Траян сказаў: "Не, хлопцы. І вы таксама зьбірайцеся. Мне паступіла распараджэньне ад Касьцючэнкі". Мала таго, я асабіста запрашаў людзей з "Прыёру", і чалавек сто паглядзелі нашыя спэктаклі. Яны да нас ставяцца вельмі добра, але ж нічога не вырашаюць. А кіраўніцтва, якое ні разу не было ні на водным спэктаклі, можа, ня ведае, пра што йдзе размова. Іх не цікавіць, што гэта за тэатар.

Як бы ні было, я расчараваны паводзінамі Сяргея Аляксандравіча Касьцючэнкі. Ён вывучае мовы, надта пяшчотна дыхае ў бок Нямеччыны. Такі па-нямецку дысцыплінаваны таварыш, і банк увесь панямецку дысцыплінаваны. І ён павінен ведаць, што такое для банкіра, для заходняга асабліва, слова гонару. Дадзенае ў свой час ягонымі памочнікамі слова гонару ён не стрымаў.

Мы пайшлі больш цывілізаваным шляхам. Мы знайшлі прыхільнікаў у іншых колах і цяпер шукаем будынак. Самае галоўнае – трупа, гэта адзінаццаць чалавек, яна як адзіны кулак, яна сабралася, яна засталася зь Вітасам, нікуды не разьбеглася. Ды нават, пакуль мы з Грыгалюнасам месяцамі бегалі ў "Прыёр", з "Прыёру" й за "Прыёр", выпусьціла цудоўную казку. У нас быў прабел у рэпэртуары: не было спэктаклю для дзяцей. Цяпер ёсьць. Дзеці вішчаць ад захапленьня. Іх вельмі шмат ходзіць, таму што казка рабілася не па ўказцы, а з натхненьня.

Самае страшнае для мяне ва ўсёй гэтай гісторыі, што я год нічога новага не рэпэтую. Я за год хаджэньня ў інстанцыі дзесяць кіляграмаў скінуў. Дарэчы, ніякіх дыетаў і гербалайфаў ня трэба.

Мяне трохі зьдзіўляе стаўленьне міністэрства культуры. Яны, напэўна, панове зь міністэрства, думаюць, што яны – гэта й ёсьць культура. На самой справе яны якраз не культура. А культура гэта тое, чым яны кіруюць.

Сёньня іхная дапамога абмяжоўваецца паляпваньнем па плячы й цоканьнем языкоў. Мне падаецца, што мы ім трохі як костка ў горле. У нас больш за дваццаць гран-пры з розных міжнародных фэстываляў. Гэта "Залаты леў" (Львоў), "Славянскія сустрэчы" ў Кіеве, дыплём з прэстыжнага фэсту ў Санкт-Пецярбурзе. Там было дваццаць чатыры тэатры з дванаццаці краінаў. Някрошус быў, маскоўскія тэатры. Летась мы ўзялі адзін з галоўных прызоў на "Маладэчанскай сакавіцы" за спэктакаль"Лебядзіная песьня". Сёлета на "Сакавіцу" нас не запрасілі. Чаму? Можа таму, што мы расейскамоўныя? Зноў жа глупства атрымваецца. Адзін з самых папулярных нашых спэктакляў ідзе па-беларуску. Гэта "Камэдыя" Марашэўскага й Аляхновіча. Можа таму, што мы недзяржаўныя?.. Можа мы забіраем чыйсьці хлеб?

Я вось чаго не разумею. Прыкладам, Аляксей Дудараў. Калі я зь ім пазнаёміўся, то быў уражаны ягонай маладосьцю. (Мне здавалася, што "Парог" я зь дзяцінства ведаю). Ён, як старшыня СТД, да нас някепска ставіцца і мае ўплыў у "Прыёрбанку", бо ўваходзіць у раду дырэктараў. Ён сапраўды намагаўся шмат што зрабіць для нас. Аднак, яго таксама не паслухаліся ў "Прыёры". Што ж гэта за рада такая, дзе чалавек, чые п'есы ідуць ва ўсім сьвеце, ня можа нічога зрабіць? На маё пытаньне: "І што цяпер, Аляксей Ануфрыевіч?" ён толькі разьвёў рукамі. Дык у чым выяўляецца падтрымка міністэрства й СТД? У тым, што мне (лічы, тэатру) далі імянны прыз Ігната Буйніцкага? Я ня бачу, каб хто-небудзь яшчэ хваляваўся, акрамя адзінаццаці чалавек трупы на чале з Грыгалюнасам.

Тое, што мы нікому не патрэбныя – няпраўда. Паводле статыстыкі ў нас 92% запаўняльнасьці залі. Мала хто можа і ў Маскве пахваліцца такой статыстыкай.

Аднак, галоўнае — захавалася трупа. А разам зь ёю і нашыя пляны. Гэта пастаноўка "Качынага паляваньня" Вампілава. Я хацеў бы, каб да двухсотых угодкаў Пушкіна ў нас гуляліся ўсе "Маленькія трагедыі". У нас ужо ёсьць "Моцарт і Сальеры". Па-расейску й па-ангельску. Цікава было б паспрабаваць па-беларуску. Але, акрамя перакладу патрэбныя й людзі, гатовыя ўкласці грошы ў гэтую справу. Тады тэатар як творчая адзінка захаваецца.

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5000 Нумар падпісаны ў друк 28.4.1996 Надрукавана ў ЗАТ "Lietuvos Rytas" (Вільня, праспэкт Гедыміна, 12а)